Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 26 (4521) 17 ліпеня 2009 г.

У нумары:

Самы трывалы падмурак

Беларускай Праваслаўнай Царквой і Саюзам пісьменнікаў Беларусі заснаваны Грамадскі савет па маральнасці.

Стар. 2

Чэрвеньскія ўловы

Агляд 6-х нумароў часопісаў «Полымя», «Нёман» і «Маладосць».

Стар. 6

Шматграннасць і талент

Лепшае з творчай спадчыны трох выдатных айчынных паэтаў — пад адной вокладкай.

Стар. 7

Беларускі мюзікл: «за» і «супраць»

Ці ёсць надзеі на стварэнне мюзікла нацыянальнай тэматыкі?

Стар. 10

Адказнае заданне

Рыхтуецца маштабнае выданне — Збор твораў Івана Шамякіна ў 23 тамах.

Стар. 12

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7760 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 10060 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Магія свята яшчэ не пакінула горад. Мінулай ноччу на галоўнай фестывальнай пляцоўцы разгарнулася інтэрнацыянальнае эстраднае шоу "Танцуй да раніцы". Сёння Віцебск чакае выступленняў арт-групы "Хор Турэцкага" і зорак радыё "Шансон". Паказы найбольш значных канцэртаў, што праходзілі ў Летнім амфітэатры, працягнуцца на Беларускім тэлебачанні да 19 ліпеня. І ўсё ж Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску-2009" ужо адышоў у гісторыю. А за тымі падзеямі, што застануцца на яе старонках, маглі сачыць усе — дзякуючы тэлевізійным фестывальным дзённікам, аператыўным радыёрэпартажам.

Магія ліпеньскіх зорак

Урачыстая цырымонія закрыцця XVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" адбылася ўчора ў Летнім амфітэатры.

Самая першая трансляцыя са святочнага горада вялася ў мінулую пятніцу — у дзень афіцыйнага адкрыцця фестывалю. Удзел у гэтай урачыстай цырымоніі браў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Ён вызначыў "Славянскі базар у Віцебску" як нацыянальны гонар беларусаў, сімвал адкрытасці і гасціннасці беларускай зямлі і народа. Кіраўнік нашай дзяржавы адзначыў, што гэты фестываль паяднаў прыгажосць старажытнай славянскай культуры з рытмамі ды энергетыкай сучаснай цывілізацыі, і звярнуў увагу на досыць сур'ёзны плён: калі ў першым "Славянскім базары" ўдзельнічала толькі каля 200 чалавек з Беларусі, Расіі ды Украіны, дык сёлета ў Віцебск з'ехалася больш як 5,5 тыс. гасцей з больш як 30 дзяржаў Еўропы, Азіі, Паўднёвай Амерыкі. На яго думку, сакрэт поспеху і асаблівая магія віцебскага форуму найперш у тым, што "Славянскі базар" мае сваё непаўторнае аблічча, самабытныя традыцыі, якія, нібы магніт, прыцягваюць да сябе людзей. Прыярытэтам тут заўжды былі не камерцыйны інтарэс і піар, а свабода творчасці ды падтрымка людзей мастацтва, незалежна ад капрызаў зменлівай музычнай моды. Таму, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, асноўнай вартасцю "Славянскага базару" першапачаткова з'яўлялася здатнасць адкрыць і падтрымаць сапраўдны талент. "Вельмі прыемна чуць, калі нашы госці гавораць пра тое, што менавіта "Славянскі базар" з'яўляецца моцным стымулам для развіцця нацыянальных культур блізкіх і далёкіх краін, чые прадстаўнікі лічаць за гонар выступіць на сцэне Летняга амфітэатра", — сказаў Прэзідэнт.

Традыцыя фестывалю — уручэнне падчас яго адкрыцця спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення". Сёлета яе атрымаў народны артыст Расійскай Федэрацыі Валерый Лявонцьеў. І цяпер яго імя з'явіцца на алеі лаўрэатаў гэтай прэстыжнай узнагароды кіраўніка нашай дзяржавы: адмысловую "пляцоўку зорак" адкрылі ў фестывальным Віцебску 10 ліпеня.

Урачыстая атмасфера, насычаная непаўторнымі ўражаннямі, сустрэчамі, новымі знаёмствамі, панавала ў горадзе ўвесь тыдзень. Суквецце мелодый, рытмаў, фарбаў; сузор'е майстроў мастацтваў; россып творчых талентаў... Праз гэтыя агульныя словы кожны прыгадае і ўбачыць сваё. І ва ўспамінах соцень гледачоў абавязкова будуць яскравы акадэмічны ансамбль танца Украіны імя Паўла Вірскага; вядучыя салісты балета Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі; беларускія мелодыі ў выкананні прадстаўніцы знакамітай творчай сям'і, маладой скрыпачкі з Казахстана, пераможцы міжнародных конкурсаў Жамілі Серкябаевай, маці якой — беларуска з Гомельшчыны; салісты Ізраільскай оперы Фелікс Ліўшыц ды Мірэла Градзінару; абаяльная зорка еўрапейскай эстрады Лара Фабіян з маленькай Бельгіі; легендарны польскі ансамбль "Чырвоны гітары"; фаварыт публікі нарвежац Аляксандр Рыбак з нашай народнай "Купалінкай", якую яго навучыла спяваць бабуля, што жыве ў Віцебску. Словам — "зорныя" і дэбютныя, феерычныя і камерна-пранікнёныя, жанрава і стылёва разнастайныя выступленні ўдзельнікаў фэсту, у тым ліку прадстаўнікоў нашай краіны, знайшлі сваіх шчырых прыхільнікаў.

Запомніцца візіт як ніколі шматлікай дэлегацыі Латвіі. А менавіта — дэбют на "Славянскім базары" народнага артыста СССР Райманда Паулса, прычым, у некалькіх іпастасях: кампазітара-песенніка, джазавага піяніста-віртуоза, аўтара музыкі да спектакля "Одесса, город колдовской...", паказанага Рыжскім рускім тэатрам імя А. Чэхава. І яшчэ — праграма гасцей з Даўгаўпілса, горада-пабраціма Віцебска: канцэрт з удзелам творчых калектываў, крэатыўная выстаўка "Вуліца мастакоў універсітэта", вернісаж фотакарэспандэнтаў газет Даўгаўпілса, выступленне Камернага аркестра ў касцёле св. Варвары, супольная экспазіцыя беларускіх і латышскіх мастакоў "Дзінабург натхняе", у якую ўвайшлі работы з міжнародных пленэраў, прысвечаных заснавальніку абстрактнага экспрэсіянізму Марку Ротку. І калі ўжо ўспамінаць пра выставачныя праекты, дык варта вылучыць экспазіцыю адной кнігі, прывезенай з Расіі і падоранай нашай краіне незалежным дабрачынным фондам "Триумф — Новый век": гэта парыжскае выданне паэмы Мікалая Гогаля "Мёртвыя душы" з ілюстрацыямі Марка Шагала, які зрабіў да кнігі 96 афортаў...

♫♫♫

Што ж, нялёгка развітвацца са святам. Хаця — якое тут развітанне? Час праміне хутка, і наступным летам зноў з'едуцца госці з усяго свету на "Славянскі базар у Віцебску". І загучаць песні, і закрасуюць казачныя кветкі пад ліпеньскім небам — сонечным, васільковым, зорным, фестывальным.

Лана ІВАНОВА

На здымках: пераможца Міжнароднага конкурсу "Віцебск-2009" Дзіма Даніленка (Расія); удзельнікі конкурсу.

Галоўная інтрыга фестывалю разгарнулася вакол Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2009". У ім удзельнічала 16 спевакоў. "Суддзі" на чале з Лаймай Вайкуле ацэньвалі выступленні па 10-бальнай сістэме. У выніку галасавання журы рэкордную суму балаў — 192 з 200 магчымых — набраў прадстаўнік Расіі Дзіма Даніленка. Ён і атрымаў Гран-пры: статуэтку "Ліра" і прэмію ў памеры 10 тыс. долараў. Дарэчы, Дзіма — ураджэнец Гомеля, атрымаў там пачатковую музычную адукацыю і вышэйшую інжынерную, а цяпер вучыцца ў Пецярбургу ў акадэміі музыкі; з аркестрам ён спяваў беларускамоўную "Княжну" з рэпертуару "Песняроў". Паша Парфеній з Малдовы стаў лаўрэатам I прэміі (188 балаў). Беларускі выканаўца Андрэй Коласаў і македонец Влатка Лазанаскі (абодва — па 186 балаў) узнагароджаныя II прэміяй, III прэмію падзялілі Пётр Дзмітрычэнка з Украіны ды Еронімас Мілюс з Літвы. Многія канкурсанты атрымалі спецыяльныя ўзнагароды.

Пункцірам

● Пастаянны Камітэт Саюзнай дзяржавы супольна з інфармацыйным партнёрам — выдавецтвам "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі" ў межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску-2009" наладзіў шэраг мерапрыемстваў. Сярод іх — праведзены Маладзёжны рух "Саюзная дзяржава — гэта МЫ!", падчас якога адкрылася выстаўка "Фоталетапіс Саюзнай дзяржавы", прайшлі конкурс дзіцячага малюнка на асфальце і віктарына "Старонкі гісторыі Саюзнай дзяржавы", творчая сустрэча моладзі з намінантам на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2009 — 2010 гг. пісьменнікам Мікалаем Чаргінцом. У той дзень Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін сустракаўся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і моладдзю. А назаўтра ў Доме кіно адбылася творчая сустрэча з намінантамі на прэмію Саюзнай дзяржавы.

● Маляўнічы альбом "Іван Дмухайла. Жывапіс. Краявіды", выдадзены пры падтрымцы ААА "Мінскводбуд" і расійскага Банка ВТБ, урачыста перададзены ў дар бібліятэкам Беларусі. Удзельнікі цырымоніі, якая адбылася ў атрыуме Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, цёплым словам успаміналі мастака Івана Дмухайлу. Праўнук украінскага іканапісца, ён праз усё жыццё пранёс любоў да роднай Украіны. А сваю любоў да другой радзімы — Беларусі, дзе застаўся пасля Вялікай Айчыннай вайны, дэмабілізаваўшыся з войска, І. Дмухайла напоўніцу выказаў у шматлікіх пейзажах, апошнія з якіх датуюцца 2007 годам, калі мастаку было ўжо далёка за 90.

У альбоме "Іван Дмухайла. Жывапіс. Краявіды" прадстаўлены рэпрадукцыі 95 палотнаў, нататкі мастацтвазнаўцаў, дакументальныя звесткі. Атрыманыя Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі 180 асобнікаў новага выдання будуць размеркаваныя сярод абласных і раённых кнігасховішчаў, а таксама бібліятэк некаторых навучальных устаноў.

С. ВЕТКА

● У адной з залаў бібліятэкі НАН Беларусі, дзе колькі гадоў таму шырокаму колу даследчыкаў беларускай мовы была прадстаўлена камп'ютэрная праграма праверкі арфаграфіі "Літара", адбылася прэзентацыя электроннага граматыка-парадыгматычнага слоўніка "Парадыгма".

Слоўнік створаны творчым калектывам Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі пад кіраўніцтвам навуковага супрацоўніка Фізіка-тэхнічнага інстытута Акадэміі навук Фёдара Піскунова. Нельга не адзначыць той факт, што праца выканана цалкам у ініцыятыўным парадку.

У працэсе напісання і апрацоўкі беларускамоўных тэкстаў разам з праграмай праверкі беларускай арфаграфіі "Літара" граматыка-парадыгматычны слоўнік стварае адзіны комплекс.

Дыскусія, якая ўзнікла ў працэсе дэманстрацыі "Парадыгмы", паказала, што праграма патрабуе яшчэ шмат працы па яе ўдасканаленні. Удзельнікамі прэзентацыі было ўнесена шмат прапаноў і заўваг. Усё гэта дае падставы для высновы, што граматыка-парадыгматычны слоўнік неўзабаве стане асноўным элементам беларускамоўнага праграмнага комплексу.

Людміла ЦУБА

● Монаспектакль Яўгенія Еўтушэнкі «Роман с жизнью» адбыўся на "Славянскім базары ў Віцебску". Паводле паэта, апошні раз ён выступаў у горадзе на Дзвіне 15 гадоў таму, на сустрэчы гучалі творы, напісаныя "за час гэтага расстання". Кожнаму вершу папярэднічала каларытная гісторыя — пра знаёмства з жонкай Марыяй, з якой яны разам ужо 23 гады (дарэчы, яна, а таксама два яго сыны, прысутнічалі ў зале), згадка і пра тое, як з Андрэем Макаёнкам ездзіў на Палессе ў вёску Хомічы, каб расшукаць сясцёр свайго рэпрэсіраванага дзеда-беларуса. Паэт захаваў той жа тэмперамент, якім «зараджаў» залы ў 1960-х: падчас спектакля ён не толькі імпэтна чытаў свае творы, а і падпяваў песням на свае словы і нават танцаваў, публіка вітала яго гарачымі авацыямі.

Саша ДОРСКАЯ

Адбылося першае пасяджэнне Грамадскага савета па маральнасці.

За падзеяй

У прынятым Палажэнні аб савеце ўказваецца, што гэта сумесны грамадскі орган, заснаваны Беларускай Праваслаўнай Царквой і Саюзам пісьменнікаў Беларусі пры падтрымцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з удзелам Рыма-каталіцкай Царквы, Евангелічна-лютэранскай Царквы, мусульманскага і іудзейскага рэлігійных аб'яднанняў.

Самы трывалы падмурак

У складзе савета — знаныя людзі, чые імёны добра вядомыя і ў Беларусі, і па-за яе межамі. Сярод іх — аўтарытэтныя грамадскія і дзяржаўныя дзеячы, работнікі культуры, мастацтва, навукі, пісьменнікі, а таксама эксперты ў розных пытаннях. На пасяджэнні прысутнічалі кіраўнікі многіх традыцыйных рэлігійных аб'яднанняў Беларусі: Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, каталіцкі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, Старшыня мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Рэспублікі Беларусь, муфцій Абу-Бекір Шабановіч, старшыня аб'яднання іудзейскіх абшчын у Рэспубліцы Беларусь Уладзімір Малінкін, кіраўнік рэлігійнага аб'яднання "Самастойная Евангелічна-лютэранская Царква" Уладзімір Меерсон, выканаўчы дырэктар іудзейскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь Бэла Высакоўская.

Старшынёй Грамадскага савета па маральнасці зацверджаны старшыня СПБ Мікалай Чаргінец. Вызначаны мэты, парадак фарміравання і структура савета. Пры канцы пасяджэння адбылося падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Беларускай Праваслаўнай Царквой і Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

Карэспандэнт "ЛіМа" пацікавіўся, якой бачыцца праца Грамадскага савета па маральнасці ўдзельнікам пасяджэння.

Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі:

— Не трэба рабіць нейкай эйфарыі, што такая рада створана. А галоўная яе мэта, як мне бачыцца, — гэта прапаганда маральных, духоўных каштоўнасцяў, навучанне, што не адзіным хлебам жыве чалавек.

Так сталася, што доўті час у грамадстве ўсё будавалі на матэрыяльных каштоўнасцях, а аказалася, што гэта быў не моцны падмурак. Трэба будаваць жыццё на трывалым падмурку. Гэтым трывалым падмуркам з'яўляецца маральнасць.

Мы жывём у свеце, дзе валадарыць філасофія постмадэрнізму — абсалютнай свабоды ад усяго. На першы план выходзяць іншыя каштоўнасці, якія адыходзяць ад агульначалавечых паняццяў. "Я" і толькі "я" ставіцца перадусім. Але гэта не так! Чалавек не жыве на нейкім востраве, ён жа сярод людзей! Таму хацелася б, каб мы ў савеце не толькі гаварылі, не толькі намячалі нейкія планы, а каб маглі нейкім чынам заахвоціць чалавека падумаць пра сэнс свайго жыцця. Малады чалавек цяпер часта і апоры ніякай не мае. Таму нам, царкве, трэба аб'яднаць свае намаганні з грамадскімі сіламі. І ў грамадскім савеце бачацца два асноўныя элементы. Гэта магчымасць сустрэч прадстаўнікоў розных канфесій, што дазволіць нам весці дыялог паміж сабою. І

— дасць магчымасць стаць на абарону спрадвечных маральных каранёў, і менавіта на іх падмурку выхоўваць моладзь.

Старшыня мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Рэспублікі Беларусь, муфцій Абу-Бекір ШАБАНОВІЧ:

— Мы жывём у асаблівую эпоху, калі наша краіна перайшла ад ідэалогіі атэізму да адраджэння векавых, тысячагадовых каштоўнасцей. І гэта — выдатны момант на змене эпох, які варта заўважыць. Аднак, шмат і таго, што не павінна быць у нашым жыцці. Усе мы жывём у прававой дзяржаве, але часта людзі шукаюць у заканадаўстве менавіта тую літару, пры дапамозе якой можна абысці закон. І тут нам трэба працаваць супольна з грамадскімі і дзяржаўнымі органамі, пераходзіць ад роўнааддаленасці рэлігій да роўнанабліжанасці. Грамадскі савет па маральнасці можа мець у гэтым кірунку вялікі плён.

Трэба, каб маральны бруд з Захаду не трапляў да нашых людзей. Але па сённяшнім часе мы не можам адгароджвацца жалезнаю заслонай, трэба шырэй і глыбей паказваць і прапаноўваць нашы беларускія традыцыі. Трэба і антыалкагольная заслона. Прапаганда па тэлебачанні і ў іншых сродках масавай інфармацыі таго ж піва вядзе да страшных з'яў. Мусульмане не ўжываюць алкагольных напояў. Але ж побач з намі — іншыя людзі!

Народная артыстка Беларусі Марыя ЗАХАРЭВІЧ:

— Высокая назва арганізацыі, высокія задачы. Гэта ўсё зразумела. І мы будзем гаварыць пра канкрэтныя справы. Лічу, што самым галоўным павінна быць слова. Царква робіць і зараз усё магчымае, каб захаваць і сцвердзіць агульначалавечыя каштоўнасці. І калі прыходзіш у царкву, і акрамя малітвы чуеш пропаведзі, тое, пра што гавораць нашы свяшчэннікі, дзівішся: як слухаюць людзі, як ловяць кожнае слова, як яно ім патрэбна!.. Гэта таксама ўжо нейкі вынік. Я ездзіла з Дабрадатным агнём ад Труны Гасподняй па нашай краіне. За 15 год аб'ездзілі амаль усю Беларусь, сустракаліся з людзьмі, і я ведаю, як людзі чакаюць такіх сустрэч, як чакаюць навін, як хочуць пагаварыць, выказаць свае праблемы. І публіцыстыка, і паэзія, і размовы шчырыя павінны быць найпершай нашай справай. Па маскоўскім тэлебачанні неяк паказалі страшэнную гісторыю: дзяўчынак 13-14 гадоў забілі іх равеснікі! Таксама 13-14-гадовыя! Колькі ў жыцці у нас такога страшнага! Наша сумленне, тое, што заклалі нам нашы бацькі — заўсёды пачыналася ад царквы, малітвы, ад паняццяў таго, што можна і чаго нельга. Пакрышачку кожная маці здольная навучыць сваё дзіця малітве перад сном. І сказаць пры гэтым, што добра, што дрэнна. Агульнымі фразамі нічога не зробіш. Спадзяюся, што і наш савет стане падмуркам той вялікай справы, якая неабходна і беларускаму народу, і ўсім, хто жыве на зямлі.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: падчас пасяджэння; Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт і старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец.

Фота Кастуся Дробава

Выступленне Высокапраасвяшчэннага Філарэта, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі на першым пасяджэнні Грамадскага савета па маральнасці 8 ліпеня 2009 года

Высокашаноўны Мікалай Іванавіч, паважаныя прадстаўнікі традыцыйных веравызнанняў, высокі сход!

Нас сабраў сёння агульны клопат пра маральнае здароўе грамадства. Нас аб'яднала жаданне сумесных дзеянняў па аздараўленні духоўнай атмасферы нашай краіны. Мы прыйшлі, каб засведчыць свой клопат пра будучае дзяцей і моладзі.

Усім вядомыя тыя праблемы, з якімі сутыкаецца наша грамадства. Скарачэнне насельніцтва, распад двух трацін ствараемых сем'яў, высокі ўзровень суіцыдаў, няпростая крымінагенная сітуацыя, распаўсюджванне небяспечных захворванняў, алкагалізм, наркаманія і шэраг іншых пытанняў, якія патрабуюць свайго неадкладнага вырашэння. Калі прыгледзецца, можна ўбачыць, што аб'ядноўвае гэтыя цяжкія праблемы: усе яны маюць у сваёй аснове з'яву, якую можна пазначыць як маральны крызіс.

Сёння шмат гавораць пра крызіс эканамічны, шукаюць яго прычыну і спосабы барацьбы з ім. І ўсё часцей нават з вуснаў свецкіх людзей і палітыкаў можна пачуць нечаканыя прызнанні таго, што крызіс эканомікі стаўся вынікам крызісу маральнага, што пачатак яго неабходна шукаць у духоўнай сферы. Паступова прыходзіць разуменне таго, што духоўныя законы не могуць груба парушацца без наступстваў, і наступствы гэтыя могуць быць досыць сур'ёзнымі.

Перад тым, як набыць матэрыяльныя абрысы, маральны крызіс праяўляў сябе ў забыцці духоўных законаў быцця, у імкненні да ілжывай свабоды — свабоды ад усялякай адказнасці за свае словы і ўчынкі. Маральны крызіс асабліва ярка праявіўся ў інфармацыйнай сферы, якая пачала неабмежавана засмечвацца прапагандай жорсткасці, сквапнасці, уседазволенасці. Лозунгам «свабоды слова» сталі апраўдваць далучэнне дзяцей да развязнага ладу жыцця. Пошлыя фільмы, жорсткія камп'ютэрныя гульні, культ маргінальных маладзёжных плыняў сталі звыклымі для СМІ, асабліва вызначылася ў гэтым сетка Інтэрнет.

Адгукаючыся на гэтую грамадскую бяду, Беларуская Праваслаўная Царква больш як год таму падчас сустрэчы Прэзідэнта з Сінодам выступіла з ініцыятывай стварэння Грамадскага савета па маральнасці.

Кіраўнік дзяржавы падтрымаў гэтую ідэю і выказаў разуменне занепакоенасці Царквы маральным станам грамадства. У далейшым гэты праект распрацоўваўся ў цесным кантакце з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Лічым, што наспела неабходнасць стварэння незалежнага грамадскага органа, які б стаў выразнікам надзей і спадзяванняў той часткі грамадства, для якой неабыякавыя маральныя катэгорыі ў жыцці людзей. Найперш гэта датычыць традыцыйных веравызнанняў, якія стагоддзямі захоўваюць маральны закон жыцця.

На гэтыя злабадзённыя пытанні адгукнулася і пісьменніцкая грамадскасць. Невыпадкова лепшых прадстаўнікоў літаратуры яшчэ называюць "сумленнем нацыі".

Мы бачым тут прадстаўнікоў сферы адукацыі, вучоных, заслужаных дзеячаў культуры. Ваша неабыякавасць сведчыць пра тое, што ў беларускім грамадстве захаваўся здаровы маральны патэнцыял. Сардэчна вітаю ўсіх вас і дзякую за тое, што вы адгукнуліся на гэтую ініцыятыву, нягледзячы на вялікую занятасць.

Беларуская Праваслаўная Царква і Саюз пісьменнікаў Беларусі распрацавалі Палажэнне аб Грамадскім савеце па маральнасці, тэкст якога быў узгоднены з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узначаліць ствараемы савет было прапанавана заслужанаму грамадскаму і дзяржаўнаму дзеячу, вядомаму пісьменніку Мікалаю Іванавічу Чаргінцу. Яго кандыдатура таксама адобрана ў Адміністрацыі Кіраўніка дзяржавы. Узначаліць сакратарыят было прапанавана нашаму памочніку Андрэю Іванавічу Алешку.

Зацвярджаемы сёння дакумент не з'яўляецца чымсьці застыглым і нязменным. У працэсе працы нашага савета напэўна ж узнікнуць пытанні, якія запатрабуюць карэкціроўкі заснавальных дакументаў. Прымаючы дадзенае палажэнне, мы закладваем аснову нашай далейшай сумеснай працы. Думаю, у працэсе яе будуць удакладняцца як арганізацыйная структура савета, так і іншыя пытанні яго дзейнасці.

Яшчэ раз сардэчна вітаю і спадзяюся, што агульнымі намаганнямі мы зможам дасягнуць жадаемых грамадскіх мэтаў.

Роднае

Крыніца хараства

Дзень нараджэння славутага беларускага песняра Янкі Купалы быў адзначаны ў сталіцы ўрачыстым ускладаннем кветак да яго помніка. Святочнае мерапрыемства па традыцыі ладзіцца супрацоўнікамі Купалаўскага музея.

Далучыцца да энергетыкі купалаўскай паэзіі і прачытаць свае вершы, прысвечаныя вялікаму паэту, ва ўтульным скверы сабраліся прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі Беларусі. З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў і гасцей імпрэзы звярнуліся намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Віктар Кураш і старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец. З паэтычным вітаннем выступілі Мікола Мятліцкі, Навум Гальпяровіч, Міхась Пазнякоў, Ніна Галіноўская, Ганад Чарказян, Хізры Асадулаеў. Кожны выступоўца намагаўся "выказаць" свайго Купалу, адшукаць новыя сэнсы і адценні ў спасціжэнні яго спадчыны. Міхась Пазнякоў, напрыклад, запрасіў прысутных задумацца над тым, што Янка Купала для сучасных беларусаў — не проста вялікі паэт, але крыніца святла і хараства. Уладзімір Гніламёдаў адзначыў, што, няглядзечы на плённае развіццё купалазнаўства ў нашай краіне, у спадчыне песняра яшчэ і дагэтуль застаецца шмат нявывучанага, неспазнанага. "Пра Купалу трэба пісаць больш, мы недапрацоўваем у гэтым сэнсе", — падкрэсліў акадэмік.

Паўдзельнічалі ў святочным мерапрыемстве і юныя "дэкламатары" — вучні мінскіх школы № 208 і гімназіі № 23. На заканчэнне сімвалічна прагучала славутая "Купалінка".

Жанна КАПУСТА
Фота Кастуся Дробава

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы зладкаваў імпрэзу "Гісторыя аднаго верша", прысвечаную самаму значнаму твору Янкі Купалы перыяду Вялікай Айчыннай вайны — вершу "Беларускім партызанам".

Навідавоку

Верш Перамогу набліжаў

Сярод багатай спадчыны, якую пакінуў нам Янка Купала, немалое месца займаюць творы ваеннай тэматыкі. З першых дзён вайны яго палымянае слова стала моцнай зброяй супраць фашысцкай навалы. Яно ваявала разам з народам, падбадзёрвала, надавала сілы, клікала да перамогі. Выключным па змесце і эмацыйным напружанні творам Янкі Купалы ваеннага часу застаецца верш "Беларускім партызанам". З гісторыяй яго стварэння прысутных пазнаёміла навуковы супрацоўнік музея В. Пархімовіч.

Напісаны ў жніўні 1941 года, гэты верш ажно да пераможнай майскай раніцы 45-га быў своеасаблівым гімнам беларускіх партызан. Тэкст верша перадаваўся з вуснаў у вусны, перапісваўся ад рукі, расклейваўся на хатах і дрэвах. "Партызаны, партызаны, Беларускія сыны! За няволю, за кайданы Рэжце гітлерцаў паганых, Каб не ўскрэслі век яны," — партызаны пераказвалі адзін аднаму палымяныя купалаўскія радкі і бясстрашна ішлі змагацца за незалежнасць сваёй краіны.

У хуткім часе верш загучаў песняй: падпольшчыкі маглі не толькі прачытаць, але і заспяваць яго: у 1942 годзе кампазітар Анатоль Багатыроў стварыў аднайменную кантату, якая часта перадавалася па радыё, з якой пачынаўся і завяршаўся эфір радыёстанцыі "Савецкая Беларусь", што ўжо з першага студзеня 1942 года вяла перадачы з Масквы. Сваімі ўспамінамі пра гісторыю напісання кантаты падзялілася пляменніца Анатоля Багатырова, музыказнаўца Алена Саламаха.

Натхнёныя радкамі купалаўскіх "партызан", побач з дарослымі ваявалі з ворагамі юнакі і дзяўчаты. Пра лёс Марата Казея, Віці Хаменкі, Валі Коціка і Колі Карабкова расказалі члены БРСМ Яўгенія Раманюк і Аляксандра Лабажэвіч. Пасля гэтага для ўсіх прысутных была наладжана своеасаблівая экскурсія "Сцежкамі вайны", прысвечаная жыццю і творчасці Янкі Купалы ў гады Вялікай Айчыннай. На развітанне госці музея атрымалі папяровыя трохкутнікі, з надрукаваным на іх вершам Янкі Купалы "Беларускім партызанам".

Ірына ЧАРНЯЎСКАЯ
Фота аўтара

Выстаўкі

Старонкі жыцця партызанскага

Унікальная экспазіцыя завяршыла маштабны выставачны праект "Беларусь. Трыумф пераможцаў", які супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прысвяцілі 65-годдзю вызвалення нашай краіны ад гітлераўскага ярма. Назва гэтай экспазіцыі, здавалася б, такая звыклая для нас: "Беларусь партызанская". Але як уражвае яна сваім зместам!

Найбольшай каштоўнасцю ў зборы нашага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны лічыцца калекцыя партызанскіх рукапісных часопісаў (сёння іх тут — 248 асобнікаў), якія, дарэчы, былі ў ліку першых экспанатаў, што паступілі ў музей з дня яго стварэння ў 1944 годзе. Сёлета ў красавіку рашэннем Рэспубліканскай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны гэтай калекцыі нададзена катэгорыя "1"— г. зн. гісторыка-культурнай каштоўнасці міжнароднага значэння.

Кожны з такіх часопісаў, што выпускаліся ў многіх атрадах і брыгадах лясных змагароў, успрымаецца як сапраўды неацэнны альманах партызанскага жыцця. На рукапісных старонках, аздобленых малюнкамі, адлюстроўваліся практычна ўсе аспекты баявой і палітычнай дзейнасці партызан, іх побыт. Менавіта падборка арыгінальных экземпляраў рукапісных часопісаў з іх непаўторным зместам з'явілася дамінантай новай выстаўкі, на якой таксама прадстаўлены жывапісныя і графічныя работы беларускіх мастакоў на партызанскую тэматыку. Арганізатары экспазіцыі мелі на мэце праз гэты незвычайны дакументальны матэрыял, праз партызанскую "летапісную творчасць" і работы прафесійных мастакоў паказаць народнае супраціўленне ў тыле ворага, жыццё ва ўмовах нямецка-фашысцкай акупацыі.

Лана ІВАНОВА

З-пад пяра

У сербскім часопісе "СТИГ" надрукаваны вершы Валерыя Кастручына ў перакладзе на сербскую мову. Гэта паэтычны пераклад 11 выбраных твораў з ягонай кнігі "Небесный колокольчик", якая выдадзена ў Выдавецтве Беларускага Экзархата па блаславенні Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта. Дарэчы, згаданы зборнік вершаў для дзяцей вытрымаў сваё другое перавыданне і цяпер яго агульны тыраж складае 20 000 асобнікаў.

"СТИГ" — культурна-асветніцкі часопіс (літаратура, мастацтва і культура сербскага краю). Вершы Валерыя Кастручына пераклала галоўны рэдактар часопіса Ана Дудаш. Гэта — не першы пераклад твораў В. Кастручына на іншыя мовы. Так, яго кніга "Сказки лесной полянки" ў 2003 годзе выйшла на ўкраінскай мове ў Кіеве (з аўдыёварыянтам). Акрамя таго, "Сказки лесной полянки" выходзілі два разы ў падарункавым варыянце ў Расіі, у 2006 і 2007 гадах.

Ідрак МІРЗАЛІ-ЗАДЭ

У Год роднай зямлі супрацоўнікі Чэрвеньскай сеткі публічных бібліятэк праводзяць сустрэчы са знакамітымі людзьмі Беларусі.

На чарговую імпрэзу ў "Бібліятэчную гасцёўню" завітала пісьменніца-казачніца Алена Масла. Нібыта казачная чараўніца, яна на працягу амаль трох гадзін трымала ўвагу аўдыторыі.

Пісаць Алена пачала рана, але дзве яе кнігі пабачылі свет толькі ў 2005 годзе. Гэта "Рождество у крестной" і "Таямніца закінутай хаты". У 2007-м выйшла кніга "Вандроўка з божымі кароўкамі". Тады ж аўтарку адзначылі пасведчаннем чытацкіх сімпатый па выніках конкурсу "Лепшая беларуская кніга", які ладзіла Беларуская бібліятэчная асацыяцыя.

Пісьменніца нават прадставіла сваё хобі — выраб лялек. Гэта майстэрства вымагае не толькі навыкаў работы з тканінай, але і адпаведных ведаў. Прысутныя пачулі пра тое, каму нашы продкі дарылі ляльку-дзесяціручку, ляльку-спавіванку, альбо ляльку-куватку, куды вешалі лялек-ліхаманак і што з імі рабілі праз год. Некалькі лялек Алена падарыла супрацоўнікам бібліятэк.

Людміла ВОЙЦІК

Буда-Кашалёўская зямля шчодрая на літаратурныя таленты. Адсюль родам — Аляксей Кейзараў, Іван Шальманаў, Міхась Стрыгалёў, Мікола Чарняўскі, Таццяна Гарэлікава, Уладзімір Сцяпан, Анатоль Зэкаў.

Апошні нядаўна наведаў малую радзіму. І, канечне, не абмінуў цэнтральную раённую бібліятэку, дзе і адбылася сустрэча пісьменніка-земляка з мясцовымі творцамі — удзельнікамі літаратурнай гасцёўні "Натхненне".

З цікавасцю слухалі мясцовыя літаратары свайго сталічнага земляка. Анатоль Зэкаў распавёў пра стан сучаснай беларускай літаратуры, пра новыя кнігі, якія пабачылі свет у апошні час і на якія варта звярнуць увагу. Пры гэтым значнае месца ў выступе было адведзена перыядычным і кніжным выданням РВУ "Літаратура і Мастацтва". Землякі задавалі пытанні, выказвалі ўласнае бачанне літаратурных і моўных праблем, слухалі новыя творы паэта, чыталі свае.

Падчас знаходжання на радзіме Анатоль Зэкаў сустрэўся і з самымі юнымі чытачамі — вучнямі 2-4 класаў Буда-Кашалёўскай СШ № 2.

Пісьменнік выступіў таксама перад удзельнікамі раённага конкурсу "Валадар вёскі" на лепшую маладую сям'ю Буда-Кашалёўшчыны, дзе ўдзельнікі спаборніцтва паказалі свой спрыт у касьбе. А своеасаблівым падарункам для Анатоля Зэкава стала перамога яго землякоў з вёскі Патапаўка.

Сяргей БЯРНАЦКІ

Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2009 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці

25 чэрвеня 2009 г. Прэзідыум Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прысудзіў прэміі 2009 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці з наданнем звання лаўрэата, уручэннем Ганаровага знака, дыплома і грашовай узнагароды:

I. За творы прозы, паэзіі і драматургіі (дзве прэміі):

Гарановічу Віталію Рыгоравічу, паэту, старшыні Глыбоцкага раённага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі — за кнігу вершаў "Саракі", апублікаваную ў 2007 годзе;

Пазнякову Міхаілу Паўлавічу, паэту, празаіку, намесніку дырэктара Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" — за кнігі для дзяцей "Вавёрчына хатка" і "Падарожжа ў краіну загадак", апублікаваныя ў 2006—2007 гадах.

II.За музычныя творы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць (адна прэмія):

Заслужанаму калектыву Рэспублікі Беларусь ансамблю народнай музыкі "Бяседа" Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь (мастацкі кіраўнік Захлеўны Леанід Канстанцінавіч) — за актыўную канцэртную дзейнасць і прапаганду беларускай народнай песні ў краінах блізкага і далёкага замежжа.

III.За работы ў галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва (адна прэмія):

Гасцюхіну Уладзіміру Васільевічу, рэжысёру-пастаноўшчыку, вядучаму майстру сцэны Тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" — за пастаноўку спектакля "Механический человек" паводле п'есы М. Варфаламеева ў Тэатры-студыі кінаакцёра (2008 г.);

Князеву Мікалаю Пятровічу, кінарэжысёру студыі "Летапіс" рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" — за стварэнне дакументальных фільмаў "Вароты", "Белорусский космос", "Материя образа" (2005—2007 гг.).

IV. За творы жывапісу, скульптуры, графікі і прыкладнога мастацтва (адна прэмія):

Вішнеўскаму Уладзіміру Мікалаевічу, мастаку-графіку, дацэнту ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў" — за стварэнне афортаў і мастацкае афармленне кніг у 2005—2008 гадах;

Жукоўскаму (Панцюку-Жукоўскаму) Аляксею Андрэевічу, мастаку-жывапісцу, выкладчыку дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка" — за работы з серыі персанальных выставак (2005—2008 гг.) пад агульнай назвай "Пад мірным небам — Маладая Беларусь".

V. За актыўную работу па развіцці народнага мастацтва і самадзейнай творчасці працоўных (адна прэмія):

Бураму Аляксандру Міхайлавічу, дырэктару Палаца культуры адкрытага акцыянернага таварыства "Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод".

VI. За выдатныя дасягненні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці (адна прэмія):

Узорнаму ансамблю танца "Віза-ві" Дома культуры чыгуначнікаў Аршанскай дыстанцыі грамадзянскіх збудаванняў ТРУП "Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі", г. Орша (кіраўнік Рукаль Алеся Генадзьеўна).

VII. У галіне журналістыкі (дзве прэміі):

Шыманскаму Міхаілу Мікалаевічу, члену ГА "Беларускі саюз журналістаў" — за творчую работу "Мая вера — мая Беларусь", апублікаваную ў газеце "Рэспубліка" і іншых выданнях у 2005—2008 гадах;

Курбеку Івану Сцяпанавічу (пасмяротна) — за літаратурна-мастацкае выданне "Запрашэнне ў музей" (2008 г.);

Александровіч Ганне Пятроўне, члену ГА "Беларускі саюз журналістаў" — за цыкл публіцыстычных нарысаў пад агульнай назвай "Судьбы людские" (2005—2006 гг.).

«Я нарадзіўся славістам...»

Прафесар Іван Чарота — самы вядомы ў Беларусі славіст. Гэта бясспрэчна. Яшчэ ў 1980-х, калі малады выкладчык разам з сям'ёй туліўся ў невялікім пакойчыку студэнцкага інтэрната на Паркавай магістралі, у яго перабывалі ці не ўсе югаславы, якія прыязджалі ў Савецкую Беларусь. Сёння Іван Аляксеевіч узначальвае кафедру славянскіх літаратур філфака БДУ, з'яўляецца старшынёй таварыства "Беларусь — Сербія", на чале з ім рэалізуецца грамадскі праект "Белая Русь — сястра Сербіі". Мэта праекта — адбудаваць адзін з разбураных праваслаўных храмаў сербскага Косава. Наша размова з Іванам Чаротам — пра перакладчыцкую справу.

— Іван Аляксеевіч, вы вядомы як перакладчык з усіх славянскіх моў. Адкуль такая прага да славістыкі, як авалодалі ўсімі гэтымі мовамі?

— Як я стаў славістам? А мне станавіцца не трэба было. Я, можна сказаць, ім нарадзіўся. Мая малая радзіма знаходзіцца на памежжы і, адпаведна, спалучае так ці інакш элементы некалькіх славянскіх культур, моў. І ў школе маёй роднай вёскі Лышчыкі Кобрынскага раёна не адзін раз мянялася мова навучання: руская, польская, украінская, беларуская. У майго дзеда было дзве кнігі, вельмі яму дарагія: Евангелле на царкоўнаславянскай мове і атрыманы ім за выдатную вучобу "Кабзар" на ўкраінскай, выдадзены, дарэчы, яшчэ ў XIX стагоддзі. Дык вось, калі я пачынаў вучыцца чытаць, мне дазвалялі браць гэтыя кнігі. Да таго ж, сусед прынёс польскі буквар. А найбольш выкарыстоўваліся ў якасці "падручнікаў" газеты — маскоўская "Правда" і кобрынская "Камуністычная праца". Так што з гадоў чатырох засвойваў сяк-так адначасова тры ўсходнеславянскія мовы і адну заходнеславянскую. Істотна, што на ўсіх гэтых мовах у нас тады спяваліся песні, якія без напруті я запамінаў, і дагэтуль на многія не забыўся.

Практыкавацца ў польскай мове я атрымаў дадатковую магчымасць, паехаўшы настаўнічаць у Воранаўскі раён. Там большасць жыхароў пісалася палякамі і пры патрэбе гаварыць "культурна" карысталася польскай моваю.

Яшчэ адзін заходнеславянскі вектар для мяне акрэсліўся пасля таго, як у 2000 годзе быў заснаваны Міжнародны форум "Паслы славянства". Браты-славакі мяне сталі рэгулярна запрашаць на форумы ў Браціславу, куды прыязджалі таксама чэхі. Бываючы там і бліжэй пазнаёміўшыся са славацкай і чэшскай мовамі, стаў перакладаць творы цікавых мне пісьменнікаў Славакіі і Чэхіі.

— Але найбольш перакладаў у вас з моў паўднёвых славян: сербскай, славенскай, македонскай...

— Калі я быў студэнтам 2 курса філалагічнага факультэта БДУ, то нам давалі магчымасць факультатыўна вывучаць нейкую славянскую мову. Большасць аднакурснікаў ішла на польскую. Але ў тым аб'ёме, які прапаноўваўся (здаецца, 32 вучэбныя гадзіны), я валодаў ёю. Таму абраў сербскую мову — зусім невядомую, а да таго ж прыцягальную. Здольнасцямі да моў Бог не абдзяліў мяне, таму выкладчыцай згаданага факультыўнага курса быў рэкамендаваны ў якасці гіда-перакладчыка ў Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму "Спадарожнік". У Савецкі Саюз тады прыязджала вельмі многа югаслаўскіх турыстычных груп, па-сапраўднаму падрыхтаваных перакладчыкаў з сербскай мовай не хапала, і мне адразу ж далі магчымасць працаваць (дакладней, падпрацоўваць). Так вось, летам 1971 года, і пачалася мая перакладчыцкая "кар'ера". Звычайна я ехаў на мяжу, у Чоп, браў там групу і два тыдні ездзіў па Саюзе, хоцькі-няхоцькі размаўляючы па-сербску. А паколькі Югаславія была шматнацыянальнай краінай, то давялося азнаёміцца і з адрозненнямі, якія мелі іншыя мовы народаў СФРЮ — у прыватнасці, славенская і македонская.

— Але гэта ўсё былі вусныя зносіны. А калі звярнуліся да мастацкага перакладу?

— Нешта перакладаў яшчэ студэнтам. Перш за ўсё тэксты, якія выкарыстоўваліся ў дзвюх курсавых і дыпломнай работах, а потым і ў кандыдацкай дысертацыі — усе яны былі прысвечаны савецка-югаслаўскім літаратурным сувязям. Не маючы асаблівых праблем з сербахарвацкай мовай, я павінен быў сцвярджацца як літаратуразнаўца. А мой першы пераклад надрукаваны быў, калі не памыляюся, у 1977 годзе. І на мяне пачалі звяртаць увагу як на спецыяліста-сербіста, югаславіста наогул. Істотнае значэнне меў наступны выпадак. Неяк паклікаў мяне загадчык рэдакцыі замежных літаратур выдавецтва "Мастацкая літаратура" Леў Антонавіч Салавей і прапанаваў: "Тут вось прыслалі нам кнігі з Югаславіі. Вазьмі прачытай і выберы, што з гэтага варта было б перакласці". Між тым, гледзячы на "спінкі" вокладак, я бачыў, што з усяго стоса толькі дзве кніжкі былі на сербскай мове. Паспрабаваў тлумачыць гэта Льву Антонавічу: маўляў, тут жа і македонска- і славенскамоўныя творы. А ён на гэта: "Ды ўсё ж югаслаўскае. Не чапляйся за дробязі. Бяры і чытай". Так што я мусіў узяцца належным чынам за славенскую мову. Тыдні два чытаў раман. Затым, ужо не так доўга, другі. І палічыў, што адзін з іх можна было б выдаць па-беларуску. Тады Леў Антонавіч сказаў: "Дык бяры і перакладай". Так выйшла першая кніга "Бібліятэкі замежнай прозы" — раман Бэна Зупанчыча "Памінкі" (1983). Прыкладна гэтаксама займаўся і македонскай мовай. Толькі перакладаць для друку стаў пазней.

— І атрымліваецца, што сербскай мовай вы авалодалі на універсітэцкім узроўні, а астатнія вывучалі самастойна?

— Па вялікім рахунку, у адносінах да любой славянскай мовы я "самавук", "самасей". Бо за 32 гадзіны факультатыўных заняткаў авалодаць і сербскай мовай было немагчыма. Задача факультатыва заключалася ў тым, каб даць студэнтам агульныя ўяўленні пра іншаславянскую мову.

— Чаму пасля сканчэння універсітэта з'ехалі з Мінска працаваць на вёску? Былі ж перспектывы ў сталіцы?

— Праца перакладчыка ў БММТ "Спадарожнік" не задавальняла мяне па розных прычынах. Яна была сапраўды цікавай толькі першыя год-два, калі маршруты паездак былі новыя, а ўражанні, адпаведна, моцныя. Потым навізны становіцца ўсё менш, затое ўмацоўваецца звычка бавіць час лёгка, весела і бязладна. Так што да пятага курса ў мяне знікла жаданне гэтым займацца. Хацелася іншага. Мне прапаноўвалі месца ў аспірантуры. Але я ўжо тады ажаніўся і лічыў, што на аспіранцкую стыпендыю нельга ўтрымліваць сям'ю. Таму адназначна вырашыў ехаць настаўнікам у вёску. Пра вясковае жыццё, натуральна, у мяне былі пазітыўныя ўяўленні. Праўда, цяпер магу сказаць, што залішне ідэалістычныя. А каб вызначыць канкрэтна, куды прасіцца пры размеркаванні, заплюшчыў вочы перад картай Беларусі і тыцнуў пальцам наўгад. Трапіў на Воранава, пра існаванне якога, шчыра кажучы, не ведаў. Накіравалі мяне ў сярэднюю школу вёскі Паляцкішкі, на самай мяжы з Літвою, дзе адпрацаваў належныя тры гады. А калі надумаў усё ж вярнуцца ў Мінск, то сутыкнуўся з вялікімі цяжкасцямі. За гэты час, каб будаваць метро, колькасць насельніцтва сталіцы нашай дагналі да мільёна, а потым рэзка перасталі прапісваць усіх жадаючых. І нам, ужо траім, для прапіскі патрабавалася ажно 36 квадратных метраў. Знайсці такую жыллёвую плошчу было проста немагчыма. Стваралася тупік: прапісацца не можаш, і на працу нідзе не бяруць без прапіскі. Ды з часам неяк усё наладжвалася. Праўда, ужо з сям'ёй 12 гадоў давялося жыць у бытоўцы інтэрната на Паркавай магістралі. Вырашылася праблема толькі пасля ўступлення ў Саюз пісьменнікаў, прычым дзякуючы персанальна яго першаму сакратару праўлення Нілу Гілевічу. Справа ў тым, што нават кватэру, якую мне даваў саюз, я не мог атрымаць, паколькі не меў гарадской прапіскі. Толькі настойлівыя хадайніцтвы Гілевіча, а потым і Танка, дазволілі вырашыць гэтую праблему.

— У вас ніколі не ўзнікала крыўды на нашых пісьменнікаў, якія перакладаюць паэзію па падрадкоўніках, а ў той самы час іх ставяць у адзін шэраг з прафесійнымі перакладчыкамі? А фактычна ж ствараецца новы твор на зададзеную тэму.

— Крыўды ў перакладчыка ўвогуле ні на кога быць не павінна. Як перакладчык я зыходна — свядома і добраахвотна! — павінен пагаджацца з другаснай роляй у адносінах да аўтара арыгінала. Дарэчы, ужо як даследчык высветліў, нават вывеў адпаведную статыстыку, што толькі адзін працэнт чытачоў ведае імёны перакладчыкаў прачытаных твораў замежных літаратур. І гэта, па вялікім рахунку, не бяда.

Што ж датычыць паэтаў, якія перакладаюць, то я з многімі працаваў, сам, прапаноўваючы ім падрадкоўнікі. І нярэдка бывала, што іхнія пераклады мелі высокія мастацкія якасці, паўнавартасна прадстаўлялі арыгінал. Але бываюць, як вы кажаце, і сачыненні на зададзеную тэму, і нават "ізлажэнні"-пераказы, якія паводле ўстаноўкі не прадугледжваюць арыентацыі на высокія ўзоры. Такое адбываецца ў паэта, калі ён не здольны пранікнуць у стыхію мовы арыгінала, а ў перакладчыка не-паэта найчасцей — з-за слабага валодання тэхнікай вершаскладання. Удалыя пераклады, зрэшты, могуць атрымлівацца і ў адных, і ў другіх. Ды ўсё ж такі быць сапраўдным перакладчыкам — гэта мець адпаведны дар. Так што, натуральна, і пры наяўнасці вялікага паэтычнага таленту не заўсёды ўдаецца "трансфармаваць" твор адпаведна таму ўзроўню, які ўласцівы арыгіналу. Але не заўсёды гэта атрымліваецца і ў "чыстых" перакладчыкаў-прафесіяналаў.

— У Савецкім Саюзе ў беларускіх выдавецтвах пераклады не залежваліся. Прынамсі, яны выдаваліся. А сёння перакладной літаратуры выходзіць значна менш. Што ў вас яшчэ ляжыць у стале з нявыдадзенага?

— З пачатку 1990-х гадоў мы захоплена плявалі ў бок выдавецкай справы савецкага перыяду: маўляў, усё было надта кепска. Аднак, хоць бы з цяперашняй дыстанцыі трэба прызнаць, што на самай справе больш спрыяльных умоў, чым тады, не было і, відаць, ужо не будзе. Асабліва што датычыць перакладаў і іх выдання.

У сувязі з гэтым трэба пазбаўляцца стэрэатыпаў, якіх мы наставралі аж занадта. Скажам, неаднойчы даводзілася чуць і чытаць пра тое, што Масква нібыта жорстка ўсё кантралявала і вызначала, што перакладаць. А я ж расказаў, як мне, маладому і недасведчанаму ў патрабаваннях "зверху", прапаноўвалася выбраць кнігі для перакладу і выдання. Асобная тэма — што за перакладчыцкую працу тады плацілі добра. І мне асабіста за перакладзеную кніжку прозы аб'ёмам у 10 аркушаў плацілі гадавы заробак выкладчыка. Прычым у сталых перакладчыкаў тады за год выходзіла, як правіла, нават не адна кніга. А якімі тыражамі выдаваліся беларускамоўныя пераклады! Вось глядзіце, кніжкі Зупанчыча, Нушыча: па 10 тысяч асобнікаў! А што сёння? Добра, калі тысяча. Дзве тысячы — ужо рэдкасць.

Пасля развалу той сістэмы ў мяне дзесятак кніжак застаўся, што называецца, у шуфлядах. І доўгі час не з'яўлялася шанцаў іх выдаць. Праўда, у пазамінулым годзе выйшаў зборнік сербскіх народных казак "Мовы ўсяго жывога", а сёлета — кніга казак Грозданы Олуіч "Нябесная рэчка". Тым не меней, па-ранейшаму чакаюць свайго часу падрыхтаваныя мною анталогія сербскага сатырычнага афарызма "Афакаліпсіс" і зборнік Дэсанкі Максімавіч, народнай паэткі Сербіі, якія я дзесяць гадоў таму прапанаваў "Мастацкай літаратуры". У шуфлядзе знаходзяцца таксама анталогіі сербскай паэзіі і казак усіх славян, панарамны зборнік сучаснай сербскай прозы, выбраныя творы Браніслава Нушыча.

— У Беларусі да нядаўняга часу існаваў часопіс "Всемирная литература", функцыі якога цяпер на сябе ўзяў "Нёман". Але гэта рускамоўныя выданні. Свае старонкі пад пераклады даюць часопісы "Полымя", "Маладосць", "Дзеяслоў", "Архэ". Ды гэта кропля ў акіян. Зразумела, што не стае выдання перакладной літаратуры на роднай мове. Але яго стварэнне сёння наўрад ці стане рэнтабельным. Якое выйсце з сітуацыі для перакладчыка: перакладаць у стол і чакаць нейкіх зменаў?

— Нам лёгка раіць, бо мы грашамі не распараджаемся.

Што да часопіса "Всемирная литература", то далейшае развіццё яго бачыў пры пэўных зменах — у прыватнасці, каб ён выдаваўся на дзвюх мовах. З трох нумароў два маглі выходзіць па-руску, а трэці — па-беларуску. Уласна, магчымыя былі самыя розныя варыянты. Скажам, як квартальнік ці як альманах. Раней у нас былі "Далягляды", а яшчэ і "Братэрства", і "Ветразь". Гэта значыць, што перакладчыкам забяспечвалася нейкая надзейнасць у планах і стабільная магчымасць друкавацца. А перакладчыку, як і любому літаратару, патрэбен чытач, з якім можна дзяліцца вынікамі сваёй творчасці. А справа не толькі ў канкрэтным літаратары, і нават не ў родзе, жанры. Ніякая нацыянальная літаратура не можа сцвярджацца, а тым болей плённа развівацца, без паўнавартаснай сістэмы кантактаў, узаемадзеянняў, ды і проста параўнання з іншымі.

Які ж выхад з сітуацыі для нашай нацыянальнай літаратуры, асабліва ўлічваючы тую акалічнасць, што праблемы самасцвярджэння для яе маюць асаблівы змест? Так ці інакш, патрэбна дзяржаўная праграма падтрымкі перакладной літаратуры — і на беларускую мову, і з беларускай. Зразумела, выдаваць пераклады асобнымі кніжкамі. Вельмі пажадана вярнуць адпаведныя кніжныя серыі. А існуючым перыядычным літаратурна-мастацкім выданням трэба часцей свае старонкі аддаваць пад пераклады.

— Што трэба найперш перакладаць: класікаў ці сучасную літаратуру?

— Пры магчымасці і класікаў, і сучасных літаратараў. А калі магчымасці невялікія, то па-беларуску павінны з'яўляцца самыя значныя творы іншых літаратур. Пакуль не будзе фонду сусветнай класікі на нашай мове, беларуская літаратура не зможа лічыцца паўнавартаснай. Калі, да прыкладу, мы не склалі ўяўлення пра такіх класікаў сербскай літаратуры, як Іва Андрыч, Дэсанка Максімавіч, Пётр Негаш, Мілаш Црнянскі, Бранка Чопіч, Добрыца Чосіч, то знаёмячыся нават з цікавым сучасным пісьменнікам, мы не здольныя разумець літаратуру ў цэлым, не можам уявіць яе карані, крону і г.д. У справе перакладу наогул асноўная задача — прадстаўляць не канкрэтную асобу, а нацыянальную літаратуру як плынь з адпаведнымі вытокамі, русламі, паваротамі, вірамі.

— Ці ёсць перакладчыкі з беларускай мовы ў славянскім свеце?

— Колькасць перакладчыкаў з арыгінала даволі сціплая. Тое, што перакладзена з беларускай мовы, без пасрэдніцтва рускай ці польскай, не перавышае 5 працэнтаў ад агульнага аб'ёму. А ён сам па сабе, на жаль, нязначны. Адзін шведскі калега некалі сказаў, што ў сваёй краіне ён лягчэй знойдзе вар'ята, які захоча выправіцца на Месяц без транспартнага сродку, чым таго, які возьмецца перакладаць беларускую літаратуру. У свой час мы паддаліся неадэкватным ацэнкам "пасаду між народамі" і сталі гаварыць, што нашу літаратуру добра ведаюць у свеце. На вялікі жаль, гэта не так.

— Перакладаючы з усіх славянскіх моў, ці здолелі вы праехаць па ўсім славянскім свеце?

— Так, усюды бываў. У розных фарматах, праўда. Дзе працаваў, дзе ўдзельнічаў у канферэнцыях, дзе праездам. Але наведаў увесь славянскі свет, а таксама сербалужыцкія землі Германіі.

— Вы валодаеце славянскімі мовамі. Ці паўставала думка пайсці ў дыпламаты?

— Ніколі. Я, бадай, не адпавядаю тым патрабаванням, якія павінны выстаўляцца да дыпламатаў. Мне цяжка вытрымліваць "павіннасці", сядзець у "прысутных месцах" і да т. п. Яшчэ і камандаваць не люблю. У дзяцінстве накамандаваўся. А цяпер хачу як мага больш сам распараджацца сабою. Такое ж права, адпаведна, прызнаю за іншымі. Для мяне тут справа не ў надуманай абсалютнай свабодзе, а ў тым, каб пазбягаць прымусу. Бывае, тыднямі бязвылазна сяджу ў сваім хрушчобаўскім катуху, выконваючы навуковую ці творчую, перакладную ў тым ліку, працу. Але ж ніхто мяне да гэтага не прымушае.

Гутарыў Сяргей МАКАРЭВІЧ
Фота аўтара

Патрэбна дзяржаўная праграма падтрымкі перакладной літаратуры — і на беларускую мову, і з беларускай. Зразумела, выдаваць пераклады асобнымі кніжкамі. Вельмі пажадана вярнуць адпаведныя кніжныя серыі. А існуючым перыядычным літаратурна-мастацкім выданням трэба часцей свае старонкі аддаваць пад пераклады.

Імёны праверыць час

Нядаўна вядомы балгарскі паэт, перакладчык Найдан Вылчаў, які вельмі шмат зрабіў для развіцця і ўмацавання беларуска-балгарскага літаратурнага супрацоўніцтва, наведаў беларускую сталіцу. Завітаў ён і ў рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову "Літаратура і Мастацтва" — для таго, каб абмеркаваць сённяшнія планы і падзяліцца згадкамі пра колішняе.

Лёс вырашыў

У пасляваенны час узнікла ініцыятыва балгарскага Саюза пісьменнікаў камандзіраваць у кожную саюзную рэспубліку маладога пісьменніка, каб бліжэй пазнаёміцца з ёй, яе народам, гісторыяй, культурай, літаратурай, каб стаць потым перакладчыкам яе аўтараў. Адпаведна, такі ж беларускі госць павінен быў прыехаць і ў Балгарыю. З Беларусі прыехаў малады тады паэт Ніл Гілевіч. Паколькі ў Маскве, у "Максіме Горкім", вучыліся нашыя студэнты Блага Дзімітрава, Дзімітр Методзіеў, Георгі Джагараў, Ліляна Стэфанава, то з Расіяй пытанне было вырашана. Ва Украіну паехаў Іван Давідкаў, пасля і Андрэй Германаў, у Грузію — Орлін Орлінаў і Мікалай Кынчаў, ва Узбекістан — Ярдан Мілеў... Лёс вырашыў, што ў Беларусь паедзе Найдан Вылчаў.

Вершы, паэты і перакладчыкі

У 1961—1962 гг. я амаль па тры месяцы бываў у Беларусі. Пасля гэтага ў балгарскім друку пачалі з'яўляцца творы беларускіх аўтараў, перакладзеныя з арыгінала. Існавала некалі бібліятэка "Савецкія паэты". Пачала выходзіць такая і ў Балгарыі ў выдавецтве "Народная культура", рэдактарам якой быў Хрыста Радзеўскі. Ён папрасіў мяне адабраць і перакласці творы Янкі Купалы і Якуба Коласа. З дапамогай маіх беларускіх знаёмых і сяброў Аркадзя Куляшова, Ніла Гілевіча, Янкі Брыля, Івана Шамякіна я склаў такія томікі, нешта пераклаў, а вярнуўшыся ў Балгарыю, прапанаваў Хрысту Радзеўскаму прыцягнуць да перакладу І. Давідкава і А. Германава. Яны з радасцю пагадзіліся, і беларуская паэзія прыйшла да балгарскага чытача. У цэнтральных літаратурных выданнях з'явіліся імёны Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Петруся Броўкі, Кандрата Крапівы, Аркадзя Куляшова, маладых тады Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Дануты Бічэль, Генадзя Бураўкіна, Анатоля Вярцінскага, Еўдакіі Лось, Сцяпана Гаўрусёва. А ў бібліятэках пачалі з'яўляцца яшчэ і кнігі Панчанкі, Вялюгіна, Някляева, Янішчыц, Законнікава...

У той час у нас выдаваўся часопіс "Панарама" — орган Саюза перакладчыкаў. У мяне была там рубрыка ў кожным пятым нумары "Дзевяць вершаў, тры паэты, адзін перакладчык". Кожны трэці з трох паэтаў быў беларускім. Калі б не адбыліся ў канцы XX стагоддзя вядомыя падзеі, калі б працягвала выходзіць серыя Хрыста Радзеўскага, каб быў яшчэ жывы часопіс "Панарама", яшчэ шмат чаго можна было б здзейсніць. Дзякуй Богу, зроблена было ўсё ж нямала.

Беларусы прысутнічалі і ў двухмоўнай анталогіі беларускай паэзіі, складзенай Румянай Яўцімавай, — ад Францыска Скарыны, Янкі Лучыны, Францішка Багушэвіча да Раісы Баравіковай, Алеся Разанава, Яўгеніі Янішчыц, Віктара Шніпа, Людмілы Рублеўскай. Балгарскі чытач меў магчымасць знаёміцца і з творамі беларускіх празаікаў. У прыватнасці, з празаічнымі творамі Цёткі, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Кузьмы Чорнага, Янкі Брыля, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Івана Пташнікава, Івана Чыгрынава і больш маладых аўтараў — Барыса Сачанкі, Віктара Казько, Вольгі Іпатавай, Алеся Жука, Святланы Алексіевіч, Леаніда Дранько-Майсюка, Алеся Пашкевіча... Усіх і не пералічыш. Хай гэта робяць даследчыкі, імёны і творы праверыць час.

Сучаснасць

У канцы XX стагоддзя выйшлі мае публіцыстычныя кнігі "Беларуская бяроза", "Беларусь — белая балада", аўтарскі зборнік "Мой беларускі сшытак", куды я ўключыў пераклады вершаў з часоў князя Ігара і "Песні пра зубра" да самых маладых аўтараў нашага часу. У 1997 годзе выйшаў і спецыяльны нумар часопіса "Панарама", прысвечаны беларускай літаратуры, у які былі ўключаныя паэзія, проза, публіцыстыка, нізка твораў для дзяцей...

На жаль, цяпер гэты ўздым, гэтая цікавасць да беларускай літаратуры знізілася пад уплывам павышанай увагі да заходняй літаратуры. Не атрымліваем мы больш у Балгарыі газету "Літаратуру і мастацтва", часопісы "Полымя", "Маладосць", "Нёман", толькі зрэдку бачым у гумарыстычнай газеце "Стыршэл" карыкатуру ці невялікі пераклад Венеты Казаравай з надрукаванага ў "Вожыку". І ўсё ж за апошнія гады выйшла кніга Вольгі Іпатавай — аповесць пра Еўфрасінню Полацкую і пятнаццаць вершаў, а таксама зборнікі вершаў Уладзіміра Някляева, Сяргея Законнікава, невялікі зборнік вершаў балгарскіх паэтаў пра Беларусь.

У гэтых ініцыятывах мы заўсёды адчуваем падтрымку Беларускага пасольства ў Балгарыі, асабіста Аляксандра Герасіменкі, Аляксандра Пятрова, Вячаслава Качанава. З нагоды гадавін Янкі Купалы і Якуба Коласа мы два разы выдавалі прадстаўнічыя зборнікі з іх творамі (пра іх і Максіма Багдановіча — "Магучы трыпціх", да 125-годдзя з дня нараджэння беларускіх класікаў — "Двайны юбілей"). Выданні з рэпрадукцыямі карцін беларускіх мастакоў і іншымі ілюстрацыйнымі матэрыяламі дазволілі чытачам пазнаёміцца з вашай графікай і жывапісам. Дарэчы, і вашыя музычныя прывітанні "далятаюць" да нас праз радыё і тэлебачанне, варта прыгадаць і балет пад кіраўніцтвам Валянціна Елізар'ева, які сабраў чатырохтысячную аўдыторыю ў зале Палаца культуры. І беларускія спартсмены маюць у нас вялікіх прыхільнікаў — на жаль, іх болей, чым аматараў лірыкі.

Украінцы на нас крыўдуюць, што беларусаў друкуем часцей, чым іх. Хай тады інтрыгуюць перакладчыкаў! Калі перафразаваць тую злавесную фразу: "Няма чалавека — няма праблемы", можна сказаць: "Ёсць перакладчык адпаведнай літаратуры — ёсць такая літаратура ў яго краіне, няма перакладчыка — няма літаратуры". Балгары любяць беларусаў, у іх гісторыі і лёсе ёсць багата агульнага, і, нягледзячы на цяперашні перапынак, зацішша, я перакананы, што беларуска-балгарскае супрацоўніцтва працягнецца.

Тым больш, што беларуская літаратура зараз "прыходзіць" у Балгарыю. Нядаўна з'явілася на балгарскай мове не перакладзеная да гэтага часу "Бандароўна" Купалы, з вялікай цікавасцю быў сустрэты "Тарас на Парнасе". А газета "Пулс" нядаўна прадставіла і новую нізку беларускіх вершаў са зборніка "Дзень паэзіі". Паэт Венка Яўцімаў стаў ужо і выдаўцом, ён дае "зялёнае святло" нашым выданням. Аднак спачатку павінны з'явіцца пераклады. І — самае галоўнае — добрыя пераклады.

Уражанні, якія не знікаюць

Прыгадваю спектаклі "Зацюканы апостал" паводле п'есы Андрэя Макаёнка на нашай сцэне, "Вечар" Аляксея Дударава ў Народным тэатры, выставу карцін Міхаіла Савіцкага ў нашай Нацыянальнай галерэі. Усе яны з неверагоднай сілай распавядаюць пра Беларусь, пра яе пакуты і подзвігі, пра лёс народа. Ад гэтага атрымліваеш уражанне, якое з часам не знікае. Завітайце ў любую нашу бібліятэку, патрымайце ў руках кнігі Васіля Быкава — бібліятэчныя штампікі паказваюць, што іх бралі і вярталі, бралі і вярталі. Ды і ў многіх асабістых бібліятэках яны займаюць пачэснае месца. Усё таму, што яго кнігі праўдзіва расказваюць пра вайну, паказваюць яе не ў парадным пафасе. Васіль Быкаў — самы папулярны беларускі празаік у нас.

Я згадваю, як прадстаўляў балгарскім чытачам Івана Шамякіна ў перапоўненай, так званай тады, "рускай кніжарніцы". Нібыта цяпер, бачу гімназістак у Вяліка Тырнава, якія пасля ўрокаў, стаіўшы дыханне, слухаюць Янку Брыля. Ён ім кажа: "Ідзіце дадому, ужо цямнее", — а яны просяць: "Яшчэ, яшчэ!" Я бачыў Максіма Танка сярод руж каля Казанлыка — ён напісаў вершы пра Дунай і пра "Даліну руж". Згадваю, як Ніл Гілевіч палымяна прамаўляе свае строфы пра Васіля Леўскага і Кастуся Каліноўскага і пераконвае мяне, свайго балгарскага брата, што ў ім цячэ кроў Леўскага, а ў балгарына — кроў Каліноўскага.

А калі б не было Ніла Гілевіча?! Кажуць, незаменных людзей няма. Але ці так гэта ў дачыненні да мастацтва? Хто б хацеў гэтак жа, як ён, прысвяціць дзесяткі гадоў свайго жыцця балгарскай паэзіі, перакладу і ўкладанню зборнікаў і анталогій, безлічы вершаў двухсот пяцідзесяці балгарскіх паэтаў ад Боцева, Славейкава, Вазава да аўтараў сучасных? Балгарыя адзначыла яго міжнароднай Боцеўскай узнагародай і будзе яму бясконца ўдзячная на доўгія гады — найперш за тое, што ў беларускіх кнігах пасяліліся і Явараў, і Дзебелянаў, і Вапцараў ды іншыя.

Я ўсё яшчэ з "Подыхам навальніцы" і "Людзьмі на балоце" Івана Мележа; я яшчэ бачу Гальшанскі замак, бачу, як "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", як кароль Стах ідзе на паляванне з Уладзімірам Караткевічам; чую "Плач перапёлкі" з Іванам Чыгрынавым; я з Яўгеніяй Янішчыц і лірычным героем Генадзя Бураўкіна, які ў музеі не можа дакрануцца да партызанскага сцяга рукой і таму дакранаецца вуснамі, я з героямі вершаў Ніла Гілевіча... Ніхто не можа выселіць мяне з гэтага свету, у ім ёсць усё.

Падрыхтавала Жанна КАПУСТА

На здымку: балгарскія госці ў сценах РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Фота Віктара Кавалёва

Святло веры і духоўнасці

У дні, калі Царква ўшаноўвала свята Тройцы, свой дзесяцігадовы юбілей адзначыла духоўна-асветніцкая газета «Воскресение». Пра гісторыю гэтага выдання, пра тое, што яно ўяўляе сабой сёння, мы папрасілі расказаць рэдактара газеты «Воскресение» педагога, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтара некалькі кніг вершаў і казак для дзяцей, перакладаў Жыцій святых, з якіх самае вядомае — «Сказание о Житии преподобной Ефросинии, игуменьи и княжны Полоцкой» Алену Міхаленку.

— Першы нумар «Воскресения» пабачыў свет у 1999 годзе, акурат на гэтае праваслаўнае свята. То, як вядома, быў няпросты час. Тысячы нашых сучаснікаў, якія дагэтуль з'яўляліся атэістамі, пасля дэмакратызацыі грамадства даведаліся, што рэлігія — гэта зусім не тое, што ім уводзілі ў галаву не адно дзесяцігоддзе партыйныя ўлады. Адны кінуліся шукаць духоўнасць у заезджых хрысціянскіх прапаведнікаў, хтосьці зацікавіўся загадкавымі вучэннямі з Усходу. Але былі і тыя, хто адразу пайшоў правільным шляхам, упершыню пераступіўшы парог храма. У ліку іх аказалася і таленавітая беларуская пісьменніца і журналістка Марыя Філіповіч, якая менавіта ў Праваслаўнай Царкве знайшла сапраўднае святло духоўнасці і захацела далучыць да гэтага святла тых, хто пакуль блукаў у поцемках. Ідэю стварэння духоўна-асветніцкай газеты падтрымаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт. Так і з'явілася газета «Воскресение» — выданне, разлічанае на настаўнікаў, бацькоў, а калі глядзець шырэй, то на ўсіх тых, хто неабыякавы да пытанняў духоўнага адраджэння, пры тым праз праваслаўную веру. Як вядома, тады яшчэ з'яўлялася мала духоўнай літаратуры. Нават Біблію было цяжка знайсці. Таму яе, а таксама малітвы вернікі перапісвалі ад рукі. І з цікавасцю чыталі новую газету, са старонак якой даведваліся пра гісторыю Царквы і яе сучаснае жыццё, знаёміліся са спадчынай вядомых хрысціянскіх святых, багасловаў, педагогаў. Змяшчаліся таксама вершы, апавяданні, казкі. На жаль, Марыя Філіповіч рана пайшла з жыцця.

— А як даўно вы, Алена, з'яўляецеся рэдактарам «Воскресения»?

— Калектыў я ўзначальваю ўжо шосты год. Не сказаць, каб цяпер было працаваць лягчэй. Усё ж — новыя ўмовы. Рынак духоўнай літаратуры прапануе вялікі выбар кніг, перыядычных выданняў, таму цяжэй утрымліваць сваю нішу. Тым не менш, наша газета па-ранейшаму запатрабаваная чытачамі. Не ў апошнюю чаргу таму, што вялікую ўвагу надаём матэрыялам сацыяльнай скіраванасці, праблемам грамадства і сям'і, моладзі і падлеткаў. Зразумела, што ўсе гэтыя праблемы разглядаюцца праз прызму праваслаўнай культуры, традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцяў.

— Многія рэдакцыі ў сучасных умовах не абмяжоўваюцца толькі выпускам сваіх выданняў.

— Мы таксама пайшлі падобным шляхам. Супрацоўнікі газеты вядуць вялікую грамадска-асветніцкую работу, прымаюць актыўны ўдзел у рэспубліканскіх адукацыйных чытаннях і семінарах, міжнародных праваслаўных канферэнцыях, выставах і г.д. І, зразумела, сустракаюцца з чытачамі. Пяць гадоў таму пры рэдакцыі было створана творчае аб'яднанне «Літаратурная гасцёўня», што сабрала паэтаў і празаікаў, акцёраў і музыкантаў — як пачаткоўцаў, так і прызнаных майстроў слова і сцэны.

— Ці нельга больш канкрэтна?

— Пастаяннымі ўдзельнікамі ўсіх праектаў гасцёўні сталі вядомыя паэты Ала Чорная і Таццяна Дашкевіч, акцёры Ірына Нарбекава і Яўген Піменаў. Некалькі гадоў правёў з калектывам знакаміты пісьменнік і бард Мікалай Шыпілаў, які, на жаль, заўчасна пайшоў з жыцця. Дзякуючы нам, фарміраваўся талент выканаўцы песень Вольгі Міхаленкі, якая стала лаўрэатам некалькіх музычных фестываляў. Канцэрты ўдзельнікаў гасцёўні з поспехам праходзяць не толькі ў сталіцы, а і ў Брэсце, Гомелі, Гродне, Лідзе, Навагрудку, Пінску, Баранавічах, Барысаве, Оршы, Слуцку, Жодзіне... Вечарыны духоўнай паэзіі і аўтарскай песні адбываліся ў канцэртных залах, школах, бібліятэках, вышэйшых навучальных установах. Апроч пастаянных удзельнікаў, гасцямі вечарын былі вядомыя паэты Валянціна Паліканіна і Андрэй Скарынкін, заслужаны артыст Беларусі Віктар Манаеў ды іншыя. Нядаўна канцэрт прайшоў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Усе нашы мерапрыемствы — дабрачынныя. Мэта аб'яднання — несці людзям святло праўды і сапраўднай духоўнай культуры.

Гэтай высакароднай мэце служыць і сама газета «Воскресение», у якой, верыцца, будзе яшчэ доўтае і светлае жыццё, бо такія выданні грамадству вельмі патрэбны.

Гутарыў Арсень ЯРОШЫК

Чэрвеньскія ўловы

Пабачым ранкам твой улоў:
На нітках рытмаў нізкі слоў.

Усевалад Гарачка

Не давяраць нікому будучыню

Чэрвеньскі нумар "Полымя" прадстаўляе чытачу заканчэнне рамана Ягора Конева "Літоўская адысея Тадэвуша Касцюшкі", пачатак якога друкаваўся ў № 5. Ягор Конеў, відавочна, ставіў сабе за мэту стварэнне мастацкага вобраза альтэрнатыўнага сучаснай модзе героя, Беларускага Героя, якім не толькі належыць, але якім у першую чаргу хочацца захапляцца.

Пісьменнік выбраў асобу са складаным лёсам, якая жыла ў пераменлівы, супярэчлівы час. Адаптаваць такі матэрыял да чытэльнасці мастацкага твора было не так проста. Гэта часам адчуваецца ў тых эпізодах, дзе пісьменнік падпарадкоўваўся не мастацкай, але энцыклапедычнай праўдзе. Так, занадта доўгія дыялогі герояў, у якіх выказванні кожнага з іх уяўляюць па сутнасці гістарычна-філасофскія трактаты, часам парушаюць мастацкую гармонію. Замест гэтай абстрактнай прасторы хацелася б бачыць рэальнасць дзеяння. Дарэчы, апісанне дзеяння сапраўды часам замяняе ў рамане яго выяўленне, і чытач пачынае сумняваць. Асабліва гэта характэрна для першай часткі рамана. Але цярплівы чытач будзе ўзнагароджаны падчас знаёмства з другой — якраз той, якая прадстаўлена ў чэрвеньскім нумары.

Авантурная, напаўдэтэктыўная гісторыя раскрыцця змовы супраць караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага і пакарання змоўшчыкаў зможа захапіць нават абыякавых да гістарычных жанраў аматараў літаратуры. Падчас чытання складаецца ўражанне, нібыта аўтар сам быў удзельнікам апісаных падзей — настолькі вялікая ступень суперажывання героям, пранікнення ў іх псіхалогію і ў адметныя асаблівасці часу, у які адбываецца дзеянне, — канец XVIII стагоддзя. Цешыць тое, што пісьменнік лічыў сваім абавязкам быць абазнаным не толькі ў перыпетыях палітычнага ўкладу тагачаснай Рэчы Паспалітай, але і ў побыце, норавах, звычаях. Выдатна прадэманстравана гэта і ў апісанні знешняга выгляду герояў, іх убранняў, манеры трымацца і размаўляць, што дапамагае чытачу адчуць атмасферу часу, але не адцягвае ад успрымання асноўнага дзеяння. І іншыя героі — кіраўнік змовы пан Любамірскі, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі і яго паплечнік Казімір Камажэўскі, Рыгор Пацёмкін і шпег Малішэўскі — не сталі толькі схематычнымі ўвасабленнямі пэўных рысаў характару. Гэта самастойныя персанажы, характары якіх дэталёва распрацаваныя, жыццёвыя пазіцыя якіх акрэсленыя не ў рытарычных фразах, але па-мастацку тонка ў жэстах, манерах, звычках. Такім чынам, аднаўленне гістарычнага каларыту — безумоўна, адно з найбольш плённых здабыткаў Ягора Конева, аднак галоўная яго заслуга ўсё ж не ў гэтым.

Тадэвуш Касцюшка — нацыянальны герой, а гэта значыць, асоба светла-недакранальная. Пра такіх людзей сёння можна ствараць толькі міфы, зрэшты, і ўсёй праўды сёння ўжо ніхто з нас ведаць не можа. А таму і пісьменнікі, якія выбіраюць такіх асоб у якасці герояў сваіх твораў, ставяць сябе ў незайздроснае становішча. Трэба не разбурыць міф, але ў той жа час і выйсці за яго межы — інакш няма сэнсу ў напісанні твора ўвогуле. Ягору Коневу гэта ўдалося. На старонках рамана Тадэвуш Касцюшка паўстае чалавекам мужным, сумленным, бескампрамісным, як і належыць герою, і нешчаслівым у каханні мужчынам, які вымушаны шукаць сваё месца ў жыцці, які ўвесь час трапляе ў сітуацыю выбару паміж дабрабытам, славай і сумленнем, які павінен умець адрозніваць шчырых прыхільнікаў ад тых, хто ўсяго толькі імкнецца выкарыстаць яго імя ў сваіх інтарэсах... Герой рамана Ягора Конева — гэта чалавек, які штодня знаходзіцца на мяжы ўнутранага раздраю, аднак пры гэтым сам творыць сваю будучыню, не давяраючы яе нікому.

Сцэна напрыканцы рамана, калі кароль прапаноўвае Касцюшку пасаду генерала за выкрыццё змоўшчыкаў, дыялог, які адбываецца паміж пыхлівым манархам і будучым кіраўніком паўстання, — гэта, мабыць, самыя галоўныя старонкі ў рамане. Хацелася б, каб чытач звярнуў на іх асаблівую ўвагу, прааналізаваў свой дзень учарашні, зазірнуў у дзень заўтрашні і задаў сабе хаця б адно важнае пытанне.

Пазнаёміцца чытач і з аповесцю Васіля Ткачова "Скачы ад печы, жэўжык!", апавяданнем Таісы Супрановіч "Жывуць у вёсцы людзі". Паэзія прадстаўлена нізкамі вершаў Казіміра Камейшы, Анатоля Зэкава, Сяргея Патаранскага, Анатоля Аўруціна. Акрамя гэтага, у чэрвеньскім "Полымі" — артыкулы Васіля Жураўлёва, Серафіма Андраюка, Алеся Марціновіча, Васіля Старычонка, Алеся Карлюкевіча, Анатоля Мяснікова, Артура Зэльскага.

Водгулле мінулага

Чэрвеньскі нумар "Нёмана" прысвечаны ваеннай тэматыцы, 65-годдзю вызвалення Беларусі. Патрыятычны пафас прысутнічае ў вершах Уладзіміра Карызны, Рыгора Сакалоўскага, Міхаіла Токарава, Мікалая Іванова, Іосіфа Рогаля, Віталя Савіцкага, Людмілы Галыгінай. Амаль ва ўсіх нізках — паэтычнае асэнсаванне псіхалагічнай спадчыны, што пакідае ў нашых душах вайна. Уладзімір Карызна прыгадвае першыя пасляваенныя гады:

Только что
закончилась война.
Мы — как птенцы
на горьком пепелище:
Хоть ласково
глядит на нас весна,
Но счатье к нам
дороги не отыщет...

Водгулле вайны ў Афганістане — у вершах Рыгора Сакалоўскага:

Я еще не раз,
Мой друг,
На простреленном
«Тюльпане»
Над Кабулом
Утром ранним
Совершу
Печальный круг.

Міхаіл Токараў прыгадвае далёкія, але цяжкай памяццю незабыўныя старонкі ўласнага жыцця:

Мне итожить
свой путь не просто —
Мои тысячи
ратных вёрст.
...Я у прошлого
брал уроки.
На мишенях
писал диктант.
Моим гением
и пророком
Был задумчивый
капитан.

Своеасаблівым падсумаваннем асноўнага сэнсу паэтычных старонак нумара могуць служыць радкі Мікалая Іванова:

Я был опять
сегодня на войне,
На той, далёкой,
— в сорок пятом...
Она из прошлого
пришла ко мне
В шинели
фронтовой солдата.

Проза прадстаўлена апавяданнямі Паўла Саковіча (у перакладзе М. Пазнякова), Івана Стадольніка (пераклад Д. Шабалінай), Андрэя Душачкіна-Клімава, а таксама заканчэннем аповесці Андрэя Федарэнкі "Нічые" і главамі з рамана Уладзіміра Навумовіча "Вобюлиманс".

Шчымлівай танальнасцю кранае апавяданне Паўла Саковіча "Праздник". Аўтар апісвае, як Нікіфар Жвалевіч, ветэран вайны, рыхтуецца да свята Перамогі. Аднак сёлетняе свята стала для яго незвычайным, удвая большым святам, што і падкрэслена ў назве. Нечакана герой сустрэўся з чалавекам, якога бачыў толькі аднойчы, калі, паранены, апынуўся ў партызанскім атрадзе. Гэты чалавек узяў прозвішча баявога таварыша Жэнькі, які загінуў у адным з баёў: "*А после боя клятву дал: если жив буду, возьму себе фамилию Женьки. У него семью всю каратели уничтожили, а у меня брат еще... Нельзя, чтобы исчез род Толстиков. Несправедливо будет*". Ці кожны наважыцца такім чынам ушанаваць памяць сябра? Адказ на гэтае пытанне па-за апавяданнем: магчыма, тое, што давялося перажыць гэтым людзям разам, патрабавала толькі такога ўчынку.

Працягвае тэму філасофскі нарыс Льва Крышталовіча "Философско-исторический смысл Победы", нарысы Васіля Гурскага, Рамана Паўловіча, Валерыя Ярмоленкі пад агульнай рубрыкай "Да 65-годдзя вызвалення Беларусі", успаміны генерала-лейтэнанта ў адстаўцы Юрыя Іванова, даследаванне Дзіны Дудзінскай і Алеся Загорскага "Сталинградская битва в белорусской литературе". Акрамя гэтага, да ўвагі чытачоў — артыкулы Уладзіміра Гніламёдава, Алеся Карлюкевіча і агляд новых кніг, зроблены Ігарам Карнейчыкам і Васілём Барханавым.

Час сустрэчы застаецца тым жа

Васіль Шырко знаёміць чытача з прыгодніцкай аповесцю "Брыльянтавая брошка". Заглынуўшы "прыгодніцкую" нажыўку, прагна пачынаеш чытаць...

Галоўны герой інжынер Сяргей Вакуловіч (у якога, вядома, паводле класікі жанру, дрэнная, непрыгожая, сварлівая, сквапная і г.д. жонка) раптам нечакана атрымлівае ад сваёй бабулі ўпрыгожанне з рэдкім брыльянтам, кошт якога можа дазволіць свайму ўладальніку жыць, як у казцы, ды да канца жыцця не хадзіць на дзяржаўную службу... Прыгода, мабыць, у тым, як герою з дапамогай увішнага яўрэя ўдаецца атрымаць за брыльянт поўны кошт, не падзяліўшыся з дзяржавай (дзеянне адбываецца ў пачатку 1990-х гадоў.)...

Аднак героі мусяць разгадаць яшчэ адну загадку: адкуль простая паляшучка, якая ўсё жыццё працавала ў калгасе, мае такую каштоўную рэч? Бабулька хітравата ўсміхаецца і прызнаецца: гэта падарунак славутага бацькі Махно. Аказваецца, у маладосці сціплая жанчына тры гады прабыла ў лагеры Махно ў якасці яго "дамы сэрца" і вярнулася ў вёску з маленькім сынам. Цікаўным паведаміла, што бацька хлопчыка — чырвоны камандзір, якога забілі на фронце, і засталася сабе далей спакойна жыць, гадаваць Несцерку — бацьку галоўнага героя Сяргея Вакуловіча.

Нават калі пакінуць па-за ўвагай ступень гістарычнай верагоднасці такой сітуацыі (як апынуўся Нестар Махно ў палескай вёсцы, як удалося бабулі Вакуловіча ацалець падчас рэпрэсій з такім фактам біяграфіі), то застаецца ўсё-ткі незразумелым, дзе ж у аповесці тое самае "прыгодніцтва", пра якое так красамоўна значыцца ў падзагалоўку. Самы напружаны момант у творы — гэта ўспаміны бабулі Галі пра той час, як паранены Махно спыніўся ў яе хаце і як паміж імі ўзнікла пачуццё. Усё астатняе выглядае надта спакойна і, так бы мовіць, "пераказальна". Чамусьці самым цікавым з пункта гледжання развіцця сюжэта момантам аўтар не надаў належнай увагі і адначасова спыняўся на дробязях, якія з аднолькавым поспехам маглі б і не прысутнічаць у тэксце. У аповесці шмат цікавых адзнак свайго часу і жыццёвых назіранняў, аднак відавочна не стае напружанасці сюжэта, дынамічнасці, вастрыні.

Акрамя гэтага, на празаічных старонках — апавяданне дэбютанткі Кацярыны Іванінай "Апошні сон", "Адзін дзень" з аповедаў жыцця Уладзіміра Мароза, заканчэнне рамана Юзафа Крашэўскага "Кароль у Нясвіжы", а таксама аповесць Алеся Паплаўскага "Бонза", пра якую пойдзе асобная гаворка пры аналізе новай кнігі пісьменніка "Пастка для рэха".

Самыя адметныя паэтычныя старонкі нумара — нізка вершаў Усевалада Гарачкі "Радасць і сум". Ёсць цікавыя вершы і ў нізках Рагнеда Малахоўскага, і ў дэбютанткі Таццяны Мацюхінай... Аднак у іх заканамерна не стае аднаго — сфармуляванасці свайго паэтычнага крэда, пакуль відавочная толькі ўсвядомленасць жадання выказацца. А вось у радках Усевалада Гарачкі — самадастатковасць паэта і разам з тым установка на паразуменне з чытачом. Апошняе магчыма найперш дзякуючы выспеленасці паэтычнай думкі, выразнасці кампазіцыі і прадуманасці вобразных сродкаў. Як вынік — лаканічнасць, адсутнасць лішніх слоў і непатрэбных дэталяў:

Зноў я сустрэў
сябе выпадкова,
Недзе ў пачатку
стагоддзя:
Стаяў,
Здаецца,
ні аб чым і не думаў.
Шкадую,
Што так
і не наважыўся
пагаварыць —
Не часта
мы бачымся
Ў гэтым жыцці.

Разумець гэта можна па-рознаму. Магчыма, маецца на ўвазе пачатак XX стагоддзя. У беларускім сацыякультурным кантэксце такі выбар часу спаткання паэта з самім сабой цалкам зразумелы. Магчыма, У. Гарачка на гэтае разуменне і спадзяецца, не даючы каментарыяў, бо ў гэтых гаваркіх і адначасна недагавораных словах — асноўная сэнсавая нагрузка. Менавіта недзе ў пачатку стагоддзя карані нас сённяшніх.

Пазнаёміцца чытач і з "новым іміджам" Міколы Чарняўскага — у нумары нізка яго трыялетаў. Ірына Багдановіч прадстаўляе пераклад гістарычнай драмы Уладзіслава Сыракомлі "Магнаты і сірата (Зоф'я, князёўна Слуцкая)", Уладзімір Ягоўдзік — пачатак цікавага даследавання "Быў знак на небе, або Прырода Беларусі за 1000 гадоў у з'явах і падзеях на старонках летапісаў і друку".

* * *

Карыстаючыся метафарай радкоў, вынесеных у эпіграф, хочацца правесці наступную іранічную паралель. Здараецца ж, што рыбакі выкідаюць назад у ваду рыбіну, калі яна такая, што адно кату паласавацца, — хай падгадуецца. Дык ці не варта і пісьменнікам час ад часу некаторыя свае "ўловы" выкідаць назад у няспынную раку падсвядомага творчага працэсу — хай падгадуюцца і трапяцца на вуду больш дасканалымі — словам, радком, сюжэтам.

Жанна КАПУСТА

Лепшае з творчай спадчыны трох выдатных айчынных паэтаў выйшла нядаўна асобным зборнікам у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Сціплае і зрокава ненавязлівае, але надзвычай густоўнае афармленне аздабляе выданне. У верхняй частцы вокладкі, на светла-зялёным, амаль бясколерным фоне — невялікі вянок з палявых кветак, травы, збожжа. І назва — "Залатое жыта". Кніга не прэтэндуе на азначэнне "фаліянт" — усяго 128 старонак. Як — спытаеце вы — можа на такой малой друкаванай плошчы змясціцца ажно тры паэтычныя Сусветы? Можа. Прычым, тут не толькі паэзія — побач з творцамі бяруць слова крытыкі: кожны раздзел суправаджаецца грунтоўным артыкулам пра творчасць і асобу паэта.

Шматграннасць і талент

Дык хто ж яны, аўтары зборніка? У анатацыі пра іх пішацца: *"Гэтых шырока знаных і неардынарных творцаў яднае не толькі адна Радзіма (Касцюкоўшчына, Краснапольшчына і Шклоўшчына), адзін гістарычны час (XX стагоддзе), але і адзінаверная любоў да сваёй Беларусі..."* Сапраўды, вышэйпералічанае здольна аб'яднаць больш, чымсьці рэгаліі, званні, узнагароды. Таму, пазнаёміўшыся з творамі, змешчанымі ў гэтым зборніку, пераконваешся ў каторы раз: не званне робіць паэта шырока вядомым, бо з усіх трох творцаў толькі адзін, асобай якога, дарэчы, і адкрываецца кніга, займеў афіцыйна прысвоенае званне "народны".

Думаю, вы ўжо здагадаліся, пра каго ідзе гаворка. Гэта тры паэтычныя зоркі мінулага стагоддзя, творцы, якіх, на жаль, няма з намі побач фізічна, але яны працягваюць жыць у сваіх паэтычных радках, некалі вымаўленых на высокім уздыме пачуцця, — гэта Аркадзь Куляшоў, Аляксей Пысін, Анатоль Сербантовіч. Адныя з тых, "нямногіх", хто сапраўды застаўся ў беларускай паэзіі, хто годна яе прадстаўляе на фоне ўсіх тых "пакліканых", якія, на жаль, не сталі "выбранымі", а такіх, як мы ведаем, у нашай літаратуры большасць — пры жыцці іх лічаць паэтамі, альбо яны самі сябе імі лічаць, а на паверку застаецца толькі шэрасць вершаваных радкоў у тамах выбраных твораў, якім наканавана век стаяць некранутымі на паліцах бібліятэк (у лепшым выпадку).

"На паўмільярдным кіламетры" — гэта выбранае з вершаў Аркадзя Куляшова. Паперадзе вершаў — натхнёная, таленавітая прадмова выдатнага нашага крытыка Варлена Бечыка, якая называецца "Урокі Куляшова". Асноўная адметнасць стылю гэтага крытыка — гарманічнае спалучэнне індывідуальнага і агульналітаратурнага, прычым захоўваецца патрэбная дыстанцыя, не назіраецца такога небяспечнага для крытыка пераходу мяжы, калі асабістае знаёмства служыць магчымасцю выставіць на першы план сябе. Асоба Куляшова для Бечыка заўжды на вышыні, амаль недасягальная, увесь артыкул — усяго толькі спроба наблізіцца да Паэта. Гэта адначасова і вучоба (дзіцячыя згадкі, успаміны пра прачытанне паэмы "Прыгоды цымбал", пазней — знаёмства з Куляшовым як з чалавекам, прычым, духоўнае не супярэчыць зямному, не псуе воблік творцы), і асэнсаванне значнасці творчай спадчыны паэта ў маштабах эпохі. Нельга не згадаць той факт, што некалі Варлен Леанідавіч нават выдаў цэлую кнігу пра творчасць свайго куміра і назваў яе "Шлях да акіяна".

Творы, змешчаныя ў "куляшоўскім" радзеле, — хрэстаматыйныя, вядомыя ўсім. Тут і знакаміты верш, які стаў пасля песняй "Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая...", і класічныя "Плыла, цалавалася хмара з зямлёй...", "Мая Бесядзь", "Ліст з палону", "Да паэзіі", "Сасна і бяроза", і паэма "Варшаўскі шлях", і знакамітыя філасофска-элегічныя шаснаццацірадкоўі. Хочацца адзначыць добры паэтычны густ укладальніка Леаніда Галубовіча — дзякуючы яму ў зборнік не патрапіла ніводнага кан'юнктурна-прахаднога твора, без якіх абыходзіўся рэдкі тагачасны паэт.

Дзіўна, але куляшоўская лірыка гучыць тут неяк паасабліваму прачула, што не характэрна ўвогуле для строгай, амаль камернай скіраванасці яго твораў. Наўрад ці справа ў падборы вершаў. Хутчэй тут дзейнічае закон змены ракурса, дзякуючы якому лепш бачыцца шматграннасць алмаза. Невыпадкова ў кнігу ўвашлі ажно два вершы, прысвечаныя памяці лепшых юнацкіх сяброў Куляшова — паэтаў Змітрака Астапенкі і Юлія Таўбіна, якія былі рэпрэсаваныя ў страшныя 30-я.

Кніга выбраных вершаў Аляксея Пысіна, прадстаўленая тут, мае назоў "На чуйным провадзе саломы". З прадмовай выступае знаны літаратуразнаўца Дзмітрый Бугаёў. Як і ў папярэдняй прадмове, назіраецца комплексны падыход да асэнсавання творчай сутнасці паэта. Чалавечыя якасці і тут з'яўляюцца вырашальным фактарам, што характарызуе ў тым ліку і творчасць Аляксея Пысіна. Гэта невыпадкова. І Куляшоў, і Пысін бачылі ўсе жахі найвялікшай трагедыі XX стагоддзя — Другой сусветнай вайны. Таму яны ведалі цану жыцці, цану простым чалавечым пачуццям, здольнасці суперажываць чужому гору. Вершы Пысіна, прадстаўленыя ў кнізе, разнапланавыя — тут і інтымная лірыка, і ваенна-патрыятычныя, і філасофскія вершы. Прысутнічаюць усе класічныя, самыя вядомыя творы паэта: "Іван-чай", "Палім мы маршанскую махорку...", "Ёсць на свеце мой алень...", "Балада пра камбата" ды іншыя, больш або менш вядомыя, але ўсе бездакорныя ў літаратурным сэнсе, вытрыманыя на адной высокамастацкай ноце.

Аляксей Пысін — паэт, у творчасці якога ваенная тэма праявілася найбольш, можна нават сказаць, яна з'яўляецца скразной. Але ёсць і звыштэма, знітаваная ў ланцужку "жыта—жыццё—вечнасць", асабліва яскрава выяўленая ў вершы-прысвячэнні Сцяпану Гаўрусёву "Забыта многае ў жыцці...".

У адрозненне ад двух папярэдніх паэтаў, апошні, прадстаўлены ў кнізе, — Анатоль Сербантовіч — належыць да пазнейшага пакалення "шасцідзесятнікаў", творцаў, чыё дзяцінства было абпалена вайной, якія спазналі голад, безбацькоўе, пасляваенны рэзрух. Ім наканавана было расці і сталець ва ўмовах жорсткага кантролю над асобай. Але творцы кшталту Сербантовіча ніколі не патрапілі ў "агульную плынь", не змяшчаліся ў зададзеныя рамкі. Відаць, таму і пражыў паэт мала — усяго 29 гадоў, бо больш наўрад ці змог бы вытрымаць з-за сваёй надзвычай тонкай душэўнай арганізацыі. Пра гэта, дарэчы, піша ва ўступным слове да вершаў паэта Леанід Галубовіч: *"Паэты падчас вельмі наіўныя і ранімыя людзі. Іх унутраны свет заўжды кантрастны адносна свету вонкавага. І ўся трагедыя іх кароткіх зямных жыццяў у немагчымасці дарэшты згарманізаваць духоўную і метафізічную сутнасць гэтых двух паралельных светаў"*. У адрозненне ад двух першых аўтараў прадмоў, Леанід Галубовіч прызнаецца, што яму не давялося ведаць асабіста Анатоля Сербантовіча. Адзінае матэрыяльнае сведчанне пра яго як пра чалавека — сціплая магілка на Усходніх могілках. Тым не менш, прадмова прываблівае спробай філасофскага асэнсавання месца паэта і Паэзіі ў жыцці чалавека. На мой погляд, тут вельмі ўдала "схоплена" сутнасць паэтыкі Сербантовіча, пра што заяўлена і ў самой назве прадмовы: "Нявольнік без ланцугоў" (памятаеце ў таго ж Куляшова: "Я вязень твой, а ты — мая турма"). Вершы — гэта вярыгі паэта, ён уздзяе іх на сябе добраахвотна, "прымае схіму". Таму толькі такі творца мае права ўголас заявіць:

Няма ні тут, ні там,
за дымкай.
Няма ў дзвярах,
няма ў акне.
Няма мяне
ў тваіх абдымках.
Няма мяне... Няма мяне.

Ад такіх радкоў адначасова і жудасна, і хочацца схіліць галаву перад смеласцю аўтара. І міжволі думаецца: куды да аўтара гэтых радкоў некаторым сучасным філосафам ад літаратуры, якія прыходзяць да аналагічных высноў, але з адной істотнай розніцай: іх роздум голы, не заснаваны на пачуцці, а ў сваёй аснове мае толькі набор мёртвых літар.

Сербантовіч, бадай, самы непасрэдны і бунтоўны па сваёй прыродзе паэт сярод прадстаўленых трох і ў той жа час многія яго вершы адзначаныя незавершанасцю творчага развіцця, што праяўляецца ў шматлікіх "пераборах", адсутнасці пачуцця меры і нават густу. Хто ведае, магчыма, калі б ён дажыў да веку Куляшова або Пысіна, ён бы пасур'ёзнеў, больш адтачыў свой радок, узбагаціў слоўнікавы запас. Але паэты ёсць такія, якія яны ёсць — харошыя і розныя, менавіта таму іх і цікава чытаць, перачытваць, знаходзіць у іх радках нешта сваё. Калі перафразіраваць вядомае выслоўе, такія творцы "ўдасканальваюць свет пасродкам уласных недасканаласцей", асвятляюць прасцяг для далейшага развіцця.

Завяршаючы гаворку пра кнігу выбранага трох паэтаў, хочацца працытаваць глыбакадумныя куляшоўскія радкі, якія, на мой погляд, вельмі адпавядаюць тэме:

Не прыпыняйся,
не жахайся, слова!..
Хай адвячорак
доўгім ценем лёг —
Магчыма немагчымая
размова
Датуль, пакуль
магчымы маналог.

Папраўдзе, творчасць кожнага Паэта — гэта своеасаблівы маналог, які ён прамаўляе ўсё сваё жыццё. Застаецца ж адкрытым пытанне: ці будзе ён пачуты і зразумелы?

Янка ЛАЙКОЎ

Прарасці зярняткам...

Рэдка такое здараецца: аўтар даслаў адзіны верш у рэдакцыю, у прыватнасці, у часопіс "Родная прырода", дзе я тады працаваў, і той твор быў ухвалены і надрукаваны. А праз нейкі час завітаў у рэдакцыю і сам віноўнік, вясёлы, жыццярадасны, хоць яму было ўжо каля 70. Пазнаёміліся, разгаманіліся мы, і выявілася, што Вацлаў Антонавіч Хадасевіч усё жыццё піша вершы, але нідзе іх не друкаваў.

Нарадзіўся Вацлаў Хадасевіч на Дзяржыншчыне, у пасёлку Воўчкавічы. Закончыў Грычынскую сярэднюю школу, што непадалёк ад Фаніпаля. У гэтай жа школе крыху раней вучыўся вядомы паэт Іван Калеснік. Але пазнаёміцца бліжэй і пасябраваць з ім Вацлаву Антонавічу не давялося. Шляхі іх разышліся. В. Хадасевіч шчыраваў усё жыццё на розных прадпрыемствах Мінска, нават далёка паза межамі яго, а І. Калеснік прафесійна звязаў сябе з журналістыкай, пісьменніцкай творчасцю.

Прайшло шмат гадоў, перш чым творы Вацлава Хадасевіча з'явіліся ў друку: "Роднай прыродзе", "ЛіМе", "Вожыку". Дарэчы, з лёгкай рукі паэта і літсупрацоўніка апошняга — Казіміра Камейшы — вершы, гумарэскі В. Хадасевіча не толькі змяшчаліся ў вядомым гумарыстычным часопісе, але і быў падрыхтаваны першы паэтычны зборнік "Арган", выдадзены ў ТАА "Белпрынт".

"Арган"... "Арган жыцця..." — так і хочацца дадаць яшчэ адно слова. У кнізе, у падтэксце вершаў гэтае словазлучэнне ўгадваецца. І два раздзелы, з якіх складаецца зборнік, — "Лірыка" і "Гумар", — гавораць пра гэта.

І грымнуць, і прыціхнуць гукі,
Ізноў нясуць спакой аргана трубы.
Святлее памяць і мацнеюць рукі,
Бо толькі ты, мой край, заўсёды любы!

Лірычныя вершы В. Хадасевіча — простыя, шчырыя, эмацыянальныя, да болю шчымлівыя. У іх не знойдзеш нейкіх звышвыяўленчых сродкаў, надуманай філасофіі. Яны дыхаюць натуральна, як само жыццё.

Ёсць вершы, пабудаваныя літаральна на адной паэтычнай дэталі. Адзін з такіх — "У роднай хаце". Усе мы ў дзяцінстве хацелі хутчэй вырасці. Вось і цягнуліся да той запаветнай рыскі на вушаку, накрэсленай матулінай рукой.

Даўно я госць у мілай роднай хаце,
І колькі б і калі б я не гасціў,
Паснедаўшы, з усмешкай просіць маці
Да вушака старога падысці.
І срэбрынку заўважыўшы на скронях,
Пагладзіць рыскі даўніх тых часоў.
А я цалую рыскі на далонях,
Тулюся да бялюткіх валасоў.

Вершы, прысвечаныя маці, бацьку, які не вярнуўся з вайны, жонцы, сыну, родзічам, грэюць асаблівай цеплынёй, бо тут усё блізкае аўтару, выверанае жыццём: "У пары век твой быў кароткі. І да сваіх апошніх дзён, як аднакрылая лябёдка, чакала, — можа прыйдзе ён..." ("Матулі").

Другі раздзел зборніка склалі гумарыстычныя вершы. Іх, праўда, у чатыры разы менш, як лірычных. Усе яны з добрай доляй смеху, крытычнай "солі", вострай назіральнасці.

— Ну як, дзядок, табе адно акно?
— Яго я, дзеткі, адшукаў даўно.
Вось у дзвярах ніяк не разбяруся.
Мо, у дзесятых што-небудзь даб'юся!

Арган — асаблівы, сур'ёзны музычны інструмент. Назваўшы так свой пакуль адзіны зборнік, Вацлаў Хадасевіч самавіта заявіў пра сябе, сказаўшы тым самым: сапраўдныя паэты і праз шмат гадоў маўчання, як тая рунь у полі, прабіваюцца да чытача.

Свой новы дзень лічу сваім пачаткам,
Бо не зрабіў я кроку па жыцці
Без мары — хай малюсенькім зярняткам —
На роднай Беларусі прарасці.

Яўген ХВАЛЕЙ

Кніжная паліца

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга для дзяцей **Міколы ЧАРНЯЎСКАГА** *"Сонечны кошык"* (вершы, казкі, прымаўлянкі-забаўлянкі, скорагаворкі, лічылкі, загадкі). Як пазначана ў анатацыі, *"у кнізе маленькія чытачы сустрэнуцца з вясёлымі і сур'ёзнымі, удачлівымі і не вельмі хлопчыкамі і дзяўчынкамі — героямі гумарыстычных вершаў; спазнаюць радасць хараства, што дораць нам сустрэчы з роднай прыродай; пабываюць у дзівосным свеце казак."*

У Гомелі выйшаў зборнічак кароткай прозы **Ганны АТРОШЧАНКІ** *"Ветрагон"*. Як пазначана ў анатацыі, *"у выданні змешчаны апавяданні, замалёўкі, абразкі і караделькі. Тэксты вылучаюцца шчырасцю, цікавымі народнымі прыказкамі, прымаўкамі, вобразамі, а таксама сакавітай мовай ды разнастайнай тэматыкай"*.

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" выдала шыкоўную кнігу-альбом **"Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны"**. Гэта найбольш поўная беларускамоўная навуковая манаграфія пра знакамітага сына Палесся, выдатнага майстра алоўка, вядомага кампазітара і піяніста Напалеона Орду (1807—1883), напісаная **Леанідам НЕСЦЕРЧУКОМ.** Аўтар сабраў і апрацаваў амаль поўную бібліяграфію пра Н. Орду, якая налічвае больш як 500 друкаваных прац айчынных і замежных даследчыкаў. У кнізе змешчана 238 ордаўскіх выяў беларускіх гістарычных аб'ектаў і краявідаў, а таксама 98 малюнкаў, выкананых за мяжой і ў памежных з Беларуссю рэгіёнах. Кніга выдадзеная за сродкі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, а таксама дзякуючы падтрымцы Міністэрства інфармацыі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў ды іншых арганізацый...



У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга **Васіля БЫКАВА** *"Знак бяды. Ваўчыная яма"* (серыя "Школьная бібліятэка"). Прадмову напісаў вядомы крытык і літаратуразнаўца Міхась Тычына. У кнігу ўвайшлі дзве аднайменныя аповесці, што характарызуюць новы этап у творчасці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава (1924—2003).

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга **Андрэя МАКАЁНКА** *"Зацюканы апостал"* (серыя "Школьная бібліятэка"). Прадмову напісаў вядомы тэатральны крытык Анатоль Сабалеўскі. У кнігу народнага пісьменніка Беларусі Андрэя Макаёнка (1920—1982) увайшлі п'есы "Выбачайце, калі ласка", "Зацюканы апостал", "Трыбунал", "Святая прастата" і "Пагарэльцы".

Васіль МАКАРЭВІЧ

Днямі адзначыў свой 70-гадовы юбілей вядомы беларускі паэт і журналіст Васіль Макарэвіч. "ЛіМ" шчыра віншуе свайго пастаяннага аўтара са значнай жыццёвай падзеяй, жадае яму моцнага здароўя і новых творчых дасягненняў.

Паверхі лесу

Панельны наш дом,
Як над бухтаю верф,
Дзе так, як у лазні, у турботах я паруся.
Абжыў, дзякуй Богу, свой шосты паверх.
На ім і плыву ў вякі,
Як пад парусам.

Мой шосты паверх!
Гэта — ўсе шэсцьдзясят,
Што канулі недзе ў завейным куродыме.
З паднеб'я зляцелі яны, як дэсант,
Усцяж кірзачамі загоны
Скародзілі.

Не ведаю, быў
Ці не быў бузацёр,
Атруту ў пітво мне бяда ці падмешвала.
Ды сцены ў пад'ездзе стагоддзя абцёр,
І выбіў шчарбіны на ганку
Падэшвамі.

За мною сачыў
З-за шашы блізкі лес,
Дзе голле рыпела зімой, як уключыны.
Пакуль я па лесвіцы гробся ды лез,
Што д'яблам умела ў нябёсы
Укручана.

З паставы, відно,
Дзесь з гадамі зблажэў,
Ды ногі пакуль, як чужыя, не соўгаю.
І з кожнай прыступкай бліжэй і бліжэй
Цяпер да паверха чарговага,
Сёмага.

Наваляцца 70,
Што мне рабіць?
Як азбуку зор расчытаць мне, дальтоніку?
Мо боты-грамы ў пух на танцах разбіць?
Альбо аж на Марс мне закінуць
Антонаўку?

Гады, нібы зрок,
Я праз век берагу,
Хаця яны браліся часам выгарамі.
Я змог бы і пушчу сагнуць у дугу,
Падужацца нават з самой
Ніягараю.

Жалейку паслухаць
Больш рад, чым зурну,
А быў зачаравана калісьці валторнаю.
На сёмы паверх я гадоў зазірну, —
Што дзеецца там, на яго
Акваторыі?

Век пырскае скрозь
Аўтазваркай, як верф,
І ледзьве не слепне, каметай апалены.
Мне трэба ўзабрацца на сёмы паверх,
Ды плыць цераз штормы,
Нібыта на палубе...

Праспект

Хоць прачынацца
Час даўно прыспеў
І плугам дня вярнуць турбот аблогу.
Як у бярлогу ён ляжыць, праспект,
Ажно да Уручча выцягнуўшы
Ногі.

Дождж ноччу
Перайшоў яго брады.
Пасля стагналі салаўі, як барды.
Кусты каля яго — у два рады —
Як два шнуры шыкоўных
Бакенбардаў.

І дзве бензапілы,
Як дзве сястры,
Што ўмеюць шахаць
абалонь і стрыжань,
Стрыгуць-чыкрыжаць патлы,
як майстры,
Каб ён, праспект, быў, нібы князь,
Падстрыжан.

Да цырка мчыць,
З дамоў нідзе не кпіць.
На "стометроўку" ён бярэ раўненне,
Дзе можна прыгажуню падхапіць,
Дамоў прыйсці да жонкі,
Як з раненнем...

Ад смогу
Тут патрэбен супрацьгаз,
Інакшай прападзеш, як самазванец.
Ірвецца Вечнага агню фугас, —
Здаецца, дол разверне
І разваліць.

І плошча, бач,
Круглее, бы кулон,
Што ліпы цесным гуртам паланілі.
Нашто яму трайны адэкалон, —
З вусамі йдуць машыны
Паліўныя!

Падправіць чуб, —
Цяпер ва ўсім — ажур! —
Хоць і не быў ніколі задавака...
Калі б устаў на ногі, прыгажун,
То галавой дастаў бы
Задыяк ён.

Пра бульбу

Дні ягад сышлі,
Больш не знойдзеш грыбоў.
І хоць яшчэ восень аскоміну трушчыць,
Ты бульбачку-бульбу, нібы з пагрэбоў,
Цягай з Камароўкі, ад цёткі
Хітрушчай!

Як глупства табе
Хтосьці б хітра не плёў,
Ці штопай плявузгаў
адпеты адсотак, —
У вёсцы жылі не з калгасных палёў,
А спрэс з прысядзібных гародаў
І сотак.

Суш Волгу гняла,
Дон душыў недарод,
Зямлю галадуха наўсцяж дратавала.
Людзей не калгасны загон з году ў год,
А соткі ад голаду скрозь
Ратавалі...

Далёка яшчэ
Да зімы і каляд,
А бульбу грабеш
у былых канкурэнтаў.
Хоць танчыць даўно
ля яе спекулянт,
З заезджай цаной і каўказскаю
Рэнтай.

Мне бульбінка
Ў бульбіну трэба даўно,
Як рыфма крамяная ды карнявая!
А лезе з адменнай мне ў кош заадно,
Хоць ростам з гарбуз, а на смак —
Кармавая!

Прывыклі здаўна
Гнаць патокам кармы,
І добра, як хтосьці дабро прыпільнуе.
А бульбачку план гнаў да самай зімы
Паўсюль для блізіру,
І — напрапалую!

Бядоты ідуць
Ды паўзуць па крывой,
Няшчасце ў жарстве і пяску караніцца.
Былі мы прывучаны ўсе кармавой
І з году у год, чым папала
Карміцца.

Хітрун-кантралёр,
Ты дурноту спыні,
У сварку не лезь, не пытаючы броду!
Лепш шчодра ты ў кузава шухні-сыпні
Разварыстай бульбы ад пана
Гарода!

Як мне ні хвалі
Самы лепшы калгас,
Хачу я насуперак чуткам усё-ткі,
Не меней прычэпа узяць празапас
З усёй Камароўкі гародныя
Соткі!

Паэты

Ю. Сапажкову

Адзін калупаецца
Ў градах няўдачнікам,
Травінку сарве ды варон зноў пасе.
З расадай упоравень,
з пеўнікам-дачнікам, —
Нашто яму дзёрзкасць ды зорны
Пасеў?!

Другі — там, дзе зоры
Жамчужацца кучамі,
Ды густа калдобяцца зрэнкамі сот,
Шлях Млечны упарта матыкай акучвае,
Ды ў вечных сузор'ях карчуе
Асот!

Творцы

Арудуюць, як сярод вулляў пасекі,
Маўляў, сплаціце ім хутчэй аброк!
Той у прарокі рвецца, гэты — ў класікі,
Вянок лаўровы ссунуўшы набок.

Агледзьце і сталы іх, і запазуху,—
Каб край у зман не увялі знарок.
Ці знойдзецца падчас няшчаднай засухі
Ў іх жыватворны хоць адзін радок?

* * *

Я дрэва пасадзіў,
Пра сына не забыў.
І ўсё, што трэба мець,
даўно у хаце маецца.
Адно ў жыцці змяю
пакуль што не забіў, —
Чамусьці на яе рука
Не падымаецца?

* * *

Як цыркулем,
Прыкмет абведзен круг.
Не знаеш — шкадаваць а ці злавацца
Руку пры стрэчы моцна цісне друг,
Пішчом Іуда лезе
Цалавацца.

* * *

Шчыгляняты ў кроне: — Чок ды чок!
Цягне знекуль пальнамі пахкімі.
А ў грудзях малы рухавічок,
Дзякуй Богу, не маўчыць, а тахкае.

Варту ветру голле разгайдаць,
Шкло ў акне звініць і ціха дзынкае.
Колькі год над светам адбіваць
Метраному, дзён маіх гадзінніку?

Маятнік, хоць і не мае крыл,
У захмар'і з дзіўнаю акустыкай,
Размахнецца ўладна да Курыл
І ля Белавежы дзесь апусціцца.

Сонца ў небе — залатым руном.
Кружыцца лісцё, спадае чэкамі.
А ў грудзях гадзіннік-метраном,
Дзякуй Богу, тахкае і чэкае.

Фота Уладзіслава Басько

Зоя КАЛКОЎСКАЯ

* * *

Штосьці
стала
з пачуццямі:
іх нібыта
ў цёмнай каморы замкнулі —
і страляюць,
проста ў сэрца цаляюць
чорнай
немачы
кулі.

* * *

Усміхнулася
мне
Вольніца,
а гайня
за думкай
гоніцца,
прыручыць
мяне
стараецца —
толькі
марна
намагаецца,
бо я чую
голас
Вольніцы,
што не хоча
быць
палоннiцай.

* * *

Паэзія не любіць мітусні,
яна расце у нетрах адзіноты
і жывіцца пялёсткамі самоты,
і гіне ад ліпучасці хлусні.
Яна сілкуе радасць, прыгажосць,
ляціць на крылах чуйнай цішыні
і выцірае слёзы дабрыні...
Паэзія, ты — мой жаданы госць.

* * *

Каб непамысна
было
нават
марыць,
у стомы
сіло
нас
заганяе
старасць.

* * *

Паміж намі
часу рака
глыбокая,
паміж намі
болю гара
высокая,
паміж намі
бясконцасці
тлум —
сумётамі.
І не вылечыць
стоены сум
работаю.

* * *

Не ўтрымаеш вецер
у абдымках суму,
вырвецца на волю —
у вэрхал паляціць.
Не спаткаеш шчасце,
калі песціш стому.
І не ўдасца крыўдай
роспач залячыць.

Абразкі

Валянціна КАДЗЕТАВА

Усё часцей хочацца схавацца ад рэчаіснасці ў былое, на самае донца лёсу, усё часцей зазіраю ў скарбніцу памяці і, выбіраючы з россыпу ўспамінаў самыя першыя, самыя яркія, пачынаю цярпліва складаць немудрагелістую, але дарагую мне мазаіку, мазаіку свайго жыцця.

Рыбін тлушч

Мой двухгадовы брацік з крывымі ад рахіту ножкамі толькі-толькі пачынае хадзіць, асцярожна пасоўваючы перад сабой лёгкае лазовае крэсла. Я адбіраю крэсла і, калі брат з плачам падае, бягу да маці, каб паведаміць ёй, што "ў Васі зноў аднялися ногі". Мая жорсткасць да хворага брата тлумачыцца вельмі проста: я спадзяюся, што маці адразу ж дастане з паліцы бутэлечку з жоўтай масляністай вадкасцю і налье Васю поўную лыжку "вельмі пальзіцельных вітамінаў" — рыбінага тлушчу. А чым болей яго спажыве мой брат, тым меней застанецца мне. А там — пакуль яшчэ маці выберацца за сем кіламетраў у Церахоўку ў аптэку...

Ах, гэты ненавісны рыбін тлушч, смак якога вядомы бадай што ўсім дзецям, народжаным праз некалькі гадоў пасля вайны! Мы ўспрымалі яго як пакаранне, нават гразіліся адно аднаму: "Вось скажу маме, каб дала табе рыбінага тлушчу!" Во, каб нам тады ды сённяшняй заморскай садавіны! Дзе там: яблык і то рэдка на стале бачылі, бо за кожную яблыню трэба было плаціць падатак, і садоў садзілі вельмі мала.

Цяпер рыбін тлушч выпускаюць у капсулах — праглынеш і не адчуеш смаку. А мне раптам нясцерпна захацелася адчуць той паўзабыты смак (а мо не такі ўжо ён і брыдкі?) і я расціснула зубамі гладзенькую пругкую бубачку... Не, ўжо калі мне яшчэ раз захочацца ўваскрасіць якое-небудзь адчуванне са свайго дзяцінства, то лепей я лізну спакуслівую сваёй цукровай белізною заінелую металічную клямку.

Не будзь выскачкаю

Першае верасня тысяча дзевяцьсот пяцьдзесят сёмага года. У маіх сяброўак свята. Нэля і Мальвіна сталі першакласніцамі. Надзя з Раяй пайшлі ў другі клас. Мяне ж зноў, як і ў мінулым годзе, адправілі дадому. Дарэмна я імкнулася паказаць настаўніку сшытак з уласнаручна напісанымі літарамі і словамі, дарэмна ўпрошвала паслухаць, як добра я чытаю і лічу. У адказ зноў пачула няўмольнае : "Не паложана! Споўніцца сем гадоў, тады прыходзь".

Да сямігадовага ўзросту я перачытала ўсю хатнюю бібліятэку, навучылася лічыць да тысячы і склала свой першы ў жыцці верш! Пра што? А пра тое, як дзяўчына і хлопец пакахалі адно аднаго і сталі "ля зялёнага дуба гуляць". Ну а ў школе, куды мяне нарэшце ўзялі, я павінна была пісаць палачкі-кручочкі, чытаць склады і лічыць карабкі з-пад запалак, якія Іван Емяльянавіч — так зваўся першы мой настаўнік — ставіў на верхнюю бакавіну дошкі і якія чамусьці ўвесь час падалі.

"Нейкая дзіўная ў вас дзяўчынка, — гаварыў настаўнік маім бацькам пры сустрэчы, — правільна адказвае на ўсе пытанні, а потым садзіцца за парту і плача". А плакала я ад крыўды, што мушу займацца такой легкатою ў той час як Нэля з Мальвінаю рашаюць задачы ў некалькі пытанняў, а Рая і Надзя нават пішуць сачыненні.

Аднойчы я набралася смеласці і папрасіла Івана Емяльянавіча, каб ён даў мне што-небудзь іншае. "Непрыгожа быць выскачкаю. — адказаў настаўнік. — Рабі тое, што робяць усе".

Відаць, мода на дыферэнцыраванае навучанне тады яшчэ не падышла.

Дар красамоўства

У маёй школьнай сяброўкі Марыны дар красамоўства — прыроджаны. Яна змалку лёгка ўмела пераконваць кожнага з нас у чым заўгодна, нават у тым, напрыклад, што ўмее "па вясёлцы, якая пасля дажджу бывае, лазіць на неба".

Улетку, перад тым, як я павінна была пайсці, здаецца, у трэці клас, бацькі купілі мне партфель. На тыя часы гэта было раскошай (падручнікі звычайна насілі ў торбачцы аба проста звязвалі вяровачкай — шпагацінаю), і партфеляў мелася пяць — шэсць на ўсю пачатковую Мікалаеўскую школу. А такога, як у мяне — ярка-аранжавага, з бліскучымі спражкамі і ажно з трыма аддзяленнямі, не было нават у настаўніцкай дачкі Алы. Я ледзьве дачакалася пачатку навучальнага года — так моцна хацелася пахваліцца цудоўным набыткам. І вось нарэшце важна крочу ў школу, раз-пораз пазіраючы на свой шыкоўны партфель.

"Ой, задавака! — усклікнула Марына, убачыўшы мяне. — Партфель у яе! Ну і што з таго? Хіба відаць, што там ляжыць у тваім партфелі? Можа, увогуле нічога. Вяровачка ж, — яна ўзняла руку са звязкай кніжак, — зусім іншая справа. Вось падручнікі, вось сшыткі, а вось дзённік — адразу ясна, што вучаніца ідзе, а не хто-небудзь. Да таго ж несці лёгка".

Марына так ярка распісвала перавагі сваёй вяровачкі перад маім партфелем, так лоўка завязвала-развязвала стосік кніг, што нядаўні мой гонар саступіў месца пякучай зайздрасці да Марыны з яе вяровачкай, і я не сказала, а выдыхнула: "Давай мяняцца: я табе — партфель, ты мне — вяровачку". Марына на нейкае імгненне зрабіла выгляд, што вагаецца, а потым махнула рукой: "А, хай ужо! Давай!.."

Дакладна не памятаю, як сустрэла мяне маці, калі я вярнулася дадому пасля гэткага абмену. Памятаю толькі, што неўзабаве я, сціскаючы ў руцэ тую вяровачку, марудна сунулася па вуліцы ў бок Марынінай хаты, а ўслед мне неслася матчына пагрозлівае: "...інакш зусім не прыходзь! І на парог не пушчу!"

Прайшло шмат гадоў. Не ведаю, ці ўспамінае Марына пра гэты выпадак. Яна цяпер прадпрымальніца, прычым, даволі паспяховая. Можа, гэтаму крышачку паспрыяў і той самы яе прыроджаны дар?..

І ўсё з-за морквы...

У той дзень нас пяцярых — мяне, Таню Б., Васіля К., Шуру К. і Колю Ш. — настаўнік матэматыкі гадзіны дзве пратрымаў пасля ўрокаў. Мы страшэнна прагаладаліся, а да нашай Мікалаеўкі ад Нівак, куды мы прыйшлі вучыцца пасля чацвёртага класа, трэба было тэпаць кіламетры чатыры. І вось хлопцы, вырашыўшы перад дарогаю падсілкавацца, залезлі ў школьны агарод і нарвалі там ладны пук морквы. Але пачаставацца ёю нам не давялося. Не паспелі мы выйсці за вароты, як да нас падбегла раз'юшаная настаўніца Н. М.. Аказалася, што градка, на якой пагаспадарылі нашы хлопцы, была не школьная, як мы ўсе думалі, а належала той самай Н. М.. Уладальніца градкі загнала нас у калідор і з крыкам: "Жарыце, сволачы!" пачала тыцкаць нам у твары толькі што вырванай морквай. Было крыўдна і балюча. Мы з Таняй плакалі. Хлопцы стараліся трымацца, хоць вусны ў іх па-здрадніцку дрыжалі. Нарэшце Н. М. накрычалася, сабрала рассыпаную па падлозе моркву і, заляпіўшы кожнаму з трох хлопцаў поўху, сышла. Мы, прыніжаныя, з бруднымі тварамі і пачырванелымі вачыма, пазбягаючы глядзець адно на аднае, моўчкі пасунуліся на вуліцу.

За вёскаю, перад ніўскім лесам, праз які мы заўжды хадзілі дадому і ў якім я вельмі любіла збіраць грыбы, Таня раптам прыпынілася: "Пачакайце, я вось нешта паспела схаваць. Давайце з'ядзім". Яна пакорпалася ў партфелі і дастала некалькі морквін. Мы аслупянелі. Усе чацвёра. Першы нечакана апамятаўся Васіль К., якога з-за непаваротлівасці і празмернай маўклівасці ўсе ў нашым шостым "А" лічылі тупаватым: "Ты гэта... сама еж". "Калі можаш", — дадаў Шура К. і грэбліва скрывіўся. А я? Я, заўжды такая гаварлівая, не магла вымавіць ні слова — так нясцерпна сорамна мне было за Таню. Відаць, праўду кажуць, што няма большага сораму, чым сорам за іншага, асабліва блізкага табе чалавека. Таня ж, здавалася, нічога не заўважала: "Я не прожар які, каб адной есці. Бярыце". Тут я не стрымалася, выхапіла моркву і закінула яе ў кусты ажыны, якія раслі пры дарозе.

Я ўзненавідзела Н. М. І прадмет, які яна выкладала.

Я перастала сябраваць з Таняй.

Я больш ніколі (нават у самую грыбную восень) не хаджу ў ніўскі лес.

І ўсё з-за той злашчаснай морквы...

Хай застаецца таямніцай

Вёска, дзе я нарадзілася, знаходзіцца на мяжы трох рэспублік, таму з вуснаў яе жыхароў можна пачуць і ўкраінскае "шчо", і рускае "почему", і наша пракавечнае звонкае "дзе". Але з тых жа вуснаў пачуеце вы словы і выразы, якіх нідзе, акрамя як тут, не сустрэнеце, бо за імі — свая, адзіна непаўторная гісторыя маёй роднай Мікалаеўкі.

З маленства ведала, што "чытаць памачніцу" азначае "гаварыць абы-што, бязглуздзіцу", што "другая Лукешта" значыць "жанчына-п'яніца", што "як у Нігрэя ў двары" — гэта "брудна, неахайна", а "твар як у Іцкі" — "вельмі круглы і поўны", а вось пра паходжанне гэтых, так бы мовіць, абсалютна мікалаеўскіх фразеалагізмаў мне зусім нядаўна расказала мая дзевяностагадовая цётка (дзякаваць Богу, у яе да гэтай пары ясны розум і добрая памяць). А вось тое, чаму ў Мікалаеўцы так дзіўна часам звяртаюцца адно да аднаго людзі сталага ўзросту, мне не мог растлумачыць ніхто, і я паспрабавала зрабіць гэта сама.

Справа ў тым, што слова "пані" тут даўно страціла сваё колішняе значэнне ды і сэнс увогуле і ператварылася ў прыстаўку як да жаночых, так і да мужчынскіх імёнаў, таму ў Мікалаеўцы гавораць: "Паніваля", "Панівольга", "Паніліда", "Паніколя", "Паніміша" і "Паніхвядос".

Вельмі цікава называюцца ў нас многія кветкі. Ішла нядаўна праз поле, дзе цвілі рамонкі, і нечакана выплыла з памяці: "тарэлачкі". І я з настальгічнай пяшчотаю вымавіла гэтае слова ўслых. "Тарэлачкі" — так называлі на маёй малой радзіме рамонкі. Суржына... Сонікі... Чарнабрыўцы... Барынькі... І — моўны цуд! — дзын-зоркі... Цяпер я ведаю, як па-сапраўднаму, па-навуковаму, называюцца амаль усе гэтыя кветкі. Суржына — чырвоная вяргіня. Сонікі (ці сонейкі) — разнавіднасць вяргіні жоўтай, не "элітнай". Чарнабрыўцы — аксаміткі. Дзын-зоркі... не, я не хачу, каб моўны цуд знік, хай дзын-зоркі застаюцца дзын-зоркамі, маленькай таямніцаю майго дзяцінства!

Пажартавала...

Мне пашчасціла вучыцца ў Мінскім дзяржаўным педінстытуце (тады ён насіў імя Максіма Горкага). У нас на філфаку выкладалі такія вядомыя вучоныя, як Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі, Міхась Арсенцьевіч Лазарук, Іосіф Мартынавіч Гайдукевіч.

Менавіта на экзамене ў Іосіфа Мартынавіча здарылася тое, што я без смеху не магу ўспамінаць і цяпер, праз шмат гадоў.

Наш курс здаваў Іосіфу Мартынавічу стараславянскую мову. Чацвёра з групы: я, яшчэ дзве дзяўчыны і адзін хлопец, Толя Ш. Ужо ўзялі білеты і, сеўшы за сталы, рыхтаваліся да адказу. Раптам Ш., які сядзеў ззаду, крануў мяне за плячо: "Валя, а як імя па бацьку нашага экзаменатара?". Я, падумаўшы, што Ш., які нядаўна пачаў заляцацца да мяне, проста "прыколваецца", сярдзітым шэптам (знайшоў час!) адказала: "Іосіф Дыфтонгавіч". Але Ш., як я ў наступную ж хвіліну зразумела, не збіраўся "прыкалвацца". Ён устаў з-за стала і звярнуўся да выкладчыка: "Іосіф Дыфтонгавіч, дазвольце спытацца?". "Іосіф Дыфтонгавіч" узняў галаву, і мы зніякавелі: твар нашага заўжды непарушна спакойнага, ураўнаважанага настаўніка палаў гневам: "І вы мелі нахабства прыйсці на экзамен, не ведаючы нават, што такое дыфтонг і як імя выкладчыка, да якога цэлы семестр хадзілі на лекцыі?! Зараз жа пакладзіце білет! Вывучыце, як след, тады прыходзьце".

Ш. пераздаваў стараславянскую мову разы чатыры.

Ён не толькі перастаў заляцацца да мяне, а і ўвогуле з таго часу на дых мяне не пераносіў. Не ведаю, можа не трэба было так жартаваць?..

Як я была «кемлівым хлопчыкам»

У школьныя гады маёй любімай радыёперадачай была перадача "Жывое слова". Вёў яе вядомы пісьменнік Уладзімір Юрэвіч. Перадача была цікавая і змястоўная, да таго ж мне вельмі падабаўся голас вядучага, мяккі і добразычлівы.

Я стала дарослай, а потым, як ні сумна ў тым прызнавацца, не зусім маладой, а голас Уладзіміра Юрэвіча па-ранейшаму гучаў у эфіры. Слухаючы гэты па-ранейшаму прыемны голас, я заўжды ўспамінала крыху смешнаваты выпадак, які адбыўся, калі я вучылася ці то ў пятым, ці то ў шостым класе.

Аднойчы заўважыла, што магу лёгка выканаць многія заданні, якія прапаноўвае "Жывае слова" і таму вырашыла даслаць у рэдакцыю ліст. Памятаю, што заданні былі такія: адгадаць загадку, даць азначэнне паронімам і скласці з імі сказы. Я вельмі хвалявалася і перш чым пакласці ліст у канверт і аднесці на пошту, мо разоў дзесяць перачытала яго. Ды і як было не хвалявацца: да мяне ніхто з нашай ніўскай васьмігодкі не адважваўся даслаць лісты на такі важны адрас.

З якім нецярпеннем чакала я наступнай перадачы! Ці дайшоў мой ліст? Ці правільна адказала на пытанні? І вось нарэшце доўгачаканае: "У эфіры радыёклуб "Жывае слова". Я ўключыла гук на ўсю моц.

"А вось нашу загадку не адгадаў ніхто, — прамовіў вядучы і тут жа нібыта спахапіўся: — Не, вось Валянцін Кадзетаў з вёскі Мікалаеўка піша, што гэта шашкі. Малайчына Валянцін, кемлівы, відаць, хлопчык. І сказы ён склаў цікавыя".

Мне зрабілася горача. З аднаго боку, было радасна, што мяне пахвалілі ды не дзе-небудзь, а на радыё, з другога боку... Ну, які ж я хлопчык? Я ўявіла сабе, як з мяне будуць смяяцца ў школе і ледзьве не заплакала з прыкрасці.

Ведаеце, ніхто не смяяўся! Можа, таму што для вёскі гэта была падзея — пачуць прозвішча знаёмага чалавека па радыё? Мяне віншавалі і аднакласнікі, і настаўнікі, і суседзі!

Няма ўжо з намі Уладзіміра Юрэвіча. І перадачы, раўназначнай "Жывому слову", няма. На жаль. На вялікі жаль!

Бадай, самае яскравае вынаходства XX стагоддзя ў сферы музычна- тэатральнага мастацтва з лёгкай рукі брадвейскіх прадзюсераў, якія прагнулі здзівіць гледачоў незвычайнай прыгажосцю даўганогіх танцоўшчыц ды спявачак з пэўнымі здольнасцямі драматычнай ігры, атрымала і замацавала ў галовах мільёнаў прыхільнікаў сваё ўласнае імя: МЮЗІКЛ. Яго шырокае распаўсюджванне пачалося з Амерыкі, затым па заходнееўрапейскіх краінах і далей па свеце. Апошнім часам гэтае гучнае слова можна сустрэць на афішах нашых музычных, драматычных, маладзёжных і нават дзіцячых тэатральных калектываў — ад прафесійных устаноў са статусам "Нацыянальны" да аматарскіх гурткоў. Каб неяк вызначыцца з тэрміналагічнай блытанінай ды паразважаць пра мэтазгоднасць стварэння на беларускай сцэне тэатральных праектаў такога папулярнага сёння кірунку (ці, можа, жанру), а таксама пра мажлівыя шляхі яго развіцця з улікам нацыянальных традыцый, я пацікавіўся думкамі самых уплывовых, на мой погляд, асоб у сферы практычнай рэалізацыі такіх праектаў. Гэта непасрэдныя ўдзельнікі працэсу стварэння большасці з наяўных сёння на беларускай сцэне мюзіклаў — дырэктар і мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра заслужаны артыст краіны Аляксей ІСАЕЎ і вядомы беларускі кампазітар, прадзюсер, аўтар мюзіклаў "Джулія", "Шклянка вады", "Афрыка", "Байкер" ды іншых Уладзімір КАНДРУСЕВІЧ.

Беларускі мюзікл: «за» і «супраць»

Пра тэорыю і гісторыю

— Дык што ж гэта за з'ява ў сучасным музычна-тэатральным мастацтве — мюзікл — і якім чынам вызначаць прыналежнасць да яго таго ці іншага музычнага спектакля?

Аляксей Ісаеў. На мой погляд, мюзікл — гэта, у першую чаргу, яркае шоу. У пэўнай ступені ён выйшаў з аперэты, і кожная з класічных венскіх аперэт можа быць прадстаўлена ў сучаснай "мюзіклавай" вопратцы. Багатая насычаная музычная структура лепшых твораў Штраўса, Легара, Кальмана дазваляе бясконца эксперыментаваць і ствараць сапраўдныя шоу. Па гэтым шляху можна пайсці яшчэ далей і "асучасніць" Рахманінава, Чайкоўскага, Вердзі..., бо невядома, якой з версій аддасць перавагу сённяшні слухач. Як прыклад магу прывесці вельмі папулярную перапрацоўку тэмы Барадзіна "Улетай на крыльях ветра" (хор з оперы А. Барадзіна "Князь Ігар". — **Рэд.**), якую слухаюць мільёны, і толькі малая частка з іх пойдзе на традыцыйную пастаноўку "Князя Ігара". Дарэчы, днямі зноў слухаў апошнюю інтэрпрэтацыю арыі містэра Ікс у выкананні Рэната Ібрагімава. Зусім іншае гучанне аркестра, іншыя інтанацыі ў вакале. Атрымаўся святочны канцэртны нумар мюзіклавага кшталту. Ідучы такім шляхам, можна зрабіць вельмі "смачна" і прыцягнуць новага гледача. Далучыць яго да ўзораў высокай музычнай культуры, хай нават праз іх "асучасніванне".

Уладзімір Кандрусевіч. Сучасны жанр вымагае сучаснай падачы. Іншы голас, іншая манера спеваў, індывідуальны тэмбр, фарбы. У нас вакалістам напачатку ставяць ніжнія ноты, затым "выцягваюць" верхнія, а сярэдзіну зусім пакідаюць. У мюзіклах, наадварот, да яе асаблівая ўвага. Тут зусім неабавязкова валодаць супервакальнымі здольнасцямі. Можна "размяць", прыстасаваць сярэдні голас і развіць яго адметнасці. Зрабіць больш яркім, афарбаваць, узмацніць. Наогул, патрэбна іншая акцёрская школа, без усялякага ўваходжання ў вобраз, без пераўвасаблення і перажыванняў. Падача і дэманстрацыя сябе, лепшых сваіх якасцей. Галоўнае — больш індывідуальнасці. Патрэбна пластыка — якой у нас няма. Згадаем хаця б такі факт. Славуты Міхаіл Барышнікаў, пераехаўшы ў ЗША, вучыўся, як звычайны пачатковец, новай пластыцы разам са спявачкай Лайзай Мінэлі.

— Давайце паспрабуем з другога боку падысці да праблемы і назавём тыя вядомыя пастаноўкі, якія маглі б служыць пэўным узорам сапраўднага мюзікла.

А. І. У маіх руках энцыклапедычны даведнік "Сусветныя мюзіклы", дзе вельмі шырока прадстаўлены пастаноўкі розных часоў і краін. Аўтары выдання, відаць, карысталіся дэвізам: "Усё тое, што не опера, аперэта ды балет, і ёсць мюзікл". Дзесяткі гучных назваў і імёнаў. Сюды патрапіла чамусьці "Вясёлая ўдава"(1905 г.) і, зразумела, такія агульнапрызнаныя творы, як "Аклахома", "Валасы", "Кошкі", "Ісус Хрыстос — суперзорка", "Скрыпач на даху", "Прывід оперы", "Чыкага", "Кабарэ", "Поргі ды Бес" і яшчэ сотні іншых. Такім чынам робіцца відавочным, што на сённяшні дзень сам тэрмін "мюзікл" трактуецца вельмі шырока. Ён быццам бы страціў свае берагі. І ў той жа момант сучасныя пастаноўшчыкі ды прадзюсеры ў мэтах рэкламы сваіх твораў карыстаюцца павышанай цікавасцю гледачоў да гэтага жанру і атрымліваюць адпаведныя фінансавыя дывідэнды. У 20 — 30 гады мінулага стагоддзя, калі жанр толькі нараджаўся, яго стваральнікі адбіралі ўсё самае новае, прагрэсіўнае. А каб неяк выйсці з абмежаваных рознымі канонамі класічных форм, увялі ва ўжытак гэты тэрмін. На мой погляд, тэрміналогія — гэта справа кампазітараў, лібрэтыстаў, мастацтвазнаўцаў. Я галасую за новыя назвы для новых форм музычных спектакляў.

У. К. Мяне больш вабіць еўрапейская мадэль мюзікла. Прыкладам, "Notre Dame de Paris" альбо "Romeo & Juliet" з моцнай драматургіяй, з асэнсаваннем падзей. А брадвейскія пастаноўкі кшталту "Mama mia" скіраваныя на пацеху публікі. Тут галоўнае — бляск, мітусня, дарагія дэкарацыі, шыкоўныя касцюмы і дыяменты. Хаця, што і казаць, выглядае шоу вельмі прыгожа.

Пра мастацкія здабыткі і фінансавыя выдаткі

— Як вы асабіста вырашаеце: ці патрэбна выносіць на афішу слова "мюзікл"?

А. І. Можа, мы і памыліліся, калі назвалі "Рускі фантом" мюзіклам? Не ведаю. Але ж аўтары далі свайму твору яшчэ больш заблытаную фармулёўку — "мюзікл-фантасмагорыя". Быў яшчэ варыянт: пакінуць адну "фантасмагорыю", але ж такі падыход таксама вымагаў бы дадатковага тлумачэння для гледачоў.

— Сучасны брадвейскі мюзікл — гэта нават не дзесяткі, а сотні мільёнаў долараў укладанняў. Ці ёсць хаця б тэарэтычная магчымасць у такога праекта акупіцца ў невялікай краіне?

У. К. Мой адказ — катэгарычнае "не". Абавязковая дзяржаўная падтрымка. І ставіць трэба не на трупу рэпертуарнага тэатра, а ў антрэпрызе, з адпаведным падборам артыстаў. І, галоўнае, — са спробай запрасіць, альбо адшукаць сярод моладзі, сапраўдную зорку. Мы паставілі "Байкера" ўсяго на 6 выканаўцаў плюс 12 танцораў. У іх ліку — Іван Вабішчэвіч, якога адзначыла сама Ала Пугачова. Чым не зорка! Нават пры такім невялічкім складзе выканаўцаў нам спатрэбіўся магутны спонсар.

А. І. Мюзікл — гэта тэатралізаванае відовішча для вялізных канцэртных залаў з адпаведным тэхнічным абсталяваннем, дэкарацыямі, касцюмамі. А "якасны касцюм", умоўна кажучы, можна пашыць толькі з дарагой тканіны. Каб пашырыць сцэнічную прастору, мы закупілі самае лепшае праекцыйнае абсталяванне. Публіка павінна атрымліваць асалоду не толькі ад спеваў, музыкі і танцаў, але і візуальна. У тым жа "Рускім фантоме" з дапамогай медыйных сродкаў ствараюцца шматлікія эфекты, а перад кожнай мізансцэнай раскрываецца яе змест. Усё гэта вымагае значных фінансавых укладанняў.

Пра нацыянальную адметнасць

— Не першы год ідзе гаворка пра стварэнне беларускіх мюзіклаў. Чаму ж пастаноўшчыкі не хочуць звяртаць увагу на арыгінальныя творы нацыянальнай драматургіі, музыкі, харэаграфіі, выяўленчага мастацтва? Чаму не шукаем "Прарока" ў сваёй Айчыне?

А. І. Да нас апошнім часам звяртаюцца, у асноўным, лібрэтысты са сваімі ідэямі, сцэнарыямі, "накідамі". А тэатру патрэбны сапраўдны завершаны сцэнічны твор высокай прафесійнай якасці. Абавязкова з інтрыгуючым сюжэтам, якога прагне сённяшні глядач. Калі такі мюзікл у нашых творцаў з'явіцца, дык мы будзем толькі рады. Прыходзьце! Чакаем.

У. К. На маю думку, публіка пакуль не гатовая ўспрыняць нацыянальны мюзікл. Таму мы і бяром за сюжэтную аснову "раскручаны" твор. Традыцыі напрацоўваюцца гадамі, і павінна быць створана шмат розных мюзіклаў, каб нарэшце адзін "стрэліў". Спробу прачытання па-беларуску мы зрабілі ў спектаклі "Таямніца блакітных азёр", але драматургія не зусім адпавядала жанру. Затое сюжэт "Афрыкі" цалкам раскрыўся на такіх знакамітых нацыянальных сцэнах, як Купалаўская і Коласаўская. Былі і менш удалыя работы. Але я не страціў надзею, і ёсць планы і прапановы па стварэнні спектакля на нацыянальным гістарычным матэрыяле. Жыве ідэя ўславіць імёны вядомых асоб, якія адыгралі значную ролю ў гістарычным і культурным развіцці нацыі. Магчыма, гэта будзе аповед пра Соф'ю ды Ягайлу.

Ігар КУЗНЯЦОЎ

На здымках: дырэктар-мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра А. Ісаеў; кампазітар У. Кандрусевіч.

Фота аўтара

Не "расстаўляючы кропкі", якія ж высновы можна зрабіць наконт закранутай тэмы? У кожнай з прадстаўленых пазіцый ёсць рацыянальнае зерне і ёсць шмат чаго агульнага ў сэнсе ўспрымання мюзікла, у першую чаргу, як сучаснай формы музычнага тэатральнага дзейства з комплексам сродкаў выразнасці, што павінны адпавядаць сённяшнім запатрабаванням гледача, ці, прасцей кажучы, быць моднымі на дадзены момант. Гэта датычыць і самой музыкі, і яе аранжыроўкі, і манеры выканання вакальных партый, і рэжысуры, і харэаграфіі, і вобразнасці драматычнай акцёрскай ігры, і сцэнічнага афармлення, і тэхнічнай аснашчанасці. Названыя сродкі мусяць садзейнічаць раскрыццю тэмы і сюжэта, якія, у сваю чаргу, раскрываюцца пастаноўшчыкамі з улікам рэалій сучаснага жыцця, нават калі ў аснову пакладзены добра вядомыя класічныя музычныя ці літаратурныя творы. Што ж да "беларускасці" твора, дык не сакрэт: поспеху ў значнай ступені садзейнічае апора аўтараў на перажытае, на добра вядомае, на сваё, арыгінальнае бачанне адвечных сусветных праблем і пытанняў. Своеасаблівасцю мінулага і сучаснага жыцця цікавыя беларусы іншым народам. А тое, як нашы продкі адмыслова адаптавалі самыя "іншаземныя" формы розных відаў мастацтва, пераконваюць прыклады і з французскай кадрыляй, і з чэшскай полькай. Хіба ж гэта не шлях і для асіміляцыі амерыканскага мюзікла? Пажывём — пабачым.

Радуемся разам

З 12 па 17 ліпеня ў Пінску праходзяць гастролі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Адкрыліся яны ў гарадскім Доме культуры паказам "Пінскай шляхты" В. Дуніна-Марцінкевіча ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Мікалая Пінігіна. Зусім нядаўна гэты рэжысёр увасобіў на купалаўскай сцэне камедыю Ф. Вэбэра "Вячэра з прыдуркам", і яе прэм'ера таксама ўвайшла ў гастрольны рэпертуар. Апроч таго, купалаўцы прывезлі ў сталіцу Палесся "Памінальную малітву" Р. Горына, Купалаву

"Паўлінку", "Баладу пра каханне" (спектакль паводле "Альпійскай балады" В. Быкава, паказаны 14 ліпеня, у дзень, калі адзначалася 65-годдзе вызвалення Пінска ад гітлераўскай акупацыі). Сёння на сцэне Палескага драматычнага тэатра купалаўцы сыграюць "Вечар" А. Дударава — гэтым спектаклем завершыцца іх творчы візіт у Пінск.

Для калектыву Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы сёлетні чэрвень быў месяцам юбілеяў. 14-га тут віншавалі з 70-годдзем куміра публікі, народнага артыста Беларусі Арнольда Памазана. Больш як паўстагоддзя служыць ён першай драматычнай сцэне краіны, і сёння стварае тут разнапланавыя вобразы ў пастаноўках "Ідылія" В. Дуніна-Марцінкевіча, "Маэстра" М. Ладо, "Сымон-музыка" Якуба Коласа, "Паўлінка" Янкі Купалы, "Чычыкаў" паводле М. Гогаля, "Памінальная малітва" Р. Горына, "Вяселле" А. Чэхава... І заўсёды застаецца ў яго рэпертуары роля пана Быкоўскага, якую А. Памазан бліскуча прадстаўляў у славутай Купалавай "Паўлінцы" ўжо больш як тысячу разоў. Артыст і свой юбілей адзначыў у гэтай ролі.

Рэжысёра Аляксандра Гарцуева віншавалі з 50-годдзем. Прафесійны акцёр, ён стварыў на купалаўскай сцэне шэраг значных вобразаў, а ў рэжысуры ўпершыню паспрабаваў сябе на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, паставіўшы спектакль "Чорны квадрат". З часам А. Гарцуеў скончыў рэжысёрскае аддзяленне Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва. Яго пастаноўкі, ажыццёўленыя ў родным тэатры ("Крывавая Мэры", "Трыстан ды Ізольда", "Брат мой, Сіман..."), высока ацэнены крытыкай і гледачамі. 10 чэрвеня, за пяць дзён да юбілею А. Гарцуева, адбылася прэм'ера яго новай рэжысёрскай работы — "Хам" паводле Э. Ажэшкі.

Народны артыст Беларусі прафесар Валерый Раеўскі адзначыў 70-годдзе. Роўна палову свайго жыцця ён ажыццяўляў творчае кіраўніцтва калектывам купалаўцаў і ствараў спектаклі, з якіх складалася найноўшая гісторыя беларускага тэатра і многія з якіх адзначаліся прызамі на міжнародных фестывалях. Сярод яго пастановак — "Трыбунал" і "Пагарэльцы" А. Макаёнка, "Брама неўміручасці" К. Крапівы, "Апошні шанц" В. Быкава, "Парог", "Радавыя", "Апошні журавель", "Князь Вітаўт", "Чорная панна Нясвіжа" А. Дударава, "Мудрамер" М. Матукоўскага, "Страсці па Аўдзею" У.Бутрамеева, "Што той салдат, што гэты" Б.Брэхта, "Характары" В. Шукшына, "Святая святых" І. Друцэ, "Бура" У. Шэкспіра, "Рэвізор" М. Гогаля, "Тры сястры" А. Чэхава, "Ромул Вялікі" Ф. Дзюрэнмата ды інш. Нядаўна майстар паставіў камерную "Старамодную камедыю" А. Арбузава — для дуэта артыстаў-купалаўцаў Алы Ельяшэвіч і Уладзіміра Рагаўцова. Валерыя Раеўскага павіншаваў з юбілеем Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

50 гадоў адзначыў вядомы артыст Ігар Дзянісаў. Амаль чвэрць стагоддзя таму ён, выпускнік БДТМІ (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў), атрымаў ганаровае званне купалаўца. Яго талент запатрабаваны ў сцэнічных творах самых розных жанраў ("Гаральд і Мод" Ж.-К. Кар'ера, "Бура" У. Шэкспіра, "Характары" В. Шукшына, "Тарцюф" Ж.-Б. Мальера, "Паўлінка" Янкі Купалы, "Лес" А. Астроўскага, "Князь Вітаўт" і "Чорная панна Нясвіжа" А.Дударава, "Хам" паводле Э. Ажэшкі ды інш.), а таксама ў кіно, на радыё і тэлебачанні.

Лана ІВАНОВА

На здымках: сцэна са спектакля "Пінская шляхта"; народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР В. Раеўскі.

Фота Аляксандра Дзмітрыева і Кастуся Дробава

Варыяцыі Паўла Амялюсіка

У зале Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Каладзеева ладзіцца серыя выстаў, якія знаёмяць наведнікаў з найбольш цікавымі з'явамі ў беларускім мастацтве. Праект Паўла Амялюсіка "Clip Art" прадстаўляе яго работы ў сферы камп'ютэрнага мастацтва.

Імя Паўла Амялюсіка новае, але ўжо вядомае ў мастацтве. Найбольшую цікавасць выклікае здольнасць гэтага творцы сумяшчаць старыя традыцыі ў кампазіцыі, графічным і колеравым вырашэнні работ з новымі сучаснымі тэхналогіямі. Школа, якую ён атрымаў на кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, стала адпраўной кропкай для абсалютна новых пошукаў. Новых не толькі ў тэхнічным вырашэнні (аўтар перапрацоўвае з дапамогай праграмы "Photoshop" уласныя фотаздымкі і друкуе іх на палатне), але і ў постмадэрнісцкай эстэтыцы, не надта характэрнай для беларускіх творцаў.

Павел выкарыстоўвае культурную спадчыну для сваіх пошукаў: розныя стылі ў мастацтве, ад антычнага да мадэрна, усім вядомыя вобразы-архетыпы, кампазіцыйныя прыёмы знакамітых мастакоў, вытанчаныя метады графікі і манументальны погляд на арганізацыю плоскасці. Усё гэта сродкі для цудоўнай інтэлектуальнай гульні, якая, аднак, не дэвальвуе каштоўнасці культурнай скарбніцы. Такая гульня стварае ўсё новыя і новыя варыяцыі вобразаў, кампазіцый, запрашаючы і гледача да гэтага цікавага занятку.

Гэтая выстава — першая яго персанальная выстава ў Беларусі — наладжана менавіта ў Барысаве, горадзе, дзе прайшло дзяцінства мастака і дзе ён атрымаў першыя ўрокі творчасці. Увогуле выставачная дзейнасць П. Амялюсіка досыць актыўная: удзел у мастацкіх праектах Беларусі, Польшчы, Італіі, персанальная выстаўка ў Парыжы. Сфера яго інтарэсаў вельмі шырокая. Мастак далучаецца як да жывапісных выстаў, так і да конкурсаў паркавай скульптуры, цікавіцца і сучаснай архітэктурай, і мастацтвам інтэр'ера, і рознымі напрамкамі арт-бізнесу. Працуючы на заводзе "Керамін", удзельнічае ў распрацоўцы новага дызайну прамысловай керамікі. Работы Паўла Амялюсіка знаходзяцца ў калекцыях Беларусі, Украіны, Расіі, Літвы, Грэцыі, Італіі, Іспаніі. Сапраўды пераканаўчы пачатак для мастака, які толькі тры гады таму скончыў навучанне, а летась уступіў ў Беларускі саюз мастакоў.

Наталля ЦАРЫК,
кандыдат мастацтвазнаўства
г. Барысаў

«Люблю Беларусь за чысціню...»

Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра "Зьніч" даўно вядомы гледачам сваімі незвычайнымі праектамі. Гэтым разам Малая зала імя М. Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі, дзе ладзіў імпрэзу "Зьніч", прымала прадстаўнікоў армянскай і ўкраінскай дыяспар у Беларусі. А на сцэне была госця — народная артыстка Украіны Ларыса Кадырава. Спектакль "Буты" ў яе выкананні стаў сапраўды адметнай падзеяй у культурным жыцці сталіцы, бо ён аб'яднаў вакол сябе прадстаўнікоў некалькіх народаў былой вялікай шматнацыянальнай дзяржавы.

Спектакль армянскага рэжысёра Акопа Казанчана "Буты", што ў перакладзе з украінскай мовы азначае "Быць", прысвечаны легендарнай армянскай актрысе Сірануйш, якая ў росквіце сваёй творчасці сыграла Гамлета. Галоўная гераіня спектакля — прыбіральшчыца тэатральнай грымёркі (у выкананні Ларысы Кадыравай) распавядае пра лёс актрысы, пра яе пачуцці падчас працы над роляй Гамлета, пра народнае прызнанне Сірануйш пасля яе творчага трыумфу.

Перад паказам спектакля Ларыса Кадырава пагадзілася адказаць на некалькі пытанняў.

— *Ларыса Мікалаеўна, скажыце, калі ласка, што значыць для вас гэты прыезд у Беларусь?*

— Заўсёды з задавальненнем прыязджаю ў Мінск таму, што ў мяне тут ёсць сябры. Я і раней была тут некалькі разоў на гастролях. І да сённяшняга дня захоўваю ў сваім доме цудоўныя вырабы з беларускай саломкі і льну. Люблю Беларусь за дзівосную чысціню. Мы ехалі сюды на машыне, і як толькі мінулі мяжу, адразу адчулі, якія добрыя дарогі і ўбачылі, які навокал парадак і чысціня. І мімаволі пераносіш гэтыя якасці на людзей, што жывуць на гэтай зямлі, — здаецца, усе яны такія чыстыя, сумленныя і добрыя.

Ваша дзяржаўная філармонія — гэта проста унікальны культурны цэнтр. Да прыкладу, я не ведаю ва Украіне ніводнай філармоніі, дзе б ужо дваццаць год існаваў такі тэатр монадрамы, як ваш "Зьніч". Тое, што у вас ёсць музей Уладзіміра Мулявіна, — таксама дзіва, бо я не ведаю ніводнай філармоніі, дзе быў бы музей творчай асобы. Мы ўсе ўзгадаваныя на яго песнях, і ўсе любяць "Песняроў". Іх цудоўнае непаўторнае гучанне, унутраная гармонія, канечне ж, — ад любові да роднай зямлі, да народа, да народнай песні, ад любові да роднага слова.

Са сваімі спектаклямі я аб'ездзіла ўвесь свет. Паўсюль прымалі добра, нават там, дзе не разумелі ніводнага сказанага мною слова. Я заўсёды была супраць "бягучага радка", выкарыстоўваць які часта прапаноўвалі ў азіяцкіх і еўрапейскіх краінах, бо лічу, што мова тэатра — універсальная. Акцёр сваёю ігрой, сілай сваёй эмацыянальнай думкі павінен данесці тое, што закладзена ў спектаклі. Дый у гледача ёсць магчымасць услухацца ў аўтэнтычнасць мовы, адчуць і зразумець яе мілагучнасць.

Беларускі глядач кранае мяне, бо разумее тое, што я хачу сказаць, без усялякага перакладу.

— *Як бы вы азначылі свой творчы перыяд, звязаны са спектаклем "Буты"?*

— Паставіць гэты спектакль прапанаваў мне мастацкі кіраўнік армянскага тэатра Акоп Казанчан. Украінская актрыса іграе твор пра армянскую актрысу, маючы на ўвазе і нават гаворачы пра Сару Бернар, якая таксама іграла Гамлета. У гэтым спектаклі быццам бы сціраюцца не толькі культурныя і геаграфічныя межы, але і межы ў прасторы і часе, мы гаворым пра чалавечую супольнасць на падставе гуманнасці, дабрыні, інтэлекта, розуму, глыбокага духоўнага свету. Для мяне гэта унікальная магчымасць, каб весці дыялог культур.

Кожны год у нас ва Украіне я арганізоўваю фестывалі. Адзін з іх — фестываль жаночых монадрам. Летась фестываль быў прысвечаны Маркесу, а сёлета ён будзе прысвечаны Гогалю. На гэты фестываль з'едуцца спецыялісты па славянскай філалогіі з універсітэтаў Гарварда, Рыма, Пакістана, Індыі, Польшчы, Расіі. І мы будзем размаўляць пра Гогаля, які з украінскай душой пісаў паруску.

Іна САБАЛЕЎСКАЯ

Ад ігуменскіх каранёў

У шматгалосым хоры беларускага мастацтва творчасць Генадзя Матусевіча гучыць сваёй непаўторнай мелодыяй, хаця ўвасабляе ён знаёмую і вечную тэму — жыццё чалавечае...

Род Матусевічаў — адзін з самых вялікіх і старажытных на Ігуменшчыне. Таму мастак урос у гэтую зямлю глыбокімі каранямі. Тут — яго калыска, і лес, што высокімі дрэвамі пазірае на горад, некалі зачароўваў юнага мастака сваімі дзівосамі, быў яго галоўным таямнічым выхавацелем.

Прырода, розныя гістарычныя падзеі, родныя навакольныя краявіды, побыт, блізкія людзі, жыццё старажытнага Ігумена — гэта і ёсць "духоўная радзіма", невычэрпная крыніца натхнення мастака. Спасціжэнне таямніц прыроды — галоўная тэма яго творчасці. З'явы рэальнага жыцця — аснова яго работ, у якія мастак уносіць драматычную напружанасць.

Генадзь Матусевіч як сапраўдны філосаф адкрывае ў сваёй творчасці цяпло ўзаемадачыненняў чалавека і прыроды, ператварае праўду жыцця ў харастко мастацтва. Вось, напрыклад, карціна "Дровы". Дровы для правінцыйнага чалавека рэч жыццёва неабходная, праца, звязаная з імі, штодзённая, будзённая, шэрая, звыклая, нават цяжкая, за якой нялёгка разгледзець высокую паэзію і прыгажосць. Але вось перанёс мастак іх на палатно — і засвяціліся яны спрадвечным святлом, цеплынёй, цішынёй і спакоем, стаўшы цэнтрам чалавечага існавання. Яны дапамагаюць падтрымліваць агонь, які з'яўляецца сімвалам жыцця. Замілавана глядзіш на палатно, у якім усё так проста, непаўторна, арганічна. Мастак прымушае нас зачароўвацца звычайным! Стварае сваю непаўторную эстэтыку прыгажосці, многім ён "адкрывае вочы" на навакольны свет...

Значны час Генадзь працаваў у этнаграфічным стылі; захаплялі яго і хрысціянскія матывы. Мастак прытрымліваецца рэалістычнай формы, але да колеру ставіцца як да самадастатковай каштоўнасці. Сябры нездарма называюць яго памяркоўным імпрэсіяністам. Але, на маю думку, да гэтага "памяркоўнага імпрэсіянізму" дамешаны элементы таго ж "памяркоўнага сімвалізму" — загадкавай недаказанасці, што стварае атмасферу напружанага чакання.

Адданасць адным мясцінам, аднаму краю, здаецца, павінна адлюстроўвацца ў аднастайнасці ўспрымання. Дзень пры дні мастак бачыць адно і тое ж: тыя ж вуліцы, дамы, лес, поле, людзей. Але за доўгія гады ўсё вакол яго мяняецца: людзі вырастаюць, жывуць і паміраюць, дамы робяцца пустымі, самотнымі, але захоўваюць памяць пра гаспадароў; побач з мастаком сталее прырода. І жыццё неўпрыкмет напаўняецца новым зместам. Палотны Генадзя Матусевіча міжволі параўноўваеш з творчасцю амерыканскага жывапісца Эндру Уайета, свет якога таксама быў абмежаваны рэгіянальна. Іх аб'ядноўвае, на маю думку, галоўная тэма творчасці — спасціжэнне таямніц прыроды, адлюстраванне скаданых праблем і перажыванняў чалавечага жыцця.

Гадоў 10 таму Г. Матусевіч асвоіў новы для сябе напрамак: драўляная скульптура. Захапіўся гэтак, што сёння немагчыма вызначыць, што ж для яго самога з'яўляецца прыярытэтным: жывапіс ці драўляная скульптура?

Ён аддае перавагу традыцыйнаму матэрыялу беларускага народнага мастацтва і скульптуры робіць у народных традыцыях, у стылістыцы інсітнага мастацтва. Стварае скульптуры паганскіх багоў і хрысціянскіх святых, мемарыяльныя шыльды і партрэты. Для горада, у якім нарадзіўся і вырас, мастак вырабіў дзве мемарыяльныя дошкі. Першая, прысвечаная кампазітару Міколу Равенскаму, умацаваная на доме, дзе той жыў, калі працаваў у мясцовай гімназіі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Урачыста адкрытая ў 1993 годзе, яна нагадвае пра нашага вядомага земляка. Другая прысвечаная маці Максіма Багдановіча — Марылі Апанасаўне Мякоце, якая нарадзілася тут, у старажытным Ігумене, доўгі час жыла... Усталяваная ў цэнтры горада, урачыста адкрытая ў 1998 годзе, яна з'яўляецца помнікам культурнай і гістарычнай спадчыны раёна.

Радуюць душу і вока жыхароў Чэрвеня драўляныя помнікі Г. Матусевіча. На тэрыторыі касцёла Узвіжання Святога Крыжа — скульптура Маці-ігуменні, заснавальніцы горада, выкананая ў гатычным стылі. Ля мясцовай школы мастацтваў — скульптурнае ўвасабленне кампазітара-земляка Станіслава Манюшкі, народжанага ў фальварку Убель былога Ігуменскага павета. Дзве скульптуры ўсталяваныя ва ўрочышчы Цагельня ў памяць пра ахвяры расстрэлаў у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны... Усіх твораў і не пералічыш. А колькі цікавых задум!

Мастак удзельнічаў у многіх рэспубліканскіх пленэрах разьбяроў па дрэве. Яго работы знаходзяцца ў прыватных калекцыях аматараў мастацтва ў Маскве, Ірландыі, Польшчы, Чэхіі. Персанальныя выставы адбываліся ў Карціннай галерэі Гаўрыіла Вашчанкі ў Гомелі, у сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, Літаратурным музеі Максіма Багдановіча...

Генадзь Матусевіч атрымаў запрашэнне ад адміністрацыі горада-пабраціма Акцябрскі Маскоўскай вобласці на правядзенне выставы. Рыхтуе экспазіцыю.

Вольга НАЗАРУК
г. Чэрвень

Адказнае заданне

Літаратурная спадчына Івана Шамякіна і фармат яе выдання ў сучасных грамадска-культурных умовах

Напрыканцы мая ў Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі адбылася Рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя "Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі". Сваё жаданне ўдзельнічаць у сёлетнім навуковым форуме выказалі многія вядомыя беларускія вучоныя, маладыя крытыкі і літаратуразнаўцы, прадстаўнікі шэрагу ВНУ краіны — з Мінска, Гомеля, Магілёва, Віцебска, Гродна, Брэста, Полацка і інш. На пленарным пасяджэнні і ў сямі секцыях была заслухана і абмеркавана большая частка з васьмідзесяці дакладаў, заяўленых на канферэнцыю. Матэрыялы дакладаў і выступленняў будуць выдадзены асобным зборнікам.

"ЛіМ" друкуе выступленне аднаго з удзельнікаў канферэнцыі — доктара філалагічных навук, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, прафесара М. Мушынскага.

Народны пісьменнік БССР (1972), Герой Сацыялістычнай Працы (1981), акадэмік НАН Беларусі (1994), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951) і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968), вядомы грамадскі і культурны дзеяч, Іван Пятровіч Шамякін (1921—2004) займае адметнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры другой паловы XX ст.

Адзін з найбольш глыбокіх і праніклівых беларускіх літаратуразнаўцаў і крытыкаў В. Каваленка яшчэ ў канцы 1970-х гг. так тлумачыў прычыны трывалай чытацкай цікавасці да творчасці І. Шамякіна: "слава аўтара пенталогіі "Трывожнае шчасце", раманаў "Крыніцы", "Сэрца на далоні" заслужаная: яго творы займальна апавядаюць пра бягучы, асабліва хвалюючы момант чалавечага быцця. Вядома, кожны сапраўды мастацкі твор незалежна ад тэмы дыхае сучаснасцю, але бясспрэчна, што глыбокія вобразныя малюнкі менавіта сённяшняга жыцця народа маюць асаблівую ўладу над чытачом".

Але ў апошнія гады становішча з выданнямі твораў (асабліва тых пісьменнікаў, якія скончылі сваё зямное жыццё) змянілася, на жаль, не ў лепшы бок. Праўда, І. Шамякіну ў гэтых варунках пашанцавала. У дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі "Аб увекавечанні памяці народнага пісьменніка Беларусі Шамякіна І. П. ад 15.05.2006. № 177 рп" побач з іншымі мерапрыемствамі прадугледжваецца і выданне яго літаратурна-мастацкай спадчыны ў выглядзе Збору твораў у 23 тамах. Падрыхтоўка згаданага шматтомніка ўскладзена на Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, а ў практычным, навукова-метадычным, арганізацыйным плане адказнае дзяржаўнае заданне выконвае аддзел выданняў і тэксталогіі. Перш чым распачаць канкрэтную размову пра тое, якой бачыцца тэкстолагам іхняя задача, якія складанасці паўстаюць на іх шляху і ў чым сутнасць гэтых складанасцей, дазволю сабе спыніцца на адным моманце, які мае непасрэднае дачыненне і да пералічаных вышэй аспектаў, і да праблемы, вынесенай у назву даклада. Гаворка ідзе пра нядаўні падарунак, які зрабіла прыхільнікам таленту І. Шамякіна выдавецтва "Харвест" у выглядзе двухтомніка яго твораў. Кожны том вялікага фармату налічвае адпаведна 1741 і 1565 старонак. У гэтае выданне ўключаны па сутнасці ўсе вядомыя аповесці і раманы пісьменніка, г. зн., большая частка яго літаратурна-мастацкай спадчыны.

Не так багата выходзіць сёння аб'ёмных выданняў, каб наводзіць на іх крытыку, вышукваць недахопы, пралікі, упушчэнні, хоць у дадзеным канкрэтным выпадку ёсць падставы паразважаць наконт мэтазгоднасці менавіта такога вось тыпу, калі чытачу прапануецца тэкст аповесцей, раманаў з невялікай прадмовай (7 старонак), але без гісторыка-літаратурных, без рэальных каментарыяў. Прымаючы пад увагу аб'ём выдання (267, 23 др. арк.) і тое, што тут змешчаны творы, напісаныя ў далёкія ўжо 1950-я, пэўныя тлумачэнні аказаліся б вельмі дарэчы. Але выдавецтва, відаць, не валодае неабходнымі фінансавымі сродкамі, каб знайсці кваліфікаваных, дасведчаных спецыялістаў і з іх дапамогай ажыццявіць навукова каментаванае выданне.

Што ж датычыць канцэпцыі Збору твораў І. Шамякіна, распрацаванай у аддзеле тэксталогіі Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі, дык яна істотна адрозніваецца не толькі ад той, якая ўзята за аснову згаданага харвестаўскага двухтомніка, але і іншых нашых выданняў апошняга часу. Адпаведна статусу інстытута як акадэмічнай установы і тым традыцыям, на якія тэкстолагі абапіраюцца ў сваёй дзейнасці, мы пайшлі інакшым шляхам: прапанаваная намі мадэль не дубліруе ні 3-томнік М. Багдановіча (1992—1995), ні 10-томнік Янкі Купалы (1995—2003), ні 20-томнік Якуба Коласа, шэсць тамоў якога пабачыла ўжо свет.

Адметнасць мадэлі шматтомнага Збору твораў І.Шамякіна якраз і сталася прычынаю таго, чаму гэтую мадэль мы палічылі неабходным вынесці на абмеркаванне навуковай канферэнцыі. Адна з прычын у тым, што колькасна нешматлікай групе тэкстолагаў, занятых падрыхтоўкай 23 тамоў, патрэбна дапамога, бо выкарыстаць у гатовай форме папярэдні вопыт нельга, паколькі пасмяротныя Зборы твораў нашых славутых песняроў выдаваліся неаднаразова: і ў адным, і ў двух, і ў трох тамах (М. Багдановіч); у 6-ці (двойчы), у 7-мі, у 9-ці тт.(10 кн.) (Янка Купала); у 12-ці, у 14-ці тт. (Якуб Колас). Недахопы першых выданняў крытычна асэнсоўваліся, улічваліся ў наступных. Практычны вопыт пад пяром даследчыкаў знаходзіў навуковае абагульненне — у выглядзе паасобных артыкулаў, публікацый, зборнікаў, нават дысертацыйных прац. Што ж датычыць літаратурнай спадчыны І. Шамякіна, дык тут сітуацыя зусім іншая, бо адсутнічае не толькі вопыт шматтомнага выдання, але адсутнічаюць і навукова каментаваныя Зборы яго твораў.

У пацвярджэнне справядлівасці сказанага спашлюся на адсутнасць літаратурна-мемарыяльнага музея І. Шамякіна і на неапрацаванасць матэрыялаў асабістага пісьменніцкага архіва. Няма анатаванага апісання аўтографаў Шамякіна-празаіка, драматурга, публіцыста, мемуарыста. Не праведзена франтальнае вывучэнне беларускай перыёдыкі з канца 40-х і да пачатку 2004 г., не прагледжаны асноўныя літаратурныя выданні тых рэспублік, дзе друкаваліся пераклады твораў І. Шамякіна, магчымыя каментарыі і аўтакаментарыі да іх. Не сабрана і не вывучана ў такой ступені, якой патрабуе вопыт падрыхтоўкі навуковых выданняў, перапіска І.Шамякіна з яго шматлікімі адрасатамі, у тым ліку і з прадстаўнікамі іншых літаратур, з перакладчыкамі. У распараджэнні тых, хто будзе каментаваць канкрэтныя творы пісьменніка, няма нават самага сціслага "Летапісу жыцця і творчасці", няма кнігі "Іван Шамякін у ацэнках літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства". А між тым, аналагічныя выданні, якія датычаць ацэнак творчасці Купалы і Коласа, з'явіліся ўжо ў сярэдзіне 20-х гг.! Не збіраюцца і матэрыялы пра літаратурна-творчае, грамадска-культурнае асяроддзе Шамякіна. Пакідае жадаць лепшага стан і ўзровень вывучанасці тэмы "Творы Шамякіна на тэатральнай сцэне, у кіно і на тэлеэкране", хоць унёсак пісьменніка ў развіццё беларускай драматургіі, тэле- і кінамастацтва даволі вялікі. Тут тэкстолагаў-каментатараў чакае сур'ёзная даследчая праца па вызначэнні ступені аўтарства тых жа кінасцэнарыяў ці экранізацый: калі яны напісаны пры ўдзеле іншай асобы, тады такія творы неабходна друкаваць пад рубрыкай "У сааўтарстве". Мяркуючы па сённяшнім стане падрыхтоўчай працы, тэкстолагі непазбежна сутыкнуцца з пэўнымі цяжкасцямі пры вырашэнні такога, здавалася б, зусім практычнага пытання, як іканаграфія І. Шамякіна, забеспячэнне кожнага з 23 тамоў высакаякасным, змястоўным ілюстрацыйным матэрыялам.

Перад тэксталагічнай групай паўстала і яшчэ адна надзвычай няпростая задача — дакладна вызначыць адрасата Збору твораў, інакш кажучы, акрэсліць тып выдання. Выходзячы са сказанага вышэй, было прызнана найбольш мэтазгодным аднесці Збор твораў да навукова-масавага выдання, у якім прадугледжваецца разгорнутая прадмова і літаратурны каментарый у выглядзе паслясловя да кожнага асобнага тома. Прыналежнасць да навуковага тыпу будзе забяспечана падрыхтоўкай тэксту і яго каментаваннем (выбар крыніцы асноўнага тэксту, устанаўленне дакладнай даты напісання і першай публікацыі, выпраўленне памылак і г. д.) А скіраванасць Збору твораў да шырокай чытацкай аўдыторыі павінна быць пацверджана змястоўнымі прадмовай і паслясловямі да кожнага тома, а таксама рэальным каментарыем. Паколькі творы пісаліся ў розны час і яны розныя паводле ўзроўню пісьменніцкага майстэрства, дык нельга пакідаць чытача сам-насам з творамі, трэба патлумачыць, што ў іх захоўвае мастацкую каштоўнасць, а дзе І. Шамякін праз жыццёвую нявопытнасць, светапоглядную няспраўнасць ці пад дыктатам абставін ішоў на кампраміс, міжвольна згладжваў сацыяльныя супярэчнасці часу, прыхарошваў рэчаіснасць, ідэалізаваў жыццё. Каб надаць паслясловям большую чытэльнасць, неабходна змясціць там матэрыялы па гісторыі напісання твора: як узнікла задума аповесці або рамана, на якія факты і падзеі рэальнага жыцця, асабістыя назіранні або архіўныя дакументы абапіраўся І. Шамякін у працэсе творчай працы. Што ж датычыць варыянтаў першапачатковага тэксту, дык тут, як мяркуецца, будуць пададзены толькі тыя з іх, якія сапраўды ўяўляюць асаблівую ідэйна-мастацкую каштоўнасць. А вось ад самастойнай рубрыкі "Іншыя рэдакцыі і варыянты", якая трывала замацавалася ў Зборах твораў Купалы і Коласа, вырашана пакуль адмовіцца: для чытачоў навукова-масавага выдання згаданы матэрыял, напэўна, не ўяўляе вялікай цікавасці, гэта сфера вывучэння навукоўцаў, даследчыкаў.

Што ж датычыць дапамогі, якая патрэбна тэкстолагам, дык "першы транш" намі атрыманы: загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Белдзяржуніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар Т. Шамякіна і загадчык кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова доктар філалагічных навук А. Макарэвіч па ўзгодненасці з кіраўнікамі сваіх устаноў сфарміравалі групы навукоўцаў, якія пагадзіліся напісаць гісторыка-літаратурныя, літаратурна-крытычныя паслясловяі да адпаведных тамоў Збору твораў І. Шамякіна. Агульная прадмова да ўсяго выдання напісана акадэмікам У. Гніламёдавым.

Менавіта прадмова і паслясловяі і разглядаюцца як адна з рэальных форм дапамогі сённяшняму і заўтрашняму чытачу. Але якраз тут ужо на першым этапе працы ўзніклі цяжкасці. І нам хацелася б пачуць меркаванні літаратуразнаўцаў яшчэ да таго, як паслясловяі будуць завершаны, прыняты ў канчатковым выглядзе, а не пасля іх выхаду ў складзе Збору твораў. Багаты вопыт падрыхтоўкі шматтомных выданняў наглядна паказвае, што ахвотнікаў даваць парады, рэкамендацыі пасля выхаду пэўнага тома ці ўсяго Збору твораў у свет нямала. Але якая карысць ад запозненых пажаданняў і крытычных заўваг, нават калі яны слушныя, вартыя ўвагі? Паміж аўтарамі ўзнікалі разыходжанні ў поглядах на змест паслясловя: дастаткова даць агульную ацэнку твора, змешчанага ў томе, ці размова павінна ўсё ж ісці пра грунтоўнае гісторыка-літаратурнае даследаванне, у якім неабходна не толькі раскрыць сэнсавае багацце аповесці, рамана, п'есы, не толькі прааналізаваць вобразную сістэму, моўна-стылёвыя асаблівасці твора, але і вызначыць месца гэтага твора ў літаратурным працэсе, у нацыянальнай літаратуры. Пры гэтым трэба прызнаць, што абодва выкладзеныя падыходы праваамерныя. З аднаго боку, папулярнае выданне вымагае адпаведнага тыпу каментарыя. З другога, шматтомныя Зборы твораў, як правіла, перавыдаюцца рэдка, і можа здарыцца так, што праз 5—7 гадоў пасля завяршэння шматтомніка папулярна напісаны каментарый састарэе, яго не будзе каму чытаць. Пошукі кампрамісу — спалучыць папулярную форму выкладу і адначасова дабіцца навуковай, гісторыка-літаратурнай грунтоўнасці — не вырашаюць праблему: найчасцей атрымліваецца эклектыка.

Між іншым, можа ўзнікнуць пытанне, чаму аўтары канцэпцыі прапанавалі форму паслясловя, а не, скажам, шырока распаўсюджаны жанр прадмовы? Перавага аддадзена паслясловю, каб загадзя не навязваць чытачу пункт гледжання даследчыка: а потым ён зможа праверыць свае асабістыя ўражанні і меркаванні, супаставіць іх з ацэнкай спецыяліста.

Яшчэ раз хацелася б падкрэсліць: такое маштабнае выданне, як Збор твораў у 23 тамах, немагчыма падрыхтаваць на высокім узроўні невялікім калектывам, нават калі ў яго склад уваходзяць вопытныя, дасведчаныя ў сваёй справе спецыялісты. І адказнае дзяржаўнае заданне не павінна выконвацца ў келейнай абстаноўцы, а падрыхтоўка не павінна весціся ў закрытым рэжыме. Гэта — клопат усёй літаратурнай, навуковай грамадскасці. Таму зноў гаворка ідзе пра дапамогу, але дапамогу ўжо іншага характару: звяртаюся да кіраўнікоў нашых вядучых літаратурна-мастацкіх часопісаў з прапановай наладзіць на старонках іхніх выданняў рэгулярную публікацыю матэрыялаў, непасрэдна звязаных са Зборам твораў І. Шамякіна, і ў першую чаргу публікацыю агульнай прадмовы да выдання і паслясловяў, якія павінны ўвайсці ў адпаведныя тамы. Гэтыя публікацыі можна было б змяшчаць у асобнай рубрыцы: "Мастацкая спадчына І. Шамякіна ў літаратурным працэсе XXI стагоддзя". Асабліва дзейснай была б дапамога, калі б надрукаваны матэрыял стаў затым прадметам вострага, зацікаўленага абмеркавання тых ацэнак, трактовак, інтэрпрэтацый, якія дадзены аповесцям, п'есам, раманам І. Шамякіна. Няма сумнення ў тым, што многія палемічныя выказванні, канструктыўныя заўвагі будуць з удзячнасцю прынятыя аўтарамі паслясловяў і ўлічаны ў канчатковым варыянце. Вось у гэтым і знайшоў бы сваё канкрэтнае праяўленне агульны клопат беларускай літаратурнай, навуковай грамадскасці пра спадчыну пісьменніка, які на працягу паловы стагоддзя актыўна працаваў на ніве беларускага пісьменства і зрабіў свой пачэсны ўнёсак у яго развіццё.

Міхась МУШЫНСКІ

Паэтам апладзіраваў Ракасоўскі

У чытальнай зале Нацыянальнага архіва я пільна вывучаў спісы дэлегатаў XIV з'езда КП(б) Беларусі, якіх выбралі ў склад кіруючых органаў. І раптам — у спісе членаў Цэнтральнай кантрольнай камісіі КП(б)Б імя Канстанціна Ракасоўскага... Адкуль узялося гэтае імя, вядомае цяпер усяму свету? Пра яго ўдзел у грамадска-палітычным жыцці ў Мінску не чуў ніколі. Анкета дэлегата К. Ракасоўскага ўзрадавала і натхніла. Цікавая знаходка няўмольна патрабуе не спыняцца. Калі ж імя Ракасоўскага стала вядомым у Беларусі, дзе і калі ён сустракаўся з жыхарамі нашай рэспублікі?

Першае знаёмства з Канстанцінам Ракасоўскім адбылося завочна, праз масавую папулярную газету "Звязда", якая 16 сакавіка 1930 года дала пра яго інфармацыю пад загалоўкам "Новы камандзір 7-й Самарскай дывізіі". Яна змясціла яго фотаздымак — малады, прыгожы, з трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, — і паведаміла чытачам, што ў Мінск на гэтую пасаду прыехаў Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі. Газета пазнаёміла з яго кароткай біяграфіяй.

Нарадзіўся 8(20) снежня 1896 года ў горадзе Вялікія Лукі ў сям'і чыгуначніка. Праз тры гады сям'я пераехала ў Варшаву, у хуткім часе бацька трапіў у катастрофу і заўчасна памёр. Дома не было сродкаў да існавання, і Косця, дзе толькі мог, не цураўся ніякай працы. Нават у школе вучыцца давялося з перарывамі, а прага пазнання вялікай была.

Пачалася Першая сусветная вайна, і Канстанціна Ракасоўскага прызвалі ў царскую армію...

— Ракасоўскі заўсёды гаварыў, што ў ім часцінка рускага, польскага і беларускага, — сведчыць Святлана Язерская, загадчыца аддзела Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.

Сапраўды, яго сіла і непахіснасць у мудрасці і супольнасці трох славянскіх народаў. А з Беларуссю яго вельмі многае звязвала. Папершае, кроўная роднасць: яго маці Антаніна Аўсяннікава нарадзілася ў мястэчку Целяханы Пінскага павета (цяпер гарпасёлак Івацэвіцкага раёна, на Агінскім канале, працавала настаўніцай у горадзе Пінску.

Па-другое, наступальную аперацыю "Баграціён", якая адыграла галоўную ролю ў разгроме групы нямецкіх армій "Цэнтр" і вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у асноўным распрацоўваў К. К. Ракасоўскі.

Па-трэцяе, Канстанцін Ракасоўскі ў пачатку 1930-х гадоў служыў у Мінску, дзе ў яго склаліся вельмі спрыяльныя адносіны з партыйна-дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі рэспублікі. Гэта беларуская старонка яго біяграфіі застаецца "белай плямай". Пра тое, што служыў у Мінску, у кнігах упамінаецца, а падрабязней — нідзе ніводнага слова.

7-я Самарская кавалерыйская дывізія дыслацыравалася ў Мінску і яго ваколіцах. Новы камдыў імкнуўся падтрымаць гонар дывізіі, якую яшчэ нядаўна ўзначальвалі такія вядомыя камандзіры, як Г. Гай і Д. Сердзіч. Узнімаць баявую моц дывізіі, працягваць яе лепшыя традыцыі яму дапамагалі камандзіры і палітработнікі чатырох палкоў. Адным з іх, 39-м кавалерыйскім палком, камандаваў Георгій Жукаў.

Ракасоўскі прыехаў у Мінск у сакавіку 1930 года, толькі распачаў сваю дзейнасць камандзіра дывізіі, а ўжо ў маі яго выбралі дэлегатам XIII з'езда КП(б) Беларусі. З'езд праходзіў у Доме палітасветы (былы клуб імя К. Маркса). Дзіўна, што гэты двухпавярховы домік, атрымаўшы новае жыллёвае прызначэнне, захаваўся ва ўсёй сваёй прыгажосці. Ён знаходзіцца побач з тэатрам імя Янкі Купалы, на вуліцы Энгельса, паміж кінатэатрам "Піянер" і Домам кнігі.

У невялікай зале, дзе праходзіў з'езд, Канстанцін Ракасоўскі ўпершыню знаёміўся з прадстаўнікамі маладой беларускай палітычнай эліты, упершыню бачыў іх удумлівыя заклапочаныя твары. Дэлегаты заслухалі даклад сакратара выканкама Камінтэрна Дзмітрыя Мануільскага аб рабоце ЦК ВКП(б) і задачах партыі ў барацьбе з правым ухілам. Ракасоўскаму цікава было паслухаць справаздачныя даклады ЦК КП(б)Б, з якімі выступалі К. Гей і І. Васілевіч, даклад, К. Бенека пра выкананне пяцігадовага плана развіцця прамысловасці, даклад М. Галадзеда пра калгаснае будаўніцтва і развіццё сельскай гаспадаркі. Усіх радавалі першыя крокі індустрыялізацыі, абнаўленне вёскі, поспехі па ліквідацыі непісьменнасці, і ўсіх засмучала "бязлітасная барацьба" з праявамі правага апартунізму, "левых" перагібаў, нацыянал-дэмакратызму.

Дэлегаты хваляваліся, ніякавата адчувалі сябе ад таго, што ў працэсе будаўніцтва сацыялізму нечакана ўзнікла новая негатыўная праява — барацьба са сваімі і жорсткая расправа з імі. Пэўна, рэдка хто з дэлегатаў думаў, што былыя наркамы Антон Баліцкі і Дзмітрый Прышчэпаў, а таксама вядомы гісторык і палітык Усевалад Ігнатоўскі, якіх папракалі прамоўцы з трыбуны з'езда, сапраўды ўяўлялі з сябе небяспеку. Большасць дэлегатаў лічыла, што яны былі шчырымі і сумленнымі дзяржаўнымі дзеячамі, але штосьці ў развіцці нацыянальнай культуры бачылі па-свойму, інакш. У іх маглі быць непазбежныя памылкі тых, хто актыўна дзейнічае, шукае. Дык ці патрэбна хапацца за "вялікую дубіну", як калісьці казаў М. Судзілоўскі?

У склад дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі выбралі і беларускіх пісьменнікаў, хлопцаў шчырых і таленавітых, носьбітаў новай культуры Андрэя Александровіча, Платона Галавача, Міхася Клімковіча, Міхася Чарота, з якімі Канстанцін Ракасоўскі ўжо быў знаёмы. Ад іх, хто выступаў, ён чуў жывую сакавітую беларускую мову, якую няблага ведала яго родная маці.

За 14 дзён, калі праходзіў з'езд партыі, К. Ракасоўскі шмат з кім пабачыўся ці добра пазнаёміўся, запомніў тых, хто выступаў ці вылучаўся ў члены ЦК: Р. Грысевіча — старшыню ВСНГ, У. Ігнатоўскага — прэзідэнта АН БССР, П. Рачыцкага — наркама земляробства БССР і іншых.

Пасля з'езда К. Ракасоўскі адчуваў сябе больш грунтоўна, як свой сярод сваіх. А кола яго знаёмстваў пашыралася ў дзяржаўных, ваенных установах, на вечарынах у сяброў па службе. У вольны час любіў з жонкай Юліяй Пятроўнай прайсціся па цяністых дарожках старога парку "Прафінтэрн", дзе збіралася многа мінчан (цяпер дзіцячы парк імя М. Горкага), у Беларускай студыі оперы і балета яму пашчасціла слухаць Ларысу Александроўскую і іншых спевакоў.

У Мінску час для камандзіра дывізіі К. Ракасоўскага не ішоў, а ляцеў. Працаваў і днём, і ноччу. Не прайшло і года, як яго зноў выбралі дэлегатам, гэтым разам X Усебеларускага з'езда Саветаў, які адбыўся 20—28 лютага 1931 года. Зімовым марозным ранкам камдыў ішоў да Дома культуры (цяпер гэта Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага на вуліцы Валадарскага, 5). Адчуваючы ўнутранае задавальненне, ён увайшоў у фае клуба, здаў у гардэроб свой баявы шынель, атрымаў неабходныя паперы і накіраваўся ў залу, якая ўжо ваўсю гаманіла. Яго высокая постаць, малады прыгожы твар і далікатны высакародны, крыху сарамлівы погляд вылучалі яго з гурта звычайных людзей. Ды яшчэ гэты вайсковы мундзір, перапаясаны накрыж рамянямі і бліскучыя ордэны рабілі яго надта ж прыкметным. Хутка Канстанцін Ракасоўскі ўбачыў знаёмых вайскоўцаў — Івана Васілевіча, начальніка Беларускай вайсковай школы, камандзіраў стралковых корпусаў Сямёна Цімашэнку і Яна Лаціса з Магілёва ды іншых, а таксама беларускіх цывільных Нічыпара Аксючыца, які нядаўна быў старшынёй Мінскага гарвыканкама, сакратара гаркама партыі Захара Кавальчука, старшыню Калгасцэнтра Сяргея Міцькова, Карла Дамброўскага, Мікалая Галадзеда ды іншых. Усміхаючыся, з аднымі вітаецца за руку, з іншымі — дружалюбна размаўляе.

З'езд адкрыў вядомы ўсім Аляксандр Чарвякоў. Яго гучны настаўніцкі голас ужо быў знаёмы дэлегату К. Ракасоўскаму. Прамоўца гаварыў пра палітычнае становішча ў краіне, у якім праходзіць з'езд. Ад дэлегацыі 7-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі з прывітаннем да з'езда выступіў камісар Шашуноў. Ракасоўскі насцярожана слухаў, як той інфармаваў пра жыццё і поспехі "яго" дывізіі. Прывітанне было сустрэта крыкамі "ўра!" і камдыў не стрымаў усмешкі. А потым пайшлі вельмі сур'ёзныя даклады аб працоўных буднях беларускіх фабрык, заводаў, новабудоўляў, дзяржаўных, навуковых, асветніцкіх устаноў, грамадскіх арганізацый. Выступалі: старшыня ВСНГ Рыгор Грысевіч, наркам земляробства Піліп Рачыцкі, наркам асветы Антон Платун, рэктар Белдзяржуніверсітэта Язэп Каранеўскі і шмат іншых.

Самая афіцыйная частка з'езда — вылучэнне кандыдатаў у вышэйшы заканадаўчы, распарадчы і кантрольны орган БССР — вымусіла Канстанціна Канстанцінавіча пахваляваццa. Дык як не хваляваццa, калі тут яго ўпершыню выбіраюць у такі ганаровы і адказны орган улады! Значыць, і яму выказалі павагу і давер. Тым больш, што ў склад дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі выбралі і беларускіх пісьменнікаў, хлопцаў шчырых і таленавітых, носьбітаў новай культуры — Андрэя Александровіча, Платона Галавача, Міхася Клімковіча, Міхася Чарота, — з якімі Канстанцін Ракасоўскі ўжо быў знаёмы. Ад іх, хто выступаў, ён чуў жывую сакавітую беларускую мову, якую няблага ведала яго родная маці.

З 23 студзеня 1932 года ў тым жа памяшканні Дома культуры адкрыўся XIV з'езд Кампартыі Беларусі. Камдыў Ракасоўскі слухаў справаздачны даклад другога сакратара ЦК Васіля Шаранговіча, які грунтоўна асвятляў міжнароднае становішча дзяржавы. Ён казаў: "Сусветны капіталізм шалёна рыхтуецца да новай антысавецкай вайны... Сусветны эканамічны крызіс, які расце і паглыбляецца на фоне вялікіх поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва, прымушае буржуазію шукаць выратавання ў падрыхтоўцы новых войн і, у першую чаргу, у вайне супраць нас."

Гэтак жа думаў у той час і К. Ракасоўскі, і яму хацелася пачуць, як развіваецца ў Беларусі эканоміка, галоўны аргумент у абароназдольнасці дзяржавы. І ён пачуў суцяшальную сімфонію будаўніцтва новых заводаў і рэканструкцый старых. Пачуў пра ўступленне ў строй БелДРЭС, Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната, Добрушскай папяровай фабрыкі, станкабудаўнічага завода імя К. Варашылава і інш. На з'ездзе шмат гаварылася пра развіццё беларускай культуры, літаратуры і мастацтва.

На гэтым з'ездзе (трэцім па ліку) Канстанцін Ракасоўскі быў выбраны членам ЦКК КП(б)Б, у склад якой увайшлі Карл Дамброўскі, Карней Жолудаў, Георгій Казачонак (начальнік Ваенна-абароннай групы ЦКК), Пётр Пасюкевіч, Кацярына Прусакова, Платон Равінскі, Вольга Суханава і іншыя. Ён ведаў, каго больш, каго менш, а каго бачыў і ўпершыню. На першых пасяджэннях Цэнтральнай кантрольнай камісіі знаёмства працягвалася, але нядоўга. Праз месяц К. Ракасоўскага тэрмінова накіравалі ў Маньчжурыю, дзе японцы распачалі акупацыю.

Як бачым, Мінск стаў вельмі змястоўным радком біяграфіі будучага маршала.

Дзе жыў Ракасоўскі ў Мінску? Адзін вядомы гісторык назваў вуліцу Энгельса, 13, на гэтым месцы цяпер гасцініца "Кастрычніцкая". Між тым у апошняй анкеце на XIV з'езд КП(б)Б К. Ракасоўскі ўласнаручна напісаў свой адрас "Университетская, 38". Дзе гэта вуліца, дзе гэты дом? Вядомы гісторык, відаць, не памыліўся, калі дом 13 стаяў на вуліцы Энгельса, на скрыжаванні з вуліцай Універсітэцкай (так называлася яна ў 1922 — 1934 гадах, да рэвалюцыі была Магазіннай, а з 1934 года — Кірава). За гады вайны амаль усе дамы па ёй былі разбураны. Зрэшты, пасля сведчання самога К. Ракасоўскага ўсе спрэчкі страчваць сэнс, а вось даведацца, якога прызначэння быў будынак ("38"), варта было б.

Сёння аблічча Мінска зусім іншае. А былы Дом культуры (драмтэатр імя М. Горкага), на радасць усім, захаваўся). Дык ці не варта было б на гэтым гістарычным будынку ўстанавіць мемарыяльную дошку ў гонар праслаўленага палкаводца, легендарнага маршала Перамогі К. Ракасоўскага, жыццё якога звязана з горадам-героем Мінскам?

Эдуард КАРНІЛОВІЧ,
кандыдат гістарычных навук

Нататкі краязнаўца

Выхавацель імператара

Аляксандр Пушкін у лісце да сваёй жонкі 22 красавіка 1834 года з Пецярбурга пісаў: "... Яшчэ навіна: Мердэр памёр; гэта яшчэ адна таямніца для вялікага князя, якая атруціць яго юначую радасць". А вось яшчэ адзін запіс, гэтым разам ужо з дзённіка А. Пушкіна, зроблены ім 25 красавіка таго ж года: "Мердэр памёр, чалавек добры і высакародны, незаменны. Вялікі князь гэтага не ведае. Ад яго хаваюць вестку, каб не атруціць яго радасці. Раскажуць яму толькі пасля балю 28-га". І нарэшце, апошні запіс у дзённіку з гэтай жа нагоды: "Мердэр памёр у Італіі — Вялікаму князю, вельмі да яго прывязанаму, не дакладалі пра гэта да самага балю".

Што ж гэта была за асоба — Мердэр? У кнізе Л. Чарэйскага "Пушкін і яго атачэнне" пра яго ёсць наступныя звесткі: "Карл Карлавіч Мердэр (8.I.1788 — 24.III.1834) выхавацель вял. кн. Аляксандра Мікалаевіча (будучага Аляксандра II), генерал-ад'ютант". Коратка і суха. Уласны пошук інфармацыі пра гэтага чалавека даў крыху большы плён.

Выявілася, што Карл Мердэр — наш суайчыннік. Ён нарадзіўся ў сям'і гараднічага горада Беліцы Магілёўскай губерні. У адзінаццаць гадоў апынуўся ў кадэцкім корпусе, які быў створаны генерал-лейтэнантам С. Зорычам у сваім маёнтку ў Шклове. У 1804 г. Карл Мердэр быў накіраваны ў Елізаветградскі гусарскі полк, які ў 1805 г. браў удзел у Аўстэрліцкай бітве. Карл Мердэр быў цяжкапаранены, аднак паспеў паказаць сваю адвагу, дзякуючы чаму стаў вядомы імператару Аляксандру I. Калі ў 1823 г. у Расіі была сфарміравана Школа гвардзейскіх падпрапаршчыкаў, яе ротным камандзірам прызначылі менавіта К. Мердэра. А праз нейкі час імператар захацеў бачыць яго ў ролі выхавацеля свайго шасцігадовага сына Аляксандра.

Дзесяць гадоў К. Мердэр выконваў гэтыя абавязкі. Аднак рана, атрыманая яшчэ пад Аўстэрліцам, і хвароба сэрца, якая істотна пагоршыла здароўе, змусілі яго ў сакавіку 1833 г. выправіцца за мяжу на лячэнне.

Тым часам набліжалася паўналецце спадкаемца, які павінен быў у сувязі з гэтым прыняць прысягу на вернасць Айчыне. За некалькі дзён да цырымоніі Аляксандр пісаў свайму настаўніку: *"Вы, верагодна, ужо ведаеце, што мяне праз тыдзень чакае. Я ўпэўнены, што вы будзеце пра мяне думаць, гэтак жа, як і я пра вас, мой мілы і дарагі сябра, і таму вы можаце сабе ўявіць, як мне павінна быць сумна, што вас, майго другога бацькі, у гэты важны ў маім жыцці дзень тут не будзе. Аднак уся гэтая скруха міне як толькі вы вернецеся да мяне цалкам здаровым, каб скончыць распачатую вамі справу"*. Калі імператарскі спадкаемца пісаў гэтыя радкі, Карла Мердэра ўжо не было ў жывых.

Што ж датычыць знаёмства А. Пушкіна з К. Мердэрам, то можна выказаць наступнае меркаванне. 18 чэрвеня 1832 года Пушкін, Вяземскі ды іншыя асобы развіталіся ў Кранштаце з В. Жукоўскім, які ад'язджаў за мяжу. Сярод праважатых быў і Мердэр. Магчыма, менавіта Жукоўскі і пазнаёміў Пушкіна з ім. Акрамя таго, паэт мог быць знаёмы з дачкой Мердэра — фрэйлінай і аўтарам дзённіка з запісамі пра сустрэчы з А. Пушкіным, Н. Пушкінай і Дантэсам на пецярбургскіх свецкіх балях.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

№ 26 17 ліпеня 2009 г. Літ

Вялікія чаканні

Чарльз Дыкенс (1812—1870) — найбуйнейшы англійскі пісьменнік, прадстаўнік крытычнага рэалізму. Яго пяру належаць 15 бліскучых раманаў, 7 п'ес, шматлікія апавяданні і эсэ. Нізкае сацыяльнае паходжанне і працяглае жыццё ў нястачы прадвызначылі ідэйныя арыенціры і эстэтычныя дамінанты Ч. Дыкенса. Уласную творчую місію пісьменнік бачыў ва ўдасканаленні грамадскіх дачыненняў, выкараненні сацыяльных заганаў, усталяванні справядлівасці і абароне годнасці простага чалавека.

Нарадзіўся Ч. Дыкенс у Лэндпарце ў сям'і дробнага клерка. З 10 год юнак робіць на цяжкіх працах, змагаючыся за фізічнае выжыванне. Пры гэтым ён знаходзіць час для самаадукацыі, асвойвае майстэрства стэнаграфіі.

У 17 год Ч. Дыкенс нарэшце становіцца парламенцкім рэпарцёрам, што паўплывала на яго далейшы лёс. Ён рыхтуе рэпартажы на грамадскія і палітычныя тэмы, а ў 18-36 г. друкуе першы ўласна мастацкі твор — "Нарысы Боза".

Затым Ч. Дыкенс працяглы час працуе над "Піквікскімі запіскамі" (1837), якія друкаваліся асобнымі выпускамі, насычанымі ілюстрацыямі. У творы пісьменнік распавядае розныя займальныя гісторыі, апісвае прыгоды і неардынарныя здарэнні, стварае камічныя вобразы. Галоўныя героі "Піквікскіх запісак" — чатыры бяскрыўдныя і добрасардэчныя джэнтльмены-дзівакі: містэр Піквік — старшыня клуба і яго сябры — Тапмен, Снодграс і Уінкль. Яны падарожнічаюць па Англіі і нязменна патрапляюць у камічныя сітуацыі, што абуджае пачуццё гумару і выклікае смех. Так, падчас вайсковых манеўраў яны аказваюцца пад абстрэлам з двух бакоў і мусяць панічна ўцякаць. Героі недарэчна трапляюць у турму за даўгі. Прагулка за горад у карэце скончылася для іх вялікім канфузам.

"Піквікскія запіскі" маюць выразную сатырычную скіраванасць. На старонках твора аўтар з'едліва высмейвае сацыяльны эгаізм арыстакратаў, паказвае празмерную ганарлівасць прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя, якія, прыкладам, залішне цешацца з-за прыналежнасці да старадаўніх родаў. Пісьменнік відавочна выступае за класавае партнёрства, ён не прымае сацыяльнай каставасці, жорсткай іерархіі англійскага грамадства, якія адмоўна ўплывалі на маральны стан у краіне. Ч. Дыкенс паказвае, як адносіны паміж людзьмі часам даходзілі да абсурду: "Партовыя чыноўнікі вышэйшага рангу не жадаюць ведаць чыноўнікаў ніжэйшага рангу; чыноўнікі нізкага рангу не жадаюць ведаць дробных памешчыкаў; дробныя памешчыкі не жадаюць ведаць купцоў, а начальнік порта наогул не жадае нікога ведаць".

Ч. Дыкенс не абмінае адлюстравання трагічных праяваў жыцця, паказвае зламаныя чалавечыя лёсы. Так, ён раскрывае пакуты няшчаснага клоўна, які балюча ўспрымае несправядлівасць жыцця і трагічна памірае ў нястачы. Пісьменнік выступае на баку творчай асобы, якая не ў стане пераадолець складаныя жыццёвыя абставіны.

Мікранавела пра катаржніка Джона Эдмандса — рэалістычны аповед пра тыранію, жорсткасць і дзікунства ў англійскай сям'і, вынікам чаго непазбежна з'яўляюцца зламаныя лёсы дзяцей. Назіранні пісьменніка за рэаліямі жыцця дазволілі яму сфармуляваць важную сентэнцыю: выпрабаванні і пакуты прыводзяць чалавека да пакаяння, робяць яго пакорлівым і ціхмяным.

На старонках твора, аднак, дамінуюць гумар, жарты і клаунада, у ім шмат кур'ёзных гісторый, анекдотаў, фальклору і показак.

"Піквікскія запіскі" прынеслі Ч. Дыкенсу шырокую папулярнасць і славу, а галоўны герой твора — містэр Піквік стаўся найбольш яркім камічным персанажам англійскай літаратуры.

Значнае мастацкае дасягненне Ч. Дыкенса — раман "Олівер Твіст" (1838). У аснове твора — прыгодніцкі сюжэт. Юнак Олівер — сын Эдвіна Ліфорда і Агнес Флемінг — пасля смерці бацькоў падманным шляхам пазбаўлены законнай спадчыны, з-за чаго ён церпіць неверагодныя пакуты. Сірату выхоўвае царкоўны прыход, хлопчык жыве ў нястачы, заўсёды паўталодны і недагледжаны, яго рэгулярна зневажаюць і збіваюць. Жыццё становіцца для яго невыносным, і ў дзесяцігадовым узросце смерць здаецца падлетку найлепшым выйсцем: "Калі ён забраўся на свой вузкі ложак, яму захацелася, каб гэты ложак стаў труной, а яго соннага, калі ён ціха спіць, закапалі б на могілках".

На думку Ч. Дыкенса, гаротны стан сіротаў — праява бездухоўнасці і дэградавання грамадства. Голас пісьменніка-гуманіста на баку абяздоленых дзяцей, чый пакутлівы лёс не хвалюе заможных і багатых. Аўтар адкрыта пратэстуе і гнеўна абураецца: "Хацеў бы я, каб які-небудзь адкормлены філосаф, у чыім страўніку мяса і віно ператвараюцца ў жоўць, чыя кроў халодная, нібы лёд, а сэрца жалезнае, — хацеў бы я, каб ён паглядзеў, як Олівер Твіст накінуўся на прысмакі, якімі б пагрэбаваў нават сабака!"

На старонках рамана Ч. Дыкенс выступае як сацыяльны пісьменнік. Ён выкрывае заганы капіталістычнага грамадства, празмерны індывідуалізм і эгаізм, фарысейства і двурушніцтва. Пісьменнік асабліва крытыкуе фармалізм судовай сістэмы Англіі, якая жорстка і бесцырымонна распраўляецца з чалавечымі лёсамі. Паводле яго слоў, у судовых залах адбываюцца страшэнныя трагедыі, пра якія мала хто здагадваецца: "У гэтых сценах штодня разыгрываюцца такія фантастычныя сцэны, што анёлы маглі б выплакаць сабе вочы. Але ўсё схавана ад грамадства, толькі зрэдчас штосьці трапляе ў друк".

Ч. Дыкенс выказвае занепакоенасць гаротным становішчам бедных людзей. Пісьменнік абураецца грэблівым стаўленнем грамадства да простага чалавека. У рамане без прыхарошвання паказаны найбяднейшыя кварталы Лондана, убогі стан жылля працаўнікоў порта, паўсюднае жабрацтва і галеча. Аўтар стварыў натуралістычныя малюнкі недагледжанага горада: "У сцёкавых каналах вада была затхлая і брудная. Нават пацукі, якія валяліся ў гэтай гнілі, былі жахліва худымі". Пісьменнік намаляваў каларытную сцэну пахавання няшчаснай жанчыны, якая памерла ад голаду. Паводле высновы аўтара, пры такім становішчы рэчаў Англія не можа лічыцца краінай законнасці і справядлівасці. Пісьменнік з сарказмам ускліквае: "Якая яркая ілюстрацыя міласэрных законаў Англіі! Яны дазваляюць беднякам спаць".

НаватарстваЧ. Дыкенса як пісьменніка выявілася ў раскрыцці свету злачынцаў. Аўтар паказвае звычкі і норавы крымінальнікаў — забойцаў, злодзеяў, махляроў. Пісьменнік асуджае антызаконную дзейнасць "адкідаў грамадства", але пры гэтым выказвае цвёрдую веру ў магчымасць выпраўлення нават самых закаранелых злачынцаў, бо ў іх сэрцах жыве прага высакароднасці, адданасці, шчырасці. Аўтар падкрэслівае трагедыю людзей, пазбаўленых усялякай веры і надзеі на іншы, больш спагадлівы лёс.

На старонках твора Ч. Дыкенс уздымае праблему пакарання за ўчыненыя злачынствы. На думку пісьменніка, найвялікшае пакаранне чалавеку за забойства знаходзіцца ў ім самім. Калі Сайкс забівае Нэнсі, ён церпіць невыносныя пакуты, яго паўсюль пераследуюць наўі, а сэрца разрываецца ад болю. Аўтар небеспадстаўна зазначае: "Няхай ніхто не кажа пра забойцаў, што яны нібыта пазбеглі суда, а наўі заснулі. Адна бясконцая хвіліна іх пакутлівага жаху вартая дзесяці пакутлівых смерцяў".

Ч. Дыкенс выступае як тонкі псіхолаг, знаўца неспазнаных глыбіняў чалавечай душы. Так, ён з неверагоднай паўнатой перадае пачуцці чалавека, прысуджанага да смерці праз павешанне. Забойца Феджын знаходзіцца ў камеры і перажывае неверагодныя жахі апошняй ночы перад выкананнем прысуду. Яму здавалася, "быццам ён сядзіць у склепе, засцеленым мёртвымі целамі".

У рэчышчы крытычнага рэалізму напісаны раманэсэ Ч. Дыкенса "Марцін Чэзлвіт" (1844), які стаўся вынікам паездкі пісьменніка ў ЗША ў 1842 г.

Ч. Дыкенс бадай першым у літаратуры надзвычай востра раскрытыкаваў заганы амерыканскага грамадства. Пісьменнік паказаў прадажнасць амерыканскай прэсы, панаванне татальнага шулерства і падману ў краіне. Ён асудзіў рабства і абсалютны цынізм палітычных груповак. Ч. Дыкенс не прымае культу долара, панаванне над усім грамадствам меркантылізму: "Усе іх клопаты, надзеі, радасці, прыхільнасці, дабрачыннасці і сяброўскія сувязі, здавалася, пераплаўленыя ў долары. Што б не трапляла ў кацёл іх гутаркі, яны настойліва падсыпалі ў гэтую кашу долары. Людзей ацэньвалі на долары, мералі доларамі; жыццё прадавалася з аўкцыёна, ацэньвалася і ішло з малатка за долары. Пасля доларaў больш за ўсё шановаліся справы, якія дапамагалі іх здабыць".

Псіхалогія ўзаемадачыненняў у капіталістычным грамадстве, бязмежны эгаізм бізнесменаў Ч. Дыкенс раскрыў у рамане "Домбі і сын" (1848). Пісьменнік паказаў характар паводзінаў капіталістаў, іх каштоўнасці і жыццёвыя арыенціры, падпарадкаваныя выключна клопатам пра фірму і ўласную карысць.

Даніну эстэтыцы і філасофіі сентыменталізму Ч. Дыкенс аддаў у пачатку 40-х гадоў XIX ст. У трох невялікіх эпічных творах — "Калядная песня ў прозе" (1843), "Званы" (1844) і "Конік на печцы" (1845) пісьменнік у мастацкай форме выказаў спадзяванне на выпраўленне чэрствых, прагных, пазбаўленых пачуццёвасці камерсантаў і бізнесменаў. На думку аўтара, у душы кожнага чалавека жывуць светлыя ўспаміны дзяцінства, высокія памкненні юнацтва, надзеі і спадзяванні, народжаныя першым каханнем. Для выпраўлення грамадства кожны чалавек мусіць здзяйсняць безліч добрых учынкаў, падсумоўвае Ч.Дыкенс: "Бо нават стагоддзі пакаяння не кампенсуюць страчаную на зямлі магчымасць учыніць добрую справу". Вуснамі прывіду Марлі, які звяртаецца да Скруджа, пісьменнік пералічвае добрыя ўчынкі — клопат пра бліжняга, міласэрнасць, спачуванне, ахвярнасць, дбанне пра грамадскую карысць.

Даніну эстэтыцы і філасофіі сентыменталізму Ч. Дыкенс аддаў у пачатку 40-х гадоў XIX ст. У трох невялікіх эпічных творах — "Калядная песня ў прозе" (1843), "Званы" (1844) і "Конік на печцы" (1845) пісьменнік у мастацкай форме выказаў спадзяванне на выпраўленне чэрствых, прагных, пазбаўленых пачуццёвасці камерсантаў і бізнесменаў. На думку аўтара, у душы кожнага чалавека жывуць светлыя ўспаміны дзяцінства, высокія памкненні юнацтва, надзеі і спадзяванні, народжаныя першым каханнем. Для выпраўлення грамадства кожны чалавек мусіць здзяйсняць безліч добрых учынкаў, падсумоўвае Ч. Дыкенс.

Ч. Дыкенс рэзка асуджае мальтузіянства — тэорыю аб празмернай колькасці людзей на планеце і неабходнасці рэгулярнага і прымусовага змяншэння насельніцтва.

У рамане "Цяжкія часы" (1854) Ч. Дыкенс звярнуўся да тэмы класавага змагання паміж капіталістамі і пралетарыятам. Пісьменнік выкрывае механічную адукацыйную сістэму буржуазнага грамадства, якая скіравана на прагматызм, дакладны разлік, пазбаўленне асобы духоўнасці і чалавечнасці. Аўтар паказвае, як машынная вытворчасць нівеліруе і забруджвае горад, робіць яго змрочным, аднастайным і шэрым, што адмоўна адбіваецца на жыцці людзей.

Вяршыннай праявай творчасці Ч.Дыкенса з'яўляецца раман "Вялікія чаканні" (1861), у якім найбольш поўна ўвасобіўся жыццёвы досвед і літаратурнае майстэрства пісьменніка. Раман прасякнуты глыбокім болем і перажываннямі за чалавека з нізоў.

Галоўны герой рамана — юнак Піп, ад імя якога вядзецца аповед, — марыць пра шчасце і сапраўднае каханне. Але яго светлыя мары і вялікія спадзяванні разбіваюцца аб жорсткія рэаліі жыцця. Ужо ў дзяцінстве ён сутыкаецца з сацыяльнай несправядлівасцю. Зняважаны дзяўчынкай-арыстакраткай міс Эстэлай, Піп перажывае глыбокі стрэс і роспач, душэўны боль і крыўду: "Я плакаў, біў нагамі аб сцяну, рваў сябе за валасы; крыўда мая была такая горкая, боль, які я не ўмею назваць, такі востры, што я адчуваў непераможную патрэбу ўчыніць сабе які-небудзь вонкавы фізічны боль, каб заглушыць крыўду".

Галоўнаму герою ў нейкі момант жыцця пашанцавала. Катаржнік Авель Мэгвіч, якому хлопчык некалі паспачуваў і накарміў, калі той уцякаў з турмы, адпісвае яму значныя фінасавыя сродкі. Піп атрымлівае доступ у вышэйшы свет, робіцца джэнтльменам. Але ўсё праз нейкі час вяртаецца назад: апякун зноў трапляе за краты, а юнак застаецца без грошай і мусіць ехаць назад у тую ж вёску, якую ён некалі пакінуў. Глыбокае каханне Піпа да арыстакраткі, чароўнай дзяўчыны Эстэлы, разбіваецца аб сацыяльны бар'ер. На думку Ч. Дыкенса, нават шчаслівы выпадак не дазваляе чалавеку з нізоў трывала перайсці ў вышэйшае саслоўе, заняць там належнае месца. Спробы простых людзей узвысіцца заканчваюцца трагічна, прыносяць пакуты і нясцерпны боль.

У рамане "Вялікія чаканні" Ч. Дыкенс стварыў прывабны вобраз чалавека працы — каваля Джо Гарджары. Пісьменнік малюе яго з падкрэсленай сімпатыяй і замілаваннем. Джо Гарджары — працавіты, сціплы і надзвычай лагодны чалавек, які жыве ў суладдзі з сабой, дасканала валодае сваім рамяством, якое прыносіць яму асалоду і задавальненне. Герой не імкнецца змяніць свой сацыяльны і грамадскі статус, лічыць гэта немэтазгодным і непатрэбным. Ён адрозніваецца высакароднасцю, мае добрае сэрца і, паводле азначэння аўтара: "Яго нязграбнае адзенне не перашкаджала яму быць чалавекам".

Як бачна, на старонках сваіх твораў Ч. Дыкенс смела выкрываў грамадскія заганы, абараняў несправядліва пакрыўджаных і зняважаных. Мастак прагнуў палепшэння сацыяльных дачыненняў, імкнуўся прынесці максімальную карысць грамадству. Яго крытыка заўсёды канструктыўная і стваральная, накіраваная на ўдасканаленне маралі, дзяржаўных інстытутаў і адносін паміж людзьмі.

Іван САВЕРЧАНКА

Супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы смуткуюць з прычыны смерці Уладзіслава Юльянавіча РАМАНОЎСКАГА, пляменніка і хрэсніка Янкі Купалы, і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

Уладзіслаў Юльянавіч Раманоўскі, сын роднай сястры Янкі Купалы Леакадзіі Дамінікаўны, выхоўваўся ў сям'і паэта, а з 1927 года жыў у яго доме ў Мінску (вул. Кастрычніцкая, 40) да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Уладзіслаў Юльянавіч Раманоўскі часта прымаў удзел у музейных творчых сустрэчах, выступаў з цікавымі ўспамінамі пра Янку Купалу, якога ведаў і бачыў у паўсядзённым жыцці, а светлы вобраз паэта і чалавека назаўсёды захаваў у сваёй душы.

Колішні палац Тышкевічаў у Валожыне.

Капліца-пахавальня ў Пральніках.

Спаса-Прэабражэнская царква ў Ракаве.

Надышоў час летніх вакацыяў. Хтосьці паспеў ужо з'ездзіць на тыдзень-другі на мора. У кагосьці адпачынак яшчэ наперадзе. Выехаць за мяжу заўсёды цікава. Але трэба пазнаваць і сваю краіну. Дастаткова раз на месяц выязджаць у вандроўкі, каб за два-тры гады ўбачыць усю Беларусь. Наш карэспандэнт Сяргей Макарэвіч будзе знаёміць чытачоў "ЛіМа" з экскурсійнымі маршрутамі аднаго-двух дзён. Сёння гэта Мінск — Ракаў — Івянец — Валожын — Мінск.

Зямля валожынская

Сталіца кантрабандыстаў

Дарога да Ракава зойме не больш як паўгадзіны. Але спяшацца не трэба. Па шашы Мінск — Валожын, не даязджаючы Ракава, з правага боку ўбачыце ледавіковы кангламерат і пясчанік. Каб разгледзець яго, неабавязкова выходзіць з машыны — дастаткова прыцішыць хаду аўтамабіля.

Ракаў згадваецца ў гістарычных крыніцах з XV стагоддзя. У часы другой Рэчы Паспалітай мястэчка лічылася сталіцай кантрабандыстаў. Побач праходзіла польска-савецкая мяжа. Кантрабандысты наладзілі каналы пераправы рэчаў з захаду на ўсход і наадварот. У мястэчку размяшчалася больш як 100 крам і 96 рэстарацый. А ў карты гулялі выключна на золата. Міжваенны Ракаў натхніў нашых суайчыннікаў Міхала Анемпадыстава і Лявона Вольскага на стварэнне п'есы "Народны альбом". Разам з іншымі музыкамі яны запісалі і аднайменны альбом. У песнях вымалеваны вобразы кантрабандыстаў, шпіёнаў Лёлека і Болека.

Калі пачалася вайна, нямецкія ўлады загадалі жыхарам Ракава здаць усю сваю маёмасць. Местачкоўцы пачалі тады запайваць свае скарбы ў медныя бочкі і закопваць. Жыхар сённяшняга Ракава мастак Фелікс Янушкевіч адкапаў тры такія бочкі. Былі там прыватныя рэчы. А колькі яшчэ бочак схавана ў зямлі?.. Спадар Янушкевіч, дарэчы, стварыў тут першы ў Беларусі прыватны музей — мастацкую галерэю.

Што датычыць матэрыяльнай спадчыны, то паглядзець у мястэчку ёсць на што. Касцёл Божай Маці Ружанцовай і св. Дамініка (1906), Спаса-Прэабражэнская царква (1793). У касцёле ёсць арган. Можна патрапіць у той час, калі на ім займаюцца дзяўчынкі. Побач з касцёлам знаходзіцца будынак ганчарні. Мясцовыя жыхары кажуць, што гэта была лядоўня. На ўскрайку Ракава размяшчаецца гарадзішча. У мястэчку ёсць сучасны пратэстанцкі храм, руіны паштовай станцыі, на могілках каталіцкая капліца св. Ганны (1862), Крыжаўзвіжанская капліца каля крыніцы. Вада з крыніцы, як сведчаць людзі, дапамагае пры хваробах вачэй.

Капліца-пахавальня

З Ракава параіў бы выязджаць на дарогу ў кірунку вёсак Пераджэры і Галімцы. За імі знаходзяцца Пральнікі. Тут варта наведаць мясцовыя могілкі. На іх размяшчаецца капліца-пахавальня, якая цяпер прыстасавана пад царкву св. Мікалая. Пабудавана яна ў сярэдзіне XIX стагоддзя як каталіцкая. Са зменай улады яна то перадавалася праваслаўным, то зноў вярталася каталікам, а пэўны час і зусім не дзейнічала. Капліца цікавая сваёй круглай формай. Таўшчыня яе сцен дасягае 1,5 метра. Помнік архітэктуры знаходзіцца ў дрэнным стане. Пра намаганні яго рэстаўраваць сведчаць рыштаванні ўздоўж сцяны. Але гэта, відаць, спробы мясцовага насельніцтва аднавіць святыню. І іх недастаткова. Без дапамогі дзяржавы не абысціся. Наўрад ці знойдуцца сродкі ў раённым бюджэце. Застаецца чакаць...

Патрапіць у сярэдзіну капліцы не атрымаецца, бо яна замкнёна, і адчыняецца, відаць, не часта. Але ў яе падмурку маецца некалькі акенцаў. Калі не пабаіцеся, можна праз іх спусціцца. Там размяшчаўся склеп. Пра гэта сведчаць нішы для трунаў у сценах. Нішы цяпер пустыя. Выдае на тое, што пахаванне адсюль перанеслі не так даўно. Склеп уяўляе сабой круглую залу з цэнтральным апорным стаўпом. У самой вёсцы можна паглядзець таксама пабудовы канца XIX—пачатку XX стагоддзя. Часу гэта шмат не зойме.

Касцёл св. Аляксея ў Івянцы. Помнік Яну Паўлу II.

Шматканфесійны Івянец

Далей кіруемся на Раднікі, а адтуль — на Івянец, які ўпершыню згадваецца яшчэ ў другой палове XV стагоддзя. Гэты гарадскі пасёлак здаўна вядомы сваімі ганчарамі. Зямля тут не надта ўрадлівая, таму людзі займаліся рамяством. Між іншым, неўрадлівасць глебы, відаць, і стрымала савецкіх "вучоных", каб не высекчы Налібоцкую пушчу, што зусім побач.

Калі ў 1939 годзе прыйшлі Саветы, мясцовых ганчароў прымусова сагналі ў арцель. На працягу наступных дзесяцігоддзяў майстры перасталі займацца ганчарствам. Затым быў створаны камбінат, на якім было не да творчасці. Патрабавалася манатонная праца. Але ў 1990-х знайшліся ганчары, якія змаглі адрадзіць колішнія традыцыі. І сёння яны працягваюцца. Працуе таксама завод мастацкай керамікі.

Раней у Івянцы размяшчаўся музей Фелікса Дзяржынскага. За 15 кіламетраў знаходзіцца вёска Дзяржынава, дзе нарадзіўся і правёў гады дзяцінства "жалезны" Фелікс. Местачкоўцы жартуюць: "Хай бы ён і пражыў усё жыццё ў Дзяржынаве". Маўляў, не было б столькі ахвяр бальшавіцкага тэрору. Музей сёння размяшчаецца непасрэдна на малой радзіме Дзяржынскага. А будынак у Івянцы аддалі пад музей традыцыйнай культуры. Побач знаходзіцца майстэрня ганчароў і ткачоў.

У Івянцы размяшчалася сядзіба Плеваковых (пачатак XX ст.). Але яна згарэла ўжо ў наш час. Пра яе існаванне нагадваюць толькі руіны. Але захаваліся свіран, ператвораны ў карчму, стайня, у якой дзейнічае майстэрня разьбяроў па дрэве і кузня.

Стаяць у Івянцы і два касцёлы. Адзін у гонар святога Аляксея размяшчаецца на могілках. Побач з ім — і драўляная капліца. Другі касцёл — Міхаіла Арханёла. Непадалёк ад яго захаваўся будынак кляштара францысканцаў, якія тут жывуць і сёння. Абодва касцёлы дзеючыя. Нязвыкла ў такім невялікім населеным пункце бачыць адразу дзве святыні адной канфесіі. Але тут моцны польскі асяродак — ёсць аддзяленне Саюза палякаў Беларусі.

Маецца і царква Еўфрасінні Полацкай. Захавалася і драўляная сінагога пачатку XX ст. Да нядаўняга часу ў ёй размяшчаўся Дом культуры. Яўрэі жывуць у пасёлку і сёння. Але іх колькасць невялікая. Захаваліся старыя яўрэйскія могілкі. Каб іх упарадкаваць. прыязджалі валанцёры з Амерыкі.

Па ўскрайку пушчы

З Івянца кіруемся ў вёску Сівіца, а адтуль — на Даўбені. Кавалак дарогі паміж вёскамі праходзіць па ўскрайку Налібоцкай пушчы. Зразумела, пушча вымагае асобнага дня для знаёмства. Але і так можна спыніцца і прайсціся паміж дрэў. Прыемна падыхаць лясным паветрам. Не кожны дзень жыхар вялікага горада, тым больш сталіцы, можа сабе дазволіць такую раскошу.

За кіламетр да ўезду ў Валожын вы проста "выскокваеце" на могілкі, пасярод якіх на ўзгорку месціцца каменная капліца. Капліца паўстала тут у сярэдзіне XIX стагоддзя дзякуючы намаганням графа Тышкевіча. Неаднаразова яна перадавалася праваслаўнаму насельніцтву. Але сёння ёй вернуты першапачатковы статус каталіцкай святыні. Могілкі моцна зарослыя. Не палянуйцеся і знайдзіце сцяжынку да капліцы. З узгорка адкрываецца прыгожы краявід. Што б ні казалі, а і могілкі з'яўляюцца месцам, вартым наведвання не толькі з сумных нагод.

Багатая гісторыя горада

Далей рушым у Валожын, вядомы аж з XIV стагоддзя. Гэта горад з багатай гісторыяй. Тут агляд варта пачаць з цэнтральнай плошчы. На ёй размяшчаецца касцёл святога Юзафа (1816). Каля яго ўсталяваны помнік Папу рымскаму Яну Паўлу II.

Да сёння захаваўся палац (1803—1806) графа Тышкевіча, колішняга ўладальніка Валожына. У будынку размяшчаецца штаб вайсковай часці. Натуральна, падысці да яго не атрымаецца. Але разгледзець праз агароджу ніхто не забароніць. Насупраць былога палаца ўзвышаецца аналагічны палац. Тут месціцца раённае аддзяленне міліцыі і ДАІ. Побач з палацамі знаходзіцца колішняя аранжарэя. Па іншай версіі, будынак аранжарэі не захаваўся. А ў 1926 годзе на яе месцы быў пабудаваны адміністрацыйны будынак корпуса памежнай варты. Тут цяпер знаходзяцца рэдакцыя раённай газеты "Працоўная слава", ваенны камісарыят, натарыяльная кантора. Захаваліся таксама флігель, службовы корпус, парк.

Таксама на плошчы знаходзіцца ешыбот — яўрэйскае духоўнае вучылішча, у якім вялася падрыхтоўка равінаў. Заснаваны ешыбот у 1803 годзе. Будынак паўстаў праз тры гады. Дзякуючы аўтарытэту выпускнікоў гэтай установы, Валожын быў прызнаны цэнтрам іудаізму ў Расійскай імперыі. Ешыбот быў самым вялікім на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Расіі. Сцвярджаюць, што вучыцца сюды прыязджалі яўрэі з Еўропы, Амерыкі і нават Японіі. Зачынена ўстанова была ўладамі ў 1896 годзе, але працавала неафіцыйна да 1930-х гадоў. Пасля Другой сусветнай вайны ў будынку размяшчаўся рэстаран, пазней — кулінарыя. У 2000 будынак перадалі Іудзейскаму рэлігійнаму таварыству, якое здолела адрэстаўраваць помнік. Захаваліся ў Валожыне і старыя яўрэйскія могілкі, хаваць на якіх перасталі яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Побач з плошчай знаходзіцца і царква святых Канстанціна і Алены (асвечана ў 1866).

З Валожына скіроўваемся па шашы на Мінск. Па дарозе варта збочыць у вёску Пяршаі. Агляд касцёла святога Юр'я (1933) прынясе вам задавальненне. У вёсцы захаваліся таксама рэшткі пабудоў XIX стагоддзя.

Праз гадзіну вы будзеце ў Мінску.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

Фота аўтара

Ігар БАБКОЎ. Нарадзіўся ў Гомелі ў 1964 годзе. Скончыў аддзяленне філасофіі БДУ (1986). Працаваў навуковым супрацоўнікам, вартаўніком, журналістам, у аддзеле гісторыі і тэорыі культуры Скарынаўскага цэнтра, займаўся педагагічнай і выдавецкай (часопіс "Фрагменты" і бібліятэчка пры ім) дзейнасцю.

З уласнымі вершамі і перакладамі з англійскай, нямецкай і старакітайскай моў выступаў у часопісах "Маладосць", "Беларусь", "Полымя", "Крыніца", "ARCHE" і інш. Выдаў зборнікі вершаў "Solus Rex" (1992), "Герой вайны за празрыстасць" (1998) і кнігу філасофскіх эсэ "Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнні ру(і)наў" (2005).

Зусім нядаўна выдаў зборнік выбраных вершаў "ЗАСЫНАЦЬ, ПРАЧЫНАЦЦА, СЛУХАЦЬ ГАЛАСЫ РЫБ" (Мінск, выдавец І. П. Логвінаў, 2009, у аўтарскай рэдакцыі, 118 стар., 300 асоб.)

"Стварыць тое, што не цікавіць ніводнага чалавека. У мяне гэта амаль атрымалася."

Эміль ЧАРАН

Ігар Бабкоў добра вядомы ў вузкім коле беларускіх літаратараў ды інтэлектуалаў. Аднак прачытаць нешта пэўнае і сур'ёзнае пра яго паэтычную творчасць — задача няпростая. Я маю на ўвазе канкрэтную крытычную гаворку, як тое выдатна зрабіў у сваёй рэцэнзіі на яго філасофскую кнігу "паэтычных эсэ" "Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнне ру(і)наў" Ю. Сапажкоў. Бо вось жа перачытваю матэрыялы да яго постаці "ТЫ" ў часопісе "Крыніца" (№ 1, 1997) і амаль у кожнага аўтара натыкаюся на такія вось і падобныя да іх папярэджанні (*"я свядома адсланяюся ад аналізу зместаў і тэмаў філасофскай, паэтычнай і культурніцкай працы Ігара Бабкова"*, "я нездарма пішу пра Бабкова толькі ў агульным раскладзе, не кранаючы пэўных творчых наробкаў", *"зразумеўшы сёе-тое з таго, што напісана ў гэтай кніжцы, не бяру на сябе ролю аб'ектыўнага рэцэнзента"*, "ацэньваючы мадэрнасць паэзіі Ігара Бабкова, мы застаёмся каля недапітага кубка кавы")...

Гэта, па сутнасці, і навяло мяне на адзін з "горкіх сілагізмаў" любімага Бабковым (і мной, і гэта не адзінае супадзенне ў прыхільнасцях) Эміля Чарана, які я і прышпіліў да "кулуараў". Тым больш, што ў адной са сваіх эпіфаній напрыканцы зборніка Бабкоў піша (пэўна, сыходзячы з уласнага вопыту), што *"нават адзін чытач — гэта замнога"*. Мімаходзь зазначу, што (відаць, з выдавецкай неабходнасці), наклад гэтай кніжкі складае ўсё ж 300 асобнікаў.

Вядома, у згаданай "Крыніцы" былі і цікавыя, на мой погляд, слушныя і трапныя выказванні адносна яго творчасці, у тым ліку і паэтычнай. Да прыкладу, В. Акудовіч лічыў, што напрацоўкі аўтара (па тым часе) у галіне культуралогіі *"**важаць** ніяк не мені, а бадай і больш, чым паэтычны зборнік* ("Solus Rex". — **ЛеГАЛ**)". Праўда, (у той жа іх гутарцы) І. Бабкоў спрабаваў тлумачыць сваю "паэтычную залежнасць" тым, што *"быў выхаваны на традыцыі нямецкага рамантызму — метафізіцы — экспрэсіянізму"*, а Хайдэгер яго *"пераканаў", што "быць філосафам — гэта значыць быць паэтам"*. Праўда, заставалася незразумелым, што значыць быць паэтам", бо *" ёсць праблема вершаў і здарэння паэзіі"*, а паэзія для яго *" не зводзіцца да верша, які ёсць хутчэй знакам, сцежкай да нейкай сітуацыі альбо нейкага стану"*, **і** да таго ж *"ніхто не ведае, што з гэтага будзе. Зусім як у маім улюбёным дзэнскім выслоўі: "На справдешным шляху няма ходжаных сцежак. Хто ідзе па ім — самотны і ў небяспецы"*.

З гэтымі туманнымі "намацваннямі сэнсу мастацтва", бадай, нельга не пагадзіцца... будучы ў сітуацыі Бабкова. Мне здаецца, спадар Ігар зразумеў сваю ранейшую памылку, нарэшце ўбачыўшы ў чытачу роўню сабе-творцу, хоць поўнай паразумеласці і не атрымалася. А такой і не магло быць, бо кожны паасобны верш Бабкова зводзіць кожнага канкрэтнага чытача па сваіх розных "сцежках" і таемнасцях. Ці не таму аўтар гэтым разам дадаў да "выбраных вершаў" і два раздзелы "вытлумачэнняў" паэзіі.

Толькі па прачытанні кніжкі я зразумеў, што яе трэба чытаць наадварот — ад канца да пачатку. Спадзяюся, што такая мая заўвага будзе карыснай для тых, хто яшчэ не паспеў прачытаць зборнік І. Бабкова.

У раздзеле "Месцы паэзіі" ёсць проста цудоўныя *тонкія* развагі пра сутнасць паэзіі. Ну вось да прыкладу: *"Паэзія: месца, дзе з намі здараецца мова"*, альбо *"Паэзія: мілы і непатрэбны дарунак. Ахвяра."*

Хіба вось гэтае трохрадкоўе не ёсць такім:

"Дождж, маланкі, але
Маеш заўсёды прытулак
У маім сэрцы"



Напраўду, вельмі файны, ахвярны верш. Толькі вось коскі ў ім чамусьці ёсць, а кропкі няма... Памятаецца, яшчэ У. Конан у сваім артыкуле пра вершы І. Бабкова пісаў, што *"паэт звычайна той, каго яшчэ ў старадаўняй Русі назвалі "блажэннымі"*, і што на яго *"вопыт успрымання паэтычнага мастацтва, постмадэрністы — людзі занадта разумныя, празмерна сур'ёзныя і заклапочаныя"*, таму няварта звяртаць асаблівай увагі і на *"адсунуты" сінтаксіс"* нашага аўтара.

Здараюцца ў вершах і іншыя "адхіленні" ад правапісу і граматыкі. Ну хоць бы ў гэтым радку:

"Не ўлятай, каханая!"

(Ад рускага "не улетай", лепш было б "не адлятай". Я разумею, абапіраючыся на методыку аўтара, яму важней было не разбурыць аўру верша, чым не дапусціць граматычнай памылкі...) Зрэшты, паэт "тлумачыць" гэта вершам папярэднім (вы не забыліся, мы чытаем ад адваротнага...)

"І гэтыя словы, якія
Паўтараеш як мантру
сонечна і салодка:
Я ў цябе закахаўся."

Альбо яшчэ ў адным:

"Такая спакуса — блытаць словы, рытмы, адзенне..."

Нешта падобнае, відаць, меў на ўвазе і Ю. Пацюпа, калі пісаў, што *"толькі ў закрытым памяшканні ў трывожным мораку і ў глыбокай цішыні належным чынам можна пачуць Бабкова, там, дзе аўтара і слухачоў задзіночваюць не апладысменты, а містычныя паўзы."*

Але ўжо сёння адмысловы мысляр Бабкоў папярэджвае Бабкова-паэта: *"Зрэшты, вар'яцець канчаткова не варта. Лепей — да пэўнай мяжы, у меру.*

Мера мусіць быць абавязкова, бо менавіта мера, рытм, музыка — тое, што дазваляе хаосу прымаць форму паэзіі."

Аднак міжвольна так хочацца *"выйсці на той бок свету"*, дзе не так важна напісанне, як думанне і вычуванне. Ці не таму ў Бабкова можна прачытаць і такое: *"плешчыца"* — замест плешчацца, *"б'е ў ядвабы"* — у сэнсе пераліваецца рознымі колерамі і танамі (ноч), *"непрытомны бёг"* — замест бег, *"адгарнуць фіранку"* — а не адсунуць...

Зрэшты такія несвядома, але з ведама аўтара дапушчаныя, моўныя хібы не засланяюць саму эфемерную прыгажосць яго паэтычнага дойлідства. І ўвогуле, класічны крытычны падыход для разгляду вершаў Бабкова абсалютна не падыходзіць, бо, як ён сам тлумачыць: *"Паэзія — наркотык, які дазваляе забыцца і не бачыць яго крывую кульцю."*

Я, можа, тут і занадта шмат цытую Бабкова замест таго, каб пісаць пра яго, але, паверце, я не напішу так выбітна, як ён, таму "адкрываю" вам менавіта яго дзеля вашага ж чытацкага задавальнення. Скажам, ПАЭЗІЯ, на аўтарскае адцягнутае разуменне, гэта *"паляванне на словы. Танец. Асалода ад прамаўлення. Шаманства"*, тое самае як *"выйсці ў прастору, дзе ўжо толькі мова гаворыць"*, каб заплюшчыўшы вочы, *"пачаць бачыць — усярэдзіну, у глыбіню слова"* ...

Паэзія Бабкова месціцца ў герметычна закрытай душы аўтара (заўжды: спакойнага і нешматслоўнага:

"Пражыць сваё жыццё ціха
і незаўважна.
Назаўсёды знікнуць — сярод бытнага. Сярод кветак і сноў."), нам даступны толькі тыя яе "месцы", што вымкнулі вонкі з прычыны яе "непрапісанасці". Як і гэты, па сутнасці адзін з праграмных вершаў:

"На самым скраі: самоты,
адчаю, сну
На самым-самым скраі:
сярод аблокаў
Слодыч віна, смага, тонкія вусны
Танец апалай лістоты,
Твой пацалунак
Час аддаваць:
восень расчыніць вакно
Убачыш: сонца, мора,
канец падарожжа
За далягляда:
пад ветразем светлы жагляр
Плыве па небе, —
туды, дзе ўсё пачалося"

Гэты мройлівы сон-паўтор доўжыцца цягам усёй кнігі, як адзін бясконцы верш жыцця-небыцця — паэзія вечнасці... Асабліва гэта *кранае* ў звязку з такім яго вызначэннем паэзіі, ад якой *"застаюцца матылькі словаў, што прысніліся калісьці даўно аднаму вельмі старому кітайцу і цяпер порхаюць са сну ў сон, ад эпохі да эпохі."*

Няпэўнае светаадчуванне, як вось у гэтых строфах, ёсць спробай акрэсліць самога творцу гэтак жа як і яго паэзію — трымценнем няіснага, няспраўджанасці сну:

"гэтыя зажохлыя датыкненні,
шурпатыя эпіфаніі,
цёмнае шчасце
скамянелае святло
безнадзейнае трыванне
самотная вера"

Таму, успамінаючы пра яго *выхаванне* дзесяцігадовай даўнасці "на традыцыі нямецкага рамантызму — метафізіцы — экспрэсіянізму", сённяшняе яго захапленне ўспрымаеш з разуменнем. Бо, як мне здаецца, зноў жа абсалютна шчыра, але без пэўнасці Бабкоў кажа: *"Што такое маё Я — я не ведаю. Але той вобраз мяне, за прысутнасцю якога ў культуры я б назіраў з асалодай — гэта крыху звар'яцелы будыст з глыбокай цікавасцю да Лі Бо, Чарана, Хайдэгера ды Тавянскага"*. Усходнія матывы ў яго творчасці праяўляюцца асабліва: *"смерць — забытая казка"* альбо: *"Заплюшчы вочы, ідзі на дно Гэты боль — асалода"* (абсалютна будысцкія матывы).

Вершамі (паэзіяй найперш) І. Бабкова можна ўнутрана самотнічаць, суцяшацца, захапляцца, супакойвацца, мроіць, але нельга самасцвярджацца, бунтаваць, выстройваць прагматычныя перспектывы, расквечвацца вянкамі эгаістычных ілюзій... У вершы, пазначаным як ліст Алесю Разанаву, аўтар піша:

"Пакуль ты карміў
гановерскіх птушак
тут паміраля паэзія.
Збірала поўныя залы
інтэрв'ю ў лепшых газетах
а потым клалася і паміраля
проста так ,— ад шчасця —
ці ад агіды
Алесь, няма як перадаць гэты ліст туды, дзе ты сёння. На мяжу сну і явы да гановерскіх птушак,
на самы скрай свету бо мы цені чужых сноў, Алесю, несмяротныя цені разам з Эўрыдыкай заблукалі сярод жывых спяваем, плачам, дакранаемся да аблокаў бо смерць немагчыма там, дзе не было нараджэння каму за гэта дзячыць — Платону, Ісусу, Лао Дзы я не ведаю."

Што можа сказаць чытач ці нават крытык пасля такіх слоў?.. *Я* — таксама — *не ведаю*. Паэзія не дае адказаў. Яна намагаецца перашкодзіць чалавечай смерці, спрабуючы ўвечніць ягоны дух...

Запомнілася і гэтая эпіфанія Бабкова: *"Літаратары дзеляцца на тых, хто пакідае сведчанні, і тых, хто будуе лабірынты, нібы спадзеючыся ў іх застацца, ці хаця б затрымаць выпадковых наведвальнікаў. Ёсць тыя, хто спакушае, і тыя, хто спакушаны. (...) Яшчэ ёсць тыя (іх заўсёды абсалютная меншыня), хто піша, проста, каб зразумець сваё жыццё. Іх чамусьці шкада найбольш."*

Цікава, да якіх літаратараў Бабкоў адносіць сябе? Няўжо ў колішніх "крынічных" словах Ю. Барысевіча была свая сярмяжная праўда: *"Ягоныя вершы з занадта грувасткім сінтаксісам не маюць голасу. Іх можна чытаць вачыма, але немагчыма дэкламаваць. Ігар любіць Борхеса — дык нагадаю ягоныя словы з эсэ "Кніга"*: "Літаратура павінна прыносіць радасць. Калі мы чытаем штосьці з цяжкасцю — значыцца, аўтар пацярпеў няўдачу." Але ж і на тыя легкаважныя словы Барысевіча сённяшні Бабкоў адказвае з не меншай цяжкасцю: *"У тым, каб прапасці, не застацца, ёсць свая асалода. Шчасце не быць."* (Дзеля параўнання напомню не так даўнюю кніжку прозы Б. Пятровіча "Шчасце быць".)

Што ж, мне нічога не застаецца, як працытаваць наастатку яшчэ адзін верш паэта:

"Вызваляючы месца таму,
што не мае імя
Забываючы шэпты восені,
цені платану
Захлынаючыся далёкім-далёкім
ветрам
Я трымаю ў пустых далонях
сны акіяну
Падымаючы веі сляпому
соннаму Богу
Аплятаючы хмелем горад,
даўно нямілы
Я вяртаюся ў нівеч
сініх сівых пагоркаў
Над якімі плывуць
нябёсаў белыя крылы"

Каб, павярнуўшыся з Усходу на Захад, разам з аўтарам прытоена вымавіць наўслед заўтрашняму дню:

"ТАМ ТАМ
краіна еўропа
дзіўныя кветкі твае
на падваконні"

Няўжо ўсё гэта не жыццё, а ўсяго толькі — воблакі, кветкі, матылькі, сон?..

ЛеГАЛ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3187
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 15.07.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 3732

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 09026